Газета творчай інтэлігенцыі Беларусі

ЛіМ

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ISSN 0024-4686

№ 17 (4460) 25 красавіка 2008 г.

У нумары:

«Хай пачуе нас Бог...»
Перадвелікодны вернісаж Сяргея Давідовіча-Зосіна.

Стар. 2

«Беларусь для нас — як родная»
Літаратурныя стасункі з Таджыкістанам будуць аднаўляцца.

Стар. 4

АЭС колеру белай паганкі
Мастак і паэт Генадзь Говар верыць: не знікне Палессе.

Стар. 7

Што з таго, калі цар у фраку?
Оперная прэм'ера... без тэатральнага антуражу, дэкарацый, дарагіх касцюмаў.

Стар. 11

«Вожык» у «ЛіМе»
13-я паласа «ЛіМа» і часопіс «Вожык»: поўнае паразуменне.

Стар. 13

ІДЗЕ ПАДПІСКА НА І ПАЎГОДДЗЕ 2008 г.

ПАДПІСАЦЦА НА ШТОТЫДНЁВІК «ЛіМ» МОЖНА З ЛЮБОГА МЕСЯЦА

Для індывідуальных падпісчыкаў:
1 месяц — 6400 руб.
Падпісны індэкс — 63856

Ведамасная падпіска:
1 месяц — 8300 руб.
Падпісны індэкс — 638562

Індывідуальная льготная падпіска для настаўнікаў: першае паўгоддзе, на 1 месяц — 4400 руб. Падпісны індэкс — 63815

Льготная падпіска: 1 месяц — 6500 руб.
Падпісны індэкс — 63880

Каб год для вас быў неблагім — падпішыцеся на «ЛіМ»!

Напярэдадні Вялікадня

У Палацы мастацтва сталіцы прайшла VI духоўна-асветніцкая выстава "Вербны кірмаш". На экспазіцыю, падрыхтаваную Беларускай праваслаўнай царквой і выставачным прадпрыемствам „Экспафорум" пры ўдзеле міністэрстваў інфармацыі і адукацыі, завітала болей як 80 удзельнікаў з Беларусі, Грэцыі, Ізраіля, Расіі ды Украіны.

Адкрыццё выставы пачалося з таго, што вядучыя задалі аўдыторыі быццам рытарычныя пытанні пра сэнс жыцця ды правілы бытавання верніка ў сучасным свеце... І запрасілі ўсіх, хто шукае адказ, зайсці на "Вербны кірмаш", дзе ёсць цудоўная магчымасць пазнаёміцца з аднадумцамі, задаць пытанне святару і набыць царкоўную літаратуру.

Настаяцель Мінскага кафедральнага сабора ў гонар Святога Духа протаіерэй Генадзь Дзічкоўскі перадаў бласлаўленне мітрапаліта Мінскага і Слуцкага Філарэта, патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі і адзначыў, што выстава нясе карысць маральнаму і духоўнаму аздараўленню грамадства. "Спяшайцеся рабіць добрыя справы!" — закончыў ён свой выступ. Гэтыя словы пасуюць да асноўных задач кірмашу — адраджэнне праваслаўнай культуры Беларусі, знаёмства з духоўнымі традыцыямі беларусаў, дапамога ў аднаўленні рэлігійных пабудоў.

Рэктар Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі, доктар медыцынскіх навук Генадзь Хулуп распавёў аб мерапрыемствах у мэтах духоўнага ўзбагачэння, што ладкуюцца па дамоўленасці Міністэрства аховы здароўя з Беларускай праваслаўнай царквой. Навучэнцы акадэміі наведваюць храмы, Мінскі дом міласэрнасці, рыхтуюць выставы, удзельнічаюць у арганізацыі Свята-Панцелеймонаўскіх чытанняў. Па словах рэктара, у краіне працуе 45 тысяч урачоў і важна, каб яны маглі дапамагчы сваім пацыентам не толькі цялесна, але і духоўна.

Пра мерапрыемствы "Вербнага кірмашу" расказаў старшыня аргкамітэта духоўна-асветніцкіх кірмашоў "Беларусь Праваслаўная" Аляксандр Савін. А праграма і сапраўды выйшла насычаная. Гутаркі са святарамі, лекторыі, прагляды кінафільмаў, штодзённыя музычныя канцэрты. Вернікам, якія ўжо маюць сям'ю, карысна было наведаць семінар "Праца з сем'ёй — важнейшы клопат царквы і дзяржавы", а таксама "круглы стол" па пытаннях духоўнага выхавання ў сям'і, прыйсці на сустрэчу з пісьменнікам Барысам Ганагам і Літаратурным аб'яднаннем "Духоўнае слова".

Традыцыйна ў праграму духоўна-асветніцкай выставы ўвайшлі Дзень паломніка і Дзень сацыяльнага служэння. Упершыню адбыўся Дзень здароўя, падчас якога можна было даведацца пра духоўныя традыцыі айчыннай медыцыны, маральныя аспекты лекарскай прафесіі і прычыны многіх хвароб сённяшняга грамадства. Цікавым стаўся і Дзень Сербіі, прысвечаны гісторыі краіны і сённяшнім падзеям у Косава. Акрамя таго, кожны меў магчымасць паспрабаваць сябе ў званарным і дэкаратыўна-прыкладным мастацтве падчас спецыяльных майстар-класаў.

І канечне, якое свята без падарункаў і адмысловых страў? Выбар традыцыйных велікодных сувеніраў быў надзвычай вялікім.

Ганна КОТ

Фота Кастуся Дробава

Залаты мост сяброўства

Прайшло першае Міжнароднае свята хароў хлопчыкаў "Таласы сяброў". Удзельнікамі былі 11 калектываў (каля 400 юных спевакоў), якія прадстаўлялі Беларусь, Літву, Нарвегію. З высакароднай мэтай прапаганды жывога музычнага мастацтва, сцвярджэння ідэалаў творчасці, міру і сяброўства арганізавалі унікальнае свята Беларускі саюз музычных дзеячаў, Асацыяцыя кіраўнікоў хароў хлопчыкаў і юнакоў БСМД, Белдзяржфілармонія, Рэспубліканскі каледж пры Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, БРСМ.

Гучанне хору хлапечых галасоў — то ўзнёслых, то лірычна-пранікнёных, то гарэзлівых — захапляе, расчульвае, паляпшае настрой і самаадчуванне. Нездарма юных спевакоў шчыра прымалі падчас творчых сустрэч і канцэртаў, што прайшлі ў школах-інтэрнатах для хворых дзетак у Маладзечне, у Івянецкім дзіцячым доме, у псіха-неўралагічным дыспансеры ў Навінках, у пасёлку Вішнёўка для дзяцей перасяленцаў. Такія акцыі правялі ў межах марафона міласэрнасці "Ад сэрца да сэрца" рэспубліканскага фестывалю хрысціянскай культуры "Благавест" (папячыцель Свята-Елісавецінскі жаночы манастыр Мінскай епархіі) і ў межах праграмы "Чарнобыльскі шлях — дарога жыцця" ўдзельнікі свята. Гэта маладзечанскі хор "Пеўнікі" (кіраўнік В. Бялько), узорны хор хлопчыкаў Дзіцячай школы мастацтваў г. Светлагорска (Г. Ур'еўская-Еўсюкова), сталічныя калектывы — узорны хор "Салоўка" СШ № 133 (А. Кунцэвіч) і хор "Вясёлы вецер" ДМШ № 9 (Г. Гардзіенка).

У сталічнай філармоніі адбыўся канцэрт з удзелам трох лідэраў свята. Яго адкрыла ўладальніца многіх міжнародных узнагарод і ганаровага звання "культурны пасол Рэспублікі Беларусь у Еўрасаюзе" Капэла хлопчыкаў Рэспубліканскага каледжа пры БДАМ, якой кіруе Уладзімір Глушакоў. Нашы літоўскія суседзі, хор "Dagilelis" пад кіраўніцтвам Рэмігіюса Адамайціса, паказалі не толькі высокі клас харавога музіцыравання, але і прыклад самапавагі ў мастацтве — трапяткога стаўлення да сваёй нацыянальнай музыкі, чаго часам бракуе нам. Незабыўным сталася знаёмства з нарвежскімі гасцямі — Нідарос кафедральным хорам хлопчыкаў пад кіраўніцтвам Б'ёрда Мое. Прыехалі яны з горада Трондхайма, гістарычная адметнасць якога — кафедральны сабор Nidoros Domen (XII ст.). Хор, які працягвае 900-гадовыя традыцыі мужчынскіх царкоўных спеваў, — сярод лепшых у свеце. Яго патрон — прынцэса Марта Луіза.

Гала-канцэрт удзельнікаў свята прайшоў у Рэспубліканскім каледжы пры БДАМ, а праграма ўрачыстага закрыцця — у сталічным Касцёле св. Сымона і св. Алены.

"Народ згаладаўся па сапраўднай культуры. Людзі стаміліся ад той "прадукцыі", якой засмечаны эфір. Яны хочуць нармальнай жывой музыкі, — адзначыў старшыня Беларускага саюза музычных дзеячаў прафесар Міхась Дрынеўскі. — Пажадаю, каб наша свята "Таласы сяброў" выраслa ў міжнародны фестываль, а мажліва, і ў конкурс. Нішто так не злучае, як мастацтва, тым больш — харавое. Яно — як залаты мост сяброўства між людзьмі: тымі, хто спявае, і тымі, хто слухае".

Святлана БЕРАСЦЕНЬ

На здымку: Капэла хлопчыкаў (Беларусь).

Фота Кастуся Дробава

Дыялог Беларусь — Польшча

Што аб'ядноўвае сучасную беларускую і польскую драматургію? Відаць, гэта пытанне турбавала творчых людзей як з адной, так і з другой краіны, у кожным разе знаходзячы свой адказ. Укладальнікі зборніка "Сучасная польская і беларуская драматургія", арт-прэзентацыя якога адбылася ў Рэспубліканскім тэатры беларускай драматургіі, падсумавалі досвед дзвюх краін.

Зборнік стаў вынікам супрацоўніцтва Цэнтра беларускай драматургіі і рэжысуры і Польскага Інстытута ў Мінску. Сучасная драматургія павінна заняць месца ў тэатрах, а маладыя творцы атрымаць магчымасць заявіць пра сябе ў поўны голас. Без гэтага тэатр губляе свой амаль самы важны элемент — актуальнасць і сувязь з жыццём. Такая думка прагучала падчас прэзентацыі выдання.

Арт-імпрэза прайшла ў даволі арыгінальнай форме. Спачатку адбыўся мініагляд становішча айчыннай і польскай драматургіі, прагучалі імёны маладых аўтараў, ужо добра вядомых не толькі на радзіме: Вольгі Гапеевай, Дыяны Балыкі, Івоны Кусяк... А потым пачалася, так бы мовіць, практычная частка: дэбют п'ес Міхала Вальчака, Мікалая Рудкоўскага, Кшыштафа Бізё.

Выданне кнігі стала першым вопытам міжнароднага праекта Цэнтра беларускай драматургіі і рэжысуры. Ажыццявіць задуму дапамог Польскі Інстытут у Мінску, вядомы сваімі некамерцыйнымі праектамі ў самых розных галінах грамадскага жыцця. На сённяшні дзень Інстытут разнастайна прадстаўляе польскую культуру, навуку і мастацтва не толькі ў сталіцы, але таксама ў абласных гарадах і раённых цэнтрах.

Што тычыцца Цэнтра беларускай драматургіі і рэжысуры, то ён быў створаны на базе Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі ў сакавіку 2007 года. Галоўнай мэтай яго арганізатары лічаць "пошук і падтрымку маладых драматургаў і рэжысёраў, збіранне і распаўсюджванне лепшых узораў беларускай сучаснай драматургіі, іх шырокая прапаганда разнастайнымі формамі сцэнічнага мастацтва". Як распавяла кіраўнік Цэнтра беларускай драматургіі і рэжысуры Крысціна Смольская, ва ўстанове праходзяць чытанні новых беларускіх і замежных п'ес, драматургічныя on-line праекты, паказ эксперыментальных рэжысёрскіх прац, відэапрагляд спектакляў, "круглыя сталы" з удзелам крытыкаў, журналістаў, драматургаў, рэжысёраў. Маладыя творцы падчас працы ў Цэнтры маюць магчымасць ствараць сумесныя праекты і прадстаўляць іх грамадству.

"Мы плануем ажыццявіць такі ж праект з Інстытутам імя Гётэ", — дадае Крысціна Смольская. А гэта значыць, што неўзабаве пра беларускую драматургію пачуюць і ў Германіі.

Ганна КОТ

Шчырасць супрацоўніцтва

Як ужо вядома чытачам "ЛіМа", нядаўна Буда-Кашалёўскай ЦБС — пераможцы конкурсу "Сусвет слова: ад газеты да энцыклапедыі" сярод цэнтралізаваных бібліятэчных сістэм Беларусі на лепшую арганізацыю падпіскі на штотыднёвік "Літаратура і мастацтва" ў першым квартале бягучага года — быў перададзены камплект кніг. І вось днямі прадстаўнікі РВУ "Літаратура і Мастацтва" наведаліся, вядома ж, з наборамі кніг, у Старадарожскую і Кіраўскую ЦБС, якія занялі, адпаведна, другое і трэцяе месцы.

Перад супрацоўнікамі Старадарожскай бібліятэкі — яе ўзначальвае Ніна Сцяшко — выступіў галоўны рэдактар штотыднёвіка "ЛіМ" Анатоль Казлоў. Па-першае, ён падзякаваў калектыву за падтрымку газеты, бо бібліятэкар — гэта сябра, калега і першы памочнік ачольваемага ім выдання. Па-другое, запрасіў да больш цеснага супрацоўніцтва. Таксама Анатоль Сяргеевіч расказаў прысутным пра мінулагодні юбілей, аддзелы, рубрыкі і аўтараў тыднёвіка, пра сустрэчы з чытачамі, якія адбыліся ва ўсіх абласных цэнтрах Беларусі, зазначыўшы, што з тыднёвікам "Літаратура і мастацтва" супрацоўнічалі славутыя творцы, класікі роднай літаратуры. За гады свайго існавання "ЛіМ" выправіў у літаратуру шмат каго з пісьменнікаў, даўно прызнаных майстроў прыгожага пісьменства не толькі ў нашай краіне, але і далёка за яе межамі.

Загадчык аддзела маркетынгу і рэкламнай дзейнасці РВУ "Літаратура і Мастацтва" Аляксандр Акімаў распавёў пра іншыя выданні ўстановы — часопісы "Полымя", "Маладосць", "Нёман" і "Всемирная литература". Аляксандр Мікалаевіч зрабіў акцэнт на значным напрамку дзейнасці РВУ — кнігавыдавецкай справе, азнаёміў прысутных з кнігамі, якія пабачылі ўжо свет, рыхтуюцца ды запланаваныя да друку ва ўстанове "Літаратура і Мастацтва", зазначыўшы, што акцэнт у выдавецкай дзейнасці ўстановы робіцца на сацыяльна значнай айчыннай літаратуры...

Падобная гаворка вялася і ў Кіраўску. Потым дырэктар Кіраўскай ЦБС Валянціна Петрамовіч правяла экскурсію па раённай бібліятэцы, расказала пра калектыў, пра аддзелы і кірункі дзейнасці ўстановы, азнаёміла гасцей з выданнямі краязнаўчых ды гістарычных альбомаў, буклетамі твораў мясцовых літаратараў, якія супрацоўнікі робяць сваімі намаганнямі.

У сваю чаргу начальнік аддзела культуры Кіраўскага райвыканкама Тамара Галубоўская азнаёміла з дзейнасцю Дома культуры. Тамара Леанідаўна апантана, з захапленнем распавяла пра карціны мясцовых мастакоў, работы з саломкі ды льну тутэйшых творцаў, стэнды, прысвечаныя 70-годдзю раёна, яго гісторыі і знакамітым асобам. Адзін з самабытных куточкаў установы з адмысловымі вырабамі ўпрыгожвалі пранікнёныя словы С. Дзяргая: "Каб соль не страціла ўласцівую ёй солкасць, а песня — гукаў трапятных і кволых, вясёлка — колераў, каханне — шчырасці, а чалавек — душы сваёй вялікай, несмяротнай — на свеце існуе мастацтва".

Тамара Галубоўская таксама расказала пра гурткі мастацкай самадзейнасці і аматарскія аб'яднанні раённага Дома культуры: дзіцячыя ўзорны танцавальны калектыў "Паскакушкі" і вакальны гурток "Равеснік", тэатральны гурток "Маска", гурток сольных спеваў "Самацветы", вакальны ансамбль народнай песні "Сузор'е", фальклорную групу "Весялуха", клуб пажылога чалавека "Бадзёрасць", літаратурная і музычная гасцёўні і шмат што іншае. А пры канцы сустрэчы абодва бакі таксама дамовіліся супрацоўнічаць больш цесна і плённа.

Віктар КАВАЛЁЎ

На здымках: падчас уручэння кніг Старадарожскай і Кіраўскай ЦБС.

Фота аўтара

Ну, зусім дзіцячая літаратура!..

...Якой усяго толькі 300 гадоў. У той час, як узрост дарослых тэкстаў — звыш трох тысячагоддзяў...

З такога паведамлення распачала свой агляд дзіцячай шведскай літаратуры пісьменніца, доктар філалагічных навук, крытык Ула Лундквіст. Яна наведала Беларусь, разам з Карэн Нюман — дачкой адной з самых вядомых у свеце і любімай многімі пакаленнямі дзяцей пісьменніцы-казачніцы Астрыд Ліндгрэн. У фармаце фестывалю дзіцячага шведскага кіно адбыўся і шэраг цікавейшых літаратурных сустрэч. Адна з іх пры падтрымцы аддзялення Пасольства Швецыі ў Мінску і Шведскага Інстытута адбылася ў Цэнтральнай гарадской дзіцячай бібліятэцы імя М. Астроўскага, дзе сабраліся прадстаўнікі 36 бібліятэк краіны.

Імя шведскай пісьменніцы добра вядома беларускаму маленькаму чытачу. І не толькі па расійскіх, але і па нашых, айчынных перакладах. Пры канцы мінулага года "ЛіМ" распавёў пра кнігу "Малы і Карлсан-з-даху", а ў сёлетні прыезд шведскіх гасцей прэзентавалася беларускае выданне адной з найцікавейшых і самых мудрагелістых гісторый самай яркай рудавалосай гераіні — "Піпі Доўгаяпанчоха". Пераклад зрабіў Дзмітрый Плакс, рэдагаваў яго Юрась Бушлякоў, а выйшла ў свет кніга ў выдавецтве Зміцера Коласа. Пераклад гэты на беларускую — 64-ы па ліку з замежных перакладаў, агулам жа Ліндгрэн паўплывала на розумы дзяцей 92 краін — там, дзе зачытваліся яе творамі.

Што папярэднічала з'яўленню такой яскравай літаратурнай зоркі? Даследчыца творчасці Астрыд Ліндгрэн Ула Лундквіст — жанчына, упрыгожаная шматлікімі рысачкамі-зморшчынкамі на прыязным зычлівым твары, якая ў іншай аўдыторыі таксама магла б сысці за казачніцу, надзвычай проста прадставіла этапы развіцця літаратуры для дзяцей, згадаўшы некалькі **залатых перыядаў** яе развіцця ў Швецыі.

Шведская кніга — дагэтуль багата ілюстраваная. Госці з замежжа паказалі асобнічак: ніякага тэксту, толькі малюнкі. Але паводле іх можна скласці пэўнае ўяўленне пра тое, як выхоўваюцца для чалавека адзенне. Пэўна, кніга такая — для тых, хто не ведае яшчэ літар.

Асэнсаванне ролі кнігі, літаратуры ў жыцці маленькага чалавечка дапамагла заснаваць ***Літаратурную прэмію памяці Астрыд Ліндгрэн — другую па значнасці пасля прэміі Нобелеўскай***. Вось ужо сёмы год запар ёю ганаруюць лепшых пісьменнікаў, ілюстратараў, вусных расказчыкаў, арганізацыю і прыватных асоб, якія ствараюць, прапагандуюць і распаўсюджваюць дзіцячую літаратуру. Зараз па ўсім свеце, а менавіта — у 155 краінах працуюць 200 прадстаўнікоў, якія шукаюць намінантаў на гэтую прэстыжную ўзнагароду, усталёўваючы сувязі з рознымі творчымі арганізацыямі. У Беларусі такія стасункі наладжаны з двума прадстаўніцтвамі. Каб уявіць узровень патрабаванняў, якія прад'яўляюць дзіцячым пісьменнікам журы, згадаем некалькі лаўрэатаў. У 2003 годзе прэміяй была ганараваная аўстрыйка Крысцін Нёстлінгер — неардынарны педагог-выхавальнік, шматгранная пісьменніцкая дзейнасць якой "вылучаецца беспардонным гумарам, чыстай праўдай і ціхім цяплом. Без сумневу, пісьменніца прымае бок дзяцей і тых, хто не ўпісваецца ў стандарты грамадства". У 2006 годзе лепшай з лепшых была названая Кэтрын Патэрсан (ЗША), якая "мае непаўторны талент псіхолага, які яна дэманструе ў сваіх персанажах — няшчасных маладых асобах, якіх яна можа змясціць у гістарычныя, экзатычныя абставіны або ў суровую амерыканскую рэальнасць...Яна развівае ў сваіх героях унутраную моц і жыццёвую смеласць". Але галоўнае патрабаванне: кандыдаты павінны працаваць у межах гуманітарнага разумення твораў для дзяцей...

Ірына ТУЛУПАВА

На здымку: Карэн Нюман — дачка Астрыд Ліндгрэн.

Фота Кастуся Дробава

На перадвелікодным вернісажы Сяргея Давідовіча-Зосіна гучала інструментальная музыка Іагана Себасцьяна Баха і праваслаўныя песняспевы, прыгадваліся радкі яго вершаванай "Малітвы", у якой паэт заклікае да пакаяння і любові, просіць мужнасці ва Усявышняга, паратунку для збалелых душ і нагадвае, што "дарога да храма — дарога з дарог"...

«Хай пачуе нас Бог...»

Гэтая выстаўка, разгорнутая ў мастацкай галерэі Беларускага дзяржаўнага універсітэта фізічнай культуры і названая "З верай па жыцці", прадставіла работы, у якіх выразна прасочваюцца два тэматычныя напрамкі творчасці С. Давідовіча-Зосіна. Першы — боль чарнобыльскай трагедыі, якая зрабілася праяваю зла і сімвалам няшчасця. Другі — вера ў Бога і заклік да паратунку праз вечнае духоўнае святло, дабрыню і надзею.

Імкненне абагульніць свой светапогляд і душэўную неабыякавасць у маштабных жывапісных выявах; экспрэсіўнасць, гіпербалізацыя, гратэскавасць, уласцівыя манеры С. Давідовіча-Зосіна, — вось што вымушае прыпыніць крок перад яго палотнамі. У іх — змрок і водгалас ядзернай катастрофы ("Пампеі XX стагоддзя", "Мірны атам", "Перажыла ўнука", "Зона", "Люстэрка лёсу", "Святло Чарнобыля"); у іх — зварот да вобраза Збаўцы, дума пра чалавечыя грахі, пра Хрыстоў подзвіг і ахвярнасць ("Мір нашаму дому", "Выратуй, Божа!", "Грахі нашы цяжкія", "Здыманне з крыжа", трыпціх "І кожны звернецца да Бога").

З добрым словам пра мастака і літаратара Сяргея Давідовіча-Зосіна падчас адкрыцця выстаўкі выступілі першы намеснік міністра інфармацыі краіны Лілія Ананіч, першы сакратар Саюза пісьменнікаў Беларусі Віктар Праўдзін, а таксама Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі Філарэт.

Юля ЛЕБЕДЗЕВА

На здымку: уладыка Філарэт і С. Давідовіч-Зосін у выставачнай зале.

Фота Кастуся Дробава

У другі раз завітала на чачэрскую зямлю доўгачаканае свята музыкі "Чачэрскія сустрэчы". А пра тое, што яго і сапраўды тут чакалі, найлепшым чынам сведчылі зацікаўленыя міжсабойныя размовы мясцовых жыхароў. Перад і паміж рознымі мерапрыемствамі, на якія быў багаты гэты дзень, можна было чуць, як яны абмяркоўвалі канцэртныя праграмы і шчыра радаваліся прыезду знакамітых артыстаў.

«Чачэрскія сустрэчы»: новыя акцэнты

Калі ў мінулым годзе ладзілася першае свята музыкі, кіраўнік Нацыянальнага канцэртнага аркестра Беларусі маэстра Міхаіл Фінберг выступіў з ініцыятывай: людзі ў пацярпелым ад наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС раёне як ніхто іншы маюць патрэбу ў шчырай і адкрытай размове з прадстаўнікамі ўлады. Так нарадзіўся праект асамблеі "Дыялог парламентарыяў Беларусі з актывам Чачэрскага раёна". Сёлета на такі нефармальны дыялог сабраліся члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу нашай краіны, дэпутаты, кіраўнікі грамадскіх аб'яднанняў, прадстаўнікі працоўных калектываў, прадпрыемстваў, арганізацый, журналісты рэспубліканскіх, абласных, раённых СМІ...

Адкрываючы, так бы мовіць, ужо традыцыйную асамблею, старшыня Гомельскага аблвыканкама Аляксандр Якабсон падзякаваў натхняльніку і арганізатару гэтых сустрэч Міхаілу Фінбергу і адразу прапанаваў прысутным зрабіць стасункі сяброўскімі, без фармалізму. Аляксандр Серафімавіч адзначыў, што Гомельская вобласць за першыя месяцы бягучага года дэманструе неблагія эканамічныя паказчыкі. А калі будзе моцнай эканоміка, тады з'явіцца і больш магчымасцей спрычыніцца да таго мастацтва, якое дораць нам айчынныя майстры. А. Якабсон падкрэсліў: *"Мы сабраліся, каб паразмаўляць на розныя тэмы, але вызначым галоўны кірунак — духоўныя каштоўнасці. У Гомельскай вобласці сёння шмат робіцца для развіцця матэрыяльна-тэхнічнай базы культуры. Гэта адзін з нашых прыярытэтаў. Выдаткоўваем вялікія сродкі на галіну культуры: будуем шмат важных аб'ектаў як у абласным цэнтры, так і ў райцэнтрах, аграгарадках... Мы штогод здаём аб'екты культуры. Адкрыліся новыя музеі, адрэстаўравалі ў Гомелі палацава-паркавы ансамбль Румянцавых-Паскевічаў, у абласной бібліятэцы адкрылі музей рэдкай кнігі, у Хойніцкім раёне запрацаваў музей, прысвечаны праблемам Чарнобыля, аднаўляем музей Івана Мележа ў вёсцы Глінішчы (таксама Хойніцкага раёна). На базе гомельскага Палаца чыгуначнікаў будуем вялікую сучасную філарманічную залу. У многіх раённых цэнтрах будуць рэстаўравацца, рэканструявацца і будавацца клубы, палацы культуры. Не забываемся мы і на іншыя, у тым ліку сацыяльную, адукацыйную і сферу аховы здароўя. Працуем па праграме адраджэння вёскі. Галоўнае, каб наш народ жыў больш якасна"*.

Прафесар Міхаіл Фінберг вызначыў асноўны кірунак дзейнасці творчага калектыву — работа з малымі гарадамі. "Чачэрскія сустрэчы" па ліку — 77 фестываль, які арганізаваў Нацыянальны канцэртны аркестр Беларусі. Так, традыцыйнымі сталі фэсты старадаўняй музыкі ў гістарычных гарадах Беларусі — Нясвіжы, Тураве, Мсціславе, Міры, Маладзечне, Заслаўі, Стоўбцах, Навагрудку. Яны зрабіліся цэнтрам прыцягнення, месцам жаданых сустрэч людзей неабыякавых да лёсу айчыннай культуры, яны абуджаюць цікавасць грамадства да сваіх гістарычных каранёў. Гэтыя мерапрыемствы выхавалі новага слухача, азнанага ў гісторыі не толькі свайго раёна, але і ўсёй краіны. Музычным калектывам падрыхтаваныя аўтарскія праграмы паводле твораў айчынных паэтаў: М. Багдановіча, У.Караткевіча, А. Куляшова, Янкі Купалы, Якуба Коласа, А. Міцкевіча... — усяго 26 асоб. Да таго ж, ідэя фестываляў Міхаіла Фінберга спрычынілася да дзяржаўнай праграмы адраджэння малых гарадоў Беларусі...

Віктар Жыгар, член Пастаяннай камісіі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі, дырэктар ААТ "Электраапаратура", распавёў прысутным пра заканадаўчую галіну. Тут не абышлося без пытанняў, прыкладам, начальніка ўпраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Чачэрскага райвыканкама Надзеі Чвыровай. Сэнс у тым, што Дэкрэт нумар 18 датычыць праблем сацыяльнага сіроцтва. Між іншым, паўстае другая праблема — сацыяльнае сіроцтва пажылых людзей, большасць з якіх мае дзяцей. Было б няблага прыняць новы дэкрэт пра маральную і матэрыяльную адказнасць дзяцей перад сваімі бацькамі. Але ж якія маці ці бацька звернуцца па гэтай справе ў суд? Першаснова — маральнасць, выхаванасць і павага да родзічаў саміх дзяцей.

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі па дэмаграфічнай бяспецы і сацыяльным развіцці, галоўны ўрач Гомельскага абласнога клінічнага анкалагічнага дыспансера Таццяна Прыгожая акрэсліла дэмаграфічную сітуацыю ў нашай краіне. Бо гэта праблема не толькі для Беларусі, але і для высока забяспечаных краін Заходняй Еўропы. Цяпер палітыка нашай дзяржавы скіравана на павышэнне нараджальнасці: прыняты розныя заканадаўчыя акты, законы і папраўкі, адкрываюцца новыя медыцынскія ўстановы, створаны Рэспубліканскі цэнтр "Маці і дзіця", апошнія пяць гадоў ідзе значнае пераабсталяванне арганізацый аховы здароўя. Адной з задач дэмаграфічнай бяспекі з'яўляецца зніжэнне ўзроўню смяротнасці. Таццяна Іванаўна асобна спынілася на пытанні дзіцячай анкалогіі, адзначыўшы, што ў гэтым кірунку сітуацыя нармалізавалася: стала як да аварыі на Чарнобыльскай АЭС.

У сваіх выступленнях Уладзімір Кужанаў, член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па праблемах чарнобыльскай катастрофы, экалогіі і прыродакарыстання, засяродзіў увагу на ўзаемадзеянні ды ўзаемапаразуменні галін улады і на працэдуры прыняцця законаў ў нашай краіне, а Уладзімір Мальцаў, член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні, дырэктар ААТ "Светлагорскі домабудаўнічы камбінат", акрэсліў праблемы будаўнічай галіны і адзначыў значнасць развіцця сярэдніх і малых гарадоў.

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі па адукацыі, культуры, навуцы і навукова-тэхнічным прагрэсе, старшыня савета спецыяльнага фонду Прэзідэнта нашай краіны па падтрымцы таленавітай моладзі Наталля Аўдзеева падзякавала кіраўніцтву і працаўнікам Гомельшчыны за вялікую выніковую работу ў сферы культуры і мастацтва.

Наталля Пятроўна закранула тэму работы з таленавітай моладдзю, якой трэба дапамагаць дасягнуць званняў лаўрэатаў спецыяльных прэмій.

Лаўрэаты, дыпламанты і стыпендыяты і г.д. уключаны ў спецыяльныя электронныя банкі дадзеных таленавітай моладзі (у міністэрствах культуры і адукацыі, саветах фондаў). Яны — наша нацыянальная эліта.

Таксама Наталля Аўдзеева адказала на актуальнае пытанне змяненняў у правілах прыёму і паступлення ў вышэйшыя і сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы. Тут будуць улічвацца вынікі, якія ўказаныя ў сертыфікатах цэнтралізаванага тэсціравання (яно будзе платным), сярэдні бал атэстата, а па некаторых спецыяльнасцях — вынікі псіхолага-педагагічных субяседаванняў. Палепшыліся ўмовы паступлення абітурыентаў з сельскай мясцовасці і асаблівасці пераходу з платнай формы навучання на бясплатнае...

Вось у такім паўфармальным дыялогу былі вызначаныя некаторыя пытанні сацыяльна-эканамічнага і культурнага жыцця раёна, абмеркаваныя шляхі іх вырашэння. А напрыканцы асамблеі асобнай прайшла тэма падрыхтоўка да святкавання ў верасні наступнага года 850-годдзя з дня заснавання горада Чачэрска.

Віктар КАВАЛЁЎ
Фота аўтара

Насустрач суседзям

24-25 красавіка бягучага года ў Гомелі на базе рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра радыяцыйнай медыцыны і экалогіі чалавека адбываецца міжнародная канферэнцыя "Другія чарнобыльскія чытанні".

На ёй прадстаўлены даклады па арганізацыі індывідуальнай дазіметрыі, радыяцыйна-гігіенічным маніторынгу, рэабілітацыі забруджаных тэрыторый.

Браншчыну на ёй прадстаўляе кіраўніцтва дэпартамента аховы здароўя, спецыялісты Бранскага і Клінцаўскага дыягнастычных цэнтраў, а таксама ўрачы, якія працуюць у галіне радыяцыйнай медыцыны. У Бранск накіравана на разгляд пагадненне аб супрацоўніцтве ў галіне аховы здароўя, адзін з пунктаў якога прадугледжвае магчымасць лячэння і абследавання ў Гомелі людзей, якія пражываюць у чарнобыльскіх раёнах Браншчыны.

Тамара КРУЧЭНКА

Адкрыцці — побач

Красавіцкая імпрэза, якая ў некаторай ступені парушыла звычайныя ўяўленні аб дзейнасці Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, была прысвечана творчасці маладой фотамастачкі Наталлі Канавалавай.

Выстава яе лепшых работ, адкрытая ў музеі, носіць назву "Ад Класікі да Гламура, альбо Нараджэнне". Дзесяткі работ, прадстаўленых гледачу, раскладзены на тры тэматычныя раздзелы. Першы знаёміць з творчасцю таленавітага беларускага скульптара Мікалая Дробыша. Другі дэманструе майстэрства фотамастачкі ў валоданні сілуэтна-контуравай тэхнікай фатаграфавання. А трэці раздзел уключае партрэты, зробленыя ў розных стылях.

Віталі таленавітага маладога майстра дырэктар музея Сяргей Азаронак, загадчык кафедры графічнага дызайну і кіраўнік творчых майстэрняў Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў Вячаслаў Семянько, вядомы ў Беларусі мадэльер, арганізатар многіх праектаў, звязаных з развіццём айчыннай моды, Саша Варламаў. Выступоўцы былі адзінадушныя ў ацэнках зробленага Наталляй Канавалавай. Відавочна, што фотамастачка імкнецца ўбачыць у будзённым жыцці гармонію, якая дапамагае развівацца і чалавеку-адзінцы, і грамадству ўвогуле.

Выказваючы падзяку музею за прадастаўленую магчымасць пазнаёміць гледача са сваімі работамі, Наталля сказала добрыя і цёплыя словы пра пакаленне герояў, якое дало нам магчымасць тварыць, ісці наперад, радавацца жыццю, пра пакаленне, якому прысвечаны галоўныя экспазіцыі музея Вялікай Айчыннай вайны.

Юля ЛЕБЕДЗЕВА

Ягоны лёс — музей Якуба Коласа

Ці можа быць нешта больш прыемным за тое, калі шчыра, ад усяго сэрца калегі па працы віншуюць цябе з якой-небудзь знамянальнай датай? Ды пры тым, калі, не зважаючы на сталы ўзрост, ты знаходзішся ў актыўным рабочым страі. У адзін з традыцыйных "Літаратурных чацвяргоў" у Літаратурна-мемарыяльным музеі Якуба Коласа менавіта такі святочна-радасны настрой быў у Міколы Жыгоцкага, які аддаў гэтай установе — нават не верыцца! — ажно пяцьдзесят гадоў. Гэты настрой перадаўся і ўсім прысутным — паспрыяў аптымізм, бадзёрасць, жыццялюбства Міколы Рыгоравіча. Калі на экране мільгалі кадры, нават не верылася, што ўсё гэта старонкі з жыцця аднаго чалавека, які, як і ў гады маладосці, па-ранейшаму з'яўляецца сваім у Коласавым доме. Цяпер ён афіцыйна лічыцца загадчыкам гаспадарчай часткі, а на самай справе — адзін з самых дасведчаных супрацоўнікаў музея ва ўсім тым, што тычыцца жыцця і дзейнасці народнага песняра. Таму пры неабходнасці і экскурсію можа правесці — цікавую, захапляльную, з прыцягненнем малавядомых фактаў. Свайго роду экскурсіяй у свет Коласа з'яўляюцца і кнігі М. Жыгоцкага "Народны настаўнік Якуб Колас", "Сцежкамі паэта". "Сэрца пакідаю вам", "У цяжкі час вайны суровай", "Легендарны дзед Талаш" ды іншыя. А нядаўна ў яго выйшла яшчэ адна кніга — "Александр Лукашенко. Первый Президент Республики Беларусь", адрасаваная школьнікам.

Пра М. Жыгоцкага цёплыя, ухвальныя словы на вечарыне гаварылі дырэктар Літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа Зінаіда Камароўская, старшы навуковы супрацоўнік Святлана Субат, Людміла Чыгрынава, якая шмат гадоў працавала разам з ім, Алесь Рыбак, жонка Данілы Міцкевіча Ала Цімафееўна, брат юбіляра Віктар Рыгоравіч. Не засталіся ўбаку і маладыя супрацоўнікі музея — тыя, хто гэтаксама плённа прапагандуе творчасць народнага песняра, як і М. Жыгоцкі.

В. СЯРОДКА

Класікі па-еўрапейску

У выдавецтве Віктара Хурсіка ў Мінску нядаўна выйшла кніга "Класіка. Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч "Пінская шляхта" (аўтэнтык, беларуская, англійская, нямецкая, польская, руская мовы), Кастусь Вераніцын "Тарас на Парнасе" (беларуская, англійская, балгарская, іспанская, нямецкая, польская, руская, украінская мовы)". Укладаў кнігу вядомы навукоўца Язэп Янушкевіч. А вось пераклад на нямецкую мову паэмы, якая доўгі час не мела аўтара, зрабіў Уладзімір Папковіч. Наша гутарка з Уладзімірам Антонавічам пра перакладчыцкую дзейнасць.

— Уладзімір Антонавіч, калі вы зрабілі пераклад "Тараса на Парнасе"?

— Гэта быў 2004 год. Вядома, што да гэтага часу паэма друкавалася як твор невядомага аўтара. Адбываліся яго пошукі, выказваліся розныя меркаванні. Дзякуючы вялікім намаганням вядомага даследчыка гісторыі беларускай літаратуры Генадзя Кісялёва быў адшуканы найбольш верагодны аўтар паэмы. Кастусь Вераніцын (Васільеў, 1834 — 1904), які нарадзіўся на Гарадоччыне Віцебскай вобласці. Пасля адной з канферэнцый у Гарадку, прысвечанай Кастусю Вераніцыну і паэме "Тарас на Парнасе", прысутны там архівіст і даследчык беларускай літаратуры Язэп Янушкевіч прапанаваў мне перакласці паэму на нямецкую мову для сямімоўнага выдання.

Я шчыра здзіўвіўся. У мяне меўся вопыт перакладу на беларускую мову з нямецкай, але наадварот я нічога не рабіў. Хоць і выкладаю нямецкую мову амаль усё жыццё, адмовіўся. Але дома ўзяў у рукі кніжачку "Тарас на Парнасе", па якой чыталі "Тараса" яшчэ мае дзеці, пачаў перакладаць. І так захапіўся, што давёў працу да канца. А затым даслаў пераклад сябрам у Германію. Яны прачыталі і палічылі, што гэта цудоўны тэкст. Тады адаслаў пераклад Я. Янушкевічу. Ён паказаў яго славістцы з Цюрыха Моніцы Цюліг-Банькоўскай. Яна зрабіла некалькі заўваг і таксама ўхваліла. Так да канца 2004 года пераклад паэмы быў скончаны. І ўжо пазней надрукаваны ў часопісе Сакрата Яновіча "Год беларускі-2006". А зусім нядаўна я атрымаў ліст ад Язэпа Янушкевіча, у якім ён напісаў пра выданне паэмы на васьмі мовах, у тым ліку па-нямецку ў маім перакладзе.

— У Германіі твор не друкаваўся?

— Не. Мае знаёмыя немцы рабілі копіі. Чыталі самі і перадавалі сябрам. Але прапановы выдаць твор не паступала. Бо гэта не пісьменнікі і не навукоўцы. Пераклад, надрукаваны ў "Годзе беларускім-2006", вывешаны ў Інтэрнеце.

— Каго можа зацікавіць у Германіі нямецкі пераклад "Тараса на Парнасе": тых, хто цікавіцца беларускай культурай, ці шараговага чытача таксама?

— Цяжка сказаць. Ёсць беларусісты і ў Германіі. Але найбольш цікава гэта для нас саміх: нас мала ведаюць у Еўропе. Трэба сябе паказваць, наш розум і талент, а не грызціся паміж сабой.

— Вы вядомы найперш як перакладчык на беларускую мову "Трох таварышаў" Рэмарка, "Вільгельма Тэля" Шылера. Чаму раней не ўзнікла жадання перакласці з беларускай на нямецкую творы нашых класікаў?

— Жаданне магло быць. Але дзе выдаць перакладзенае? Да таго ж, нямецкая мова — не родная для мяне, а вывучаная ў дарослым ужо ўзросце. Каб перакладаць, трэба вельмі добра ведаць ментальнасць таго народа, на якую мову перакладаеш. Тое, што нам зразумела з аднаго слова, з паўслова, іншаземцу, бывае, трэба доўга тлумачыць. Як сведчаць самі немцы, яны ад канца вайны занятыя "пераадольваннем мінулага". На сумленні старэйшага пакалення так шмат ляжыць віны, што ўспаміны пра той час доўга не ўхваляліся, проста замоўчваліся. А наша, беларуская літаратура, за рэдкім выключэннем, напамінала пра вайну, пра ачмурэнне нацысцкай ідэалогіяй. З пасляваеннай літаратуры, каго ні вазьмі — гэта жах вайны, гэта смерць і гора, прынесеныя на нашу зямлю немцамі. Гэта ж не забываецца.

— З чаго ўвогуле пачыналася ваша перакладчыцкая дзейнасць?

— У 1981 годзе мяне прымалі ў Саюз пісьменнікаў, я на той час на 1.5 стаўкі працаваў выкладчыкам у тэхнікуме. Анатоль Вярцінскі спытаў: "А калі вы паспяваеце пісаць?" Ну калі? У нядзелю, падчас вялікага адпачынку. Таму я і мала напісаў. І тады Янка Брыль параіў мне звярнуцца да Мікалая Дубянецкага, тагачаснага дырэктара выдавецтва "Мастацкая літаратура". Маўляў, можа, ён прапануе мне зрабіць які-небудзь пераклад. І не трэба будзе цягнуць 1,5 стаўкі. Я так і зрабіў. Мікалай Фёдаравіч накіраваў мяне да Васіля Сёмухі, які працаваў у рэдакцыі перакладаў. І мне замовілі пераклад рамана Рут Крафт "Вострай без маяка", вялікі, на пяцьсот з гакам старонак. Потым перакладаў Брэхта, Веерта, Лесінга, паэзію нямецкіх рамантыкаў. А затым Э. М. Рэмарка, Ф. Шылера. Потым з Барысам Сачанкам (ён тады кіраваў рэдакцыяй перакладаў) мы планавалі выдаць у серыі "Паэзія народаў свету" вялікі том Генрыха Гейнэ. Не паспелі. Хаця у мяне ёсць шмат неапублікаваных перакладаў яго вершаў. І іншых аўтараў таксама.

— А ці шмат ёсць твораў сучасных нямецкіх аўтараў, пераклады якіх маглі б зацікавіць беларускага чытача?

— Тут адразу ўзнікае праблема з аўтарскімі правамі, якія трэба выкупіць для пачатку пераклада. А творы, безумоўна, ёсць. Калі я гаварыў пра "пераадольванне мінулага", то апошні час яно ідзе праз адлюстраванне праўды таго часу сродкамі літаратуры. Летась пазнаёміўся з нямецкім пісьменнікам Увэ Цімам. У 2003 годзе была выдадзена яго кніга "На прыкладзе майго брата" — публіцыстычны роздум пра фашызм. Брат аўтара, старэйшы за яго на шаснаццаць гадоў, ваяваў на фронце ў войсках СС. Пад Харкавам яму адарвала ногі і ён памёр. Пасля яго засталіся кароткія дзённікавыя запісы і лісты да бацькі. І брат гэтага эсэсаўца, сучасны немец, вельмі па-чалавечы разважае пра тое, што сталася з нямецкім народам падчас фашысцкага панавання. Вось гэтую кніжку я б з задавальненнем пераклаў на беларускую мову. Яна напісана вельмі шчыра. Ёсць і іншыя вартыя пераклады кнігі, каб толькі было каму іх выдаваць. Я працы не баюся, і веданне абедзвюх моў дазваляюць мне рабіць якасны пераклад.

Гутарыў Сяргей МАКАРЭВІЧ

Фота аўтара

«Беларусь для нас — як родная»

Сярод тых, хто сёлета ўпершыню наведаў Міжнародную Мінскую кніжную выставу-кірмаш — дэлегацыя Таджыкістана. "Вывучалі ваш вопыт, паказвалі свае кнігі і на будучы год прыедзем падрыхтаванымі зусім па-іншаму. Думаю, што гэта ў нашых сілах — прапагандаваць літаратуру адно аднога", — зазначыў карэспандэнту "ЛіМа" Ато Хамдам — таджыкскі пісьменнік і драматург. Ён піша гістарычныя раманы, аповесці, апавяданні. П'есы ставяцца на сцэнах лепшых тэатраў краіны. Працуе як перакладчык: пераклаў на таджыкскую мову п'есы А. Вампілава "Правінцыйныя анекдоты", Б. Равенскага і М. Анчарова "Драматычная песня", Д. Голсуорсі "Першыя і апошнія", інш. Ато Хамдам — дырэктар дзяржаўнага выдавецтва Таджыкістана "Agin", былы міністр культуры, былы дарадчык Прэзідэнта краіны па пытаннях культуры. Па даручэнні Прэзідэнта ўжо чацвёрты год узначальвае вядучае выдавецтва, якому ўжо 84 гады... А самому Ато Хамдаму сёлета споўніцца 60.

— Спадар Ато, вы — больш палітык ці пісьменнік?

— Я пісьменнік. Пісьменнік, які працуе.

— Калі працуеце ў вядучым выдавецтве па даручэнні Прэзідэнта, значыць, калісьці быў дадзены аддік развіццю дзяржаўнай сферы кнігавыдання і перыёдыкі, іх падтрымцы?

— Наш Прэзідэнт шмат увагі надае развіццю культуры, літаратуры. У 2003-м годзе, калі я быў яшчэ старшым саветнікам Прэзідэнта па культуры, нам удалося устанавіць традыцыю: кожны год напярэдадні Наўруза — нашага нацыянальнага свята Новага дня (дня вясенняга раўнадзенства. — **І.Т.**) — ладзіць сустрэчу Прэзідэнта з кіраўнікамі ўстаноў культуры, пісьменнікамі, мастакамі — словам, з творчай інтэлігенцыяй. Прэзідэнт пацікавіўся: чым ён можа быць карысным пісьменнікам? З вуснаў Прэзідэнта на першай жа такой сустрэчы прагучала: мала ў нас друкуецца літаратуры. І ён спытаўся ў пісьменнікаў: колькі трэба грошай, каб дапамагчы? Тады ўпершыню было выдаткавана 200 тысяч сомані для выдання кніг пісьменнікаў Таджыкістана. Летась было выдаткавана ўжо 750 тысяч сомані і за год мы выдалі шмат аўтараў: сучаснікаў і класікаў. У мінулым годзе ўпершыню па рашэнні Прэзідэнта прыступілі да выдання твораў нашых класікаў у серыі "Зоркі літаратуры". Выданне вялікім тыражом — па 5 000 экземпляраў — 50 тамоў гэтай серыі неабходна завяршыць да 2011 года. Мы паспелі ўжо выдаць 4 тамы. Першы — прысвечаны творчасці вялікага паэта, заснавальніка класічнай таджыкскай літаратуры Абу Абдалах Рудакі. Дарэчы, гэты год, 2008-ы, па рашэнні ЮНЕСКА аб'яўлены годам Рудакі — будзем урачыста адзначаць 1150 гадоў з дня яго нараджэння. Я расказваў у Арменіі, Азербайджане, Туркменіі пра тое, што працуем пры падтрымцы Прэзідэнта — дзівяцца.

— Ці ёсць у вас святы, кшталту Дня беларускага пісьменства?

— Ёсць. Дарэчы, і гэта таксама мая прапанова: упершыню ў гэтым годзе 4 верасня мы будзем святкаваць Дзень кнігі. Зноў жа — па Указе Прэзідэнта. А ўвесну, на свята Наўруз, як я казаў, пытанні літаратуры ўзнімаюцца заўсёды. І сёлета з 21 па 25 сакавіка, гэта значыць 5 дзён — паўсюль былі кніжныя кірмашы, прапагандавалі кнігу. Дзень друку мы раней адзначалі 5 мая, цяпер — у сакавіку, паколькі ў сакавіку выйшаў першы нумар нашай газеты — "Новы Таджык". Таму штогод 11 сакавіка — свята журналістаў, пісьменнікаў, выдаўцоў — Дзень друку.

Зараз у нас у краіне функцыянуюць прыватныя і дзяржаўныя выданні. Газет і часопісаў — звыш 300, з іх дзяржаўных толькі 5-6. У шэрага СМІ — літаратурны часопіс "Голас Усходу", які выходзіць з 1927 года і дзе друкуюцца творы нашых пісьменнікаў, ёсць літаратурны часопіс "Памир" на рускай мове, але ён мае малы тыраж — 500 экз. Ёсць часопіс "Святло Незалежнасці" — для маладых пісьменнікаў і газета "Літаратура і мастацтва" — дзяржаўная, выходзіць адзін раз на тыдзень, наклад — 3 тыс. асобнікаў. Маем таксама шмат прыватных выдавецтваў, якія друкуюць літаратурныя творы.

— Маладому літаратару цяжка сцвердзіцца?

— Не, калі ён таленавіты, яму дапамогуць.

— Аднак, творцы, акрамя таго, што звычайна маюць досыць добрыя кантакты між сабой, яшчэ і групуюцца ў аб'яднанні ды саюзы...

— Саюз пісьменнікаў Таджыкістана працуе як і ў часы Савецкага Саюза — ён у нас адзін. Я член праўлення Саюза пісьменнікаў. Ёсць секцыі прозы, паэзіі, драматургіі, літаратуразнаўства, публіцыстыкі. Калі аўтар прыносіць рукапіс — абмяркоўваем, ці варта яго выдаваць. Пытанні прыёму таксама разглядаем. Зараз у СПТ — звыш 300 чалавек.

— Якія тэмы найбольш злабадзённыя? Тыя, што непакоянь пісьменнікаў і адлюстраваныя ў сучаснай літаратуры...

— Мы перажылі страшэнную, цяжкую братазабойчую грамадзянскую вайну. Шмат пішацца, чаму так здарылася, чаму народ, які дбае пра культуру і мае вялікую спадчыну, пайшоў на гэта. Зараз мы асэнсавалі, што гэта было дарэмна, але за 4 апошнія гады мы паспелі наладзіць мірнае жыццё. І зараз больш увагі надаём выданню класічнай літаратуры, таму што класіка — наша апірышча. Шмат увагі надаём развіццю літаратуры для дзяцей і юнацтва: Таджыкістан шматдзетная краіна. А праблем багата. Рэальныя сённяшнія тыражы кніг — 500, 1 000 экземпляраў, у той час, як раней мы выдавалі кнігі накладам 10, 20 тысяч. Але, думаю, хутка да гэтага вернемся. Раней шмат было выданняў перакладных і цяпер спрабуем вярнуцца да гэтага. Прынамсі, за прамінулыя 4 гады мы пераклалі і выдалі 10 твораў замежных пісьменнікаў — у перакладзе на такжыкскую.

— І беларускую літаратуру перакладалі таксама?

— На жаль, пасля развалу Саюза кніг беларускіх аўтараў не выдавалі. Мы павінны нанова гэта зрабіць. Таму знаходзячыся тут, я пазнаёміўся з вашым кнігавыданнем, паспеў перамовіцца з беларускімі калегамі аб тым, каб за кароткі час падрыхтаваць анталогіі прозы і паэзіі Беларусі і Таджыкістана. Гэта прынята з вялікім задавальненнем. Анталогіі неабходна выдаваць з тым, каб ведалі, чым жывуць нашы літаратуры. А пасля зможам выдаваць і самыя лепшыя творы лепшых пісьменнікаў.

— Пры наяўнасці перакладчыкаў...

— Магчымы напачатку падрадковы пераклад. У Беларусі Сяргей Чыгрын выдатна валодае таджыкскай мовай. А ў далейшым можна гаварыць пра падрыхтоўку перакладчыкаў. У вашых ВНУ вучацца нашы юнакі і дзяўчаты. Мы можам накіраваць сюды і патэнцыйных перакладчыкаў, каб вучыліся, каб вывучалі беларускую мову, да прыкладу, на філфаку БДУ. Народ Беларусі — шчыры, з любоўю і павагай ставіцца да ўсіх. І Беларусь для нас — як родная.

Ірына ТУЛУПАВА

Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Літаратура і Мастацтва" шырокавядомая не толькі тым, што ў ёй, так бы мовіць, пад адным дахам згуртаваныя аўтарытэтныя, адны са старэйшых у Беларусі часопісы "Полымя", "Нёман", "Маладосць", "Всемирная литература" і газета "ЛіМ". Ва ўстанове значны сегмент дзейнасці адведзены кнігавыдавецкай справе. Тут пабачылі свет кнігі самай рознай тэматыкі і жанраў: дзіцячая літаратура, класічныя творы, краязнаўчыя выданні, мастацкія альбомы... Пра запатрабаванасць гэтых выданняў, між іншым, сведчыць той факт, што некаторыя з іх былі перавыдадзеныя. Днямі выйшла з друку кніга "Шчарбаты талер" (на рускай мове) Андрэя ФЕДАРЭНКІ. З гэтай добрай нагоды з аўтарам кнігі гутарыць карэспандэнт "ЛіМа".

Кніга, сцэнарый, фільм... ізноў кніга

— У РВУ "Літаратура і Мастацтва" пабачыла свет твая кніга "Шчарбаты талер" у перакладзе на рускую мову. Калі і ў якім выданні гэта аповесць выйшла упершыню?

— У 1997 годзе аповесць была надрукавана ў часопісе "Маладосць", у 1999 — выйшла ў выдавецтве "Юнацтва" асобнай кнігаю, двойчы перавыдавалася ў калектыўных зборніках серыі "Школьная бібліятэка", у 2000 годзе з'явілася рускамоўная кніга "Три талера" (Мн., "Современный литератор", /"Детектив для девочек и мальчиков"/).

— Звычайна літаратура ў адносінах да чытача падзяляецца на розныя ўзроставыя катэгорыі: дзіцячая, для старэйшага школьнага ўзросту і г.д. На мой погляд, "Шчарбаты талер" — універсальная кніга: яе з цікавасцю можа чытаць як моладзь, так і сталыя людзі. А вось ты як аўтар, пры задуме, распрацоўцы сюжэта і напісанні аповесці разлічваў у першую чаргу на ўвагу якога чытача?

— Я пісаў яе ў прамым сэнсе толькі "для сябе". Пачало ўспамінацца сваё маленства і захацелася пачытаць нешта такое, што б нагадала пра тыя дарагія гады... Чужыя творы ў той перыяд чамусьці "не пайшлі", і давялося рабіць гэта — пісаць твор — самому і для сябе. Доўга саромеўся аповесці, нікому не паказваў, не расказваў пра яе існаванне... Затым усё ж насмеліўся, толькі прыпісаў унізе "Аповесць для дзяцей" (своеасаблівае алібі) і аднёс у "Маладосць". Калі тагачасны рэдактар аддела прозы часопіса Анатоль Казлоў адазваўся пра "Талеры" прыблізна так: "Гэтая рэч неўзабаве выйдзе асобнай кніжкаю, будзе ўведзена ў школьныя хрэстаматыі, перакладзецца на рускую мову, па ёй будзе зняты фільм...", — я палічыў гэта ці то суцяшэннем аўтару, ці то няўдалым жартам...

— У наш час вельмі складана знайсці вопытнага, прафесійнага перакладчыка, які б адчуваў стыль і мову пісьменніка. Можа, таму ты сам і зрабіў пераклад "Шчарбатага талера" на рускую мову, ці былі іншыя прычыны?

— У выдавецтве "Современный литератор" прапаноўвалі прафесійнага перакладчыка,

але ў мяне быў вольны час і я рабіў гэта сам. Рэдактар пасля злаваўся, называў пераклад "падрадкоўнікам", але заўваг было на дзіва мала. З таго часу я так і перакладаю сябе сам, стараючыся быць максімальна набліжаным да арыгінала. Рэдактары звычайна сварацца, скептычна пасмейваюцца і... папраўляюць адзін-два беларусізмы на старонку.

— Да таго ж, ты сам напісаў сцэнарый паводле аповесці, стаў пераможцам конкурсу на лепшы сцэнарый тэлесерыяла пра жыццё беларускай моладзі, які сумесна ладзілі Белтэлерадыёкампанія, "Беларусьфільм" і Міністэрства культуры нашай краіны. Як вынік, на тэлеэкраны выйшла стужка "Тры талеры". Пра поспех гэтага фільма сведчыць нават тое, што "Тры талеры" ў Расіі з'явіліся на пірацкіх DVD. Пагадзіся, мала хто з сучасных беларускіх пісьменнікаў мае такую папулярнасць і запатрабаванасць...

— Груба кажучы, "папулярнасць і запатрабаванасць" (ды яшчэ такія сумніўныя, як у мяне) у шклянку не нальеш... Хай бы лепш гэты фільм меў меншы поспех, а я — хоць нейкі прыбытак. Вось, напрыклад, чытаю ў газеце "Антенна": "После премьеры на БТ-1 предложения закупить фильм поступили из Украины, Германии, Франции и даже Латинской Америки. А на одном из крупнейших российских каналов «Три талера» будут показаны уже в ближайшее время...». Паціскаю плячыма — і што мне з таго? Ні капеечкі. Факт, варты Кнігі рэкордаў Гінеса.

— Наконт сучаснага літаратурнага працэсу, як бы ты мог ахарактарызаваць яго цяперашні стан у Беларусі? У якім кірунку развіваецца сёння беларуская літаратура? Як пісьменнік і загадчык аддзела прозы часопіса "Маладосць" ты выдатна адчуваеш тэндэнцыі развіцця айчыннага прыгожага пісьменства. На твой погляд, якая будучыня ў нашай літаратуры?

— З аднаго боку — пішацца як ніколі многа, і як ніколі шырокі тэматычны абсяг: ад "жорсткага порна" да (не жартую) старшынь калгасаў. Словам, назіраецца спроба зацікавіць чытача ўсім, чым заўгодна і як заўгодна... З другога — усё гэта на фоне каласальнага, катастрафічнага паніжэння літаратурна-мастацкага і ўвогуле пісьменніцка-этычнага ўзроўню. Валам валяць рукапісы нявычытаныя, неахайныя, без нумарацыі старонак, без прозвішча аўтара, без указання жанру... Цяперашні адзін-адзіны рэдактар аддзела прозы пры ўсім жаданні мала што ў гэтым кірунку можа змяніць. Чамусьці ніхто не разумее, што прайшлі залатыя часы, калі ў аддзелах прозы кожнага часопіса было па 3 (тры!) рэдактары, плюс адказны сакратар, плюс намеснік галоўнага рэдактара — абавязкова сам аўтарытэтны празаік, разам — 5 чалавек, і кожны мог штосьці паправіць, заўважыць, падказаць... А галоўнае, пры такім раскладзе не ўсе аўтары адважваліся несці такія, як нясуць цяпер, "цяп-ляпы" — элементарна саромеліся ці баяліся...

— На тваю думку, якія літаратурныя жанры зараз запатрабаваныя ў нашым грамадстве і якім з іх ты асабіста надаеш перавагу?

— Асабіста я хацеў бы пачытаць нейкі такі сплаў эсэ, публіцыстыкі, біяграфіі, крытыкі і мастацкага вымыслу — "у адным", кшталту "Іншых берагоў" Набокава...

♦ Прэзентацыя кнігі А.Федарэнкі "Три талера" адбудзецца 28 красавіка а 15-й гадзіне на Міжнароднай спецыялізаванай выстаўцы "СМІ ў Беларусі" (вул. Я. Купалы, 27) ля стэнда РВУ "Літаратура і Мастацтва".

Віктар КАВАЛЁЎ

Фота аўтара

Пілігрымка на Пухавіччыну

Выбітныя турыстычныя маршруты, што расказваюць падарожнікам пра прыгажосць ды дасягненні Айчыны, з'яўляюцца ў Беларусі як вясновыя пралескі сярод бору — ад першай смелай, упартай да жыцця кветачкі да ўражлівага суквецця, што сцелецца дываном па ўсіх далягляд.

Беларусь умее быць гасціннай. У гэтым пераканаліся многія пачэсныя госці з краін блізкага і далёкага замежжа ды неўтаймоўныя вандроўнікі, якія штодзень прыязджаюць у краіну. Штогод мы прымаем замежных турыстаў больш, чым у год прамінулы. Так сведчыць статыстыка Міністэрства спорту і турызму Рэспублікі Беларусь. Калі ж улічыць і тых, што «кватаравалі» не толькі ў гасцініцах, а наведвалі беларускія хаткі ды аграсядзібы, то фактычна пілігрымаў у Беларусі ці не ў чатыры разы больш: людзі прыязджаюць да нас не толькі па турыстычных пуцёўках, але і самастойна, на 2 — 3 дні. У адна- і двухдзённыя вандроўкі адпраўляюцца і цікаўныя беларусы — тыя, хто дазваляе сабе раскошу ў выходныя захапляцца унікальнай непаўторнасцю краю.

Турызм спрыяе росту самасвядомасці і пачуцця гордасці за Радзіму. А развіццё турыстычнай галіны спрыяе і росквіту дзяржавы. Калі ж гаварыць пра турызм сельскі, то ён у значнай ступені спрыяе адраджэнню вёскі, тых любых куточкаў, пра якія помніць не адно пакаленне беларусаў.

Рэальнае развіццё турызму ў Беларусі апошнімі гадамі адбываецца на ўзроўні канктрэтных рэгіёнаў: гарадоў, раёнаў. Узяць да прыкладу, Пухавіцкі раён. Актуальны стан і перспектывы развіцця турызму у гэтых мясцінах разглядаліся на пасяджэнні "круглага стала", які напрыканцы сакавіка зладкавалі на сядзібе "Зарачаны".

— Мы імкнуліся зірнуць на развіццё турызму ў Пухавіцкім раёне цэласна, — патлумачыў кандыдат гістарычных навук, рэгіянальны каардынатар па Мінскай вобласці Праграмы падтрымкі Беларусі Федэральнага ўрада Германіі Дзмітрый Карпіевіч. — *Таму на «круглы стол» былі запрошаны ўстановы, якія займаюцца рознымі аспектамі ў раёне, што датычаць турызму. Прааналізавалі сітуацыю. І тут быў прадстаўлены досвед дзейнасці розных структур.*

У рэгіёне размяшчаецца досыць вядомы музей «Дудуткі», які з'яўляецца першынцам сярод турыстычных сядзіб краіны. І менавіта тут ёсць разуменне, што турыстычная дзейнасць — важная сфера эканомікі. Гэта не нейкія мроі і не абстракцыя, а новыя працоўныя месцы, рэальныя рэсурсы. Але каб яны існавалі, варта прыкласці багата намаганняў. Развіццё турызму не можа залежаць ад нейкай адной структуры. Прынамсі, можна зрабіць выбітны аб'ект, але калі да яго будуць дрэнныя пад'езды, не будзе нідзе інфармацыі, зноў жа не будзе ніякіх крамаў — то і не будзе жаданага патоку турыстаў.

У Пухавіцкім раёне палягае геаграфічны цэнтр Беларусі — патэнцыял яго пакуль недастаткова выкарыстоўваецца. Прычынаю — усё тыя ж славутыя дарогі, што могуць альбо спрасціць шлях вандроўніка, альбо ўскладніць яго. Выпадковасць гэта ці не, але цэнтр Беларусі знаходзіцца ў полі. Хаця такі аб'ект мог бы быць часткай маршрутаў.

— Таму так варта цяпер прадстаўляць новыя кірункі, — заўважыла старшыня праўлення ГА "Агра-экатурызм" Валерыя Кліцунова, якая распавяла пра ўзаемадзеянне з кіраўнікамі розных узроўняў. *— Для турыстаў важна, каб было месца дзе пераначаваць, але і трэба, каб была так званая атракцыя — нейкі від дзейнасці, інтарэс, які б мог займаць людзей. Ці то схадзіць на пасеку, ці то паездзіць на лодцы, альбо пабавіць час на веласіпеднай трасе. Адна структура не ў стане ўсё гэта забяспечыць. Была, праўда, ідэя, каб арганізоўваць раённыя фестывалі і фэсты з тым, каб было цікава паўдзельнічаць і гасцям...*

Пухавічы — непадалёк ад Мінска, і гэта таксама трэба скарыстоўваць. Шмат праводзіцца ў горадзе фестываляў, але вельмі слаба разгорнута інфармацыйная праца. На бліжэйшую перспектыву запланаваны выпуск буклета пра тутэйшыя помнікі ды сядзібы. Плануецца ўцягнуць у турыстычную сферу рамеснікаў — каб выраблялі мясцовыя сувеніры. Гаварылася, што, прыкладам, у Мар'інай Горцы варта адкрыць краму, якая б рэалізоўвала вырабы народных майстроў. Між іншым, у краінах Еўропы турыстычная галіна ў валавым унутраным прадукце займае да 70 працэнтаў. У нас ставіцца пытанне, каб дасягнуць хаця б пяці працэнтаў. Калі гаварыць пра ўвесь раён, то, як зазначыў начальнік аддзела па фізічнай культуры, спорце і турызме Пухавіцкага райвыканкама Леанід Страх, эканамічны эфект ад дзейнасці аднаго толькі Пухавіцкага цэнтра дзіцячаюнацкага турызму і экскурсій —40 млн. рублёў!

Цяжкі, падаецца, толькі пачатак. Зараз на Пухавічыне 3 аграсядзібы: «Хата Бабра», «У Надзеі» і «Зарачаны». Ёсць ідэя зрабіць невялічкі прыватны конны цэнтр, дзе б — і дзеці, і дарослыя, ездзілі на конях. Проста прыехаўшы ў рэгіён, гадзіну-дзве пабавілі на свежым паветры. Магчымыя і рэгулярныя заняткі, распрацоўка конных маршрутаў. У людзей зацікаўленых маецца еўрапейскі, амерыканскі досвед, дзе ўтвораны такія невялікія кампактныя цэнтры. Калі будзе шмат падобных месцаў, і помнікаў, і сядзіб — знойдуцца і новыя турыстычныя маршруты, больш упэўнена ў турыстычнай прасторы стане пачуваць сябе і беларуская глыбінка — невычэрпная скарбніца народных традыцый і характараў, крыніца фізічнай і духоўнай моцы дзяржавы.

Ірына ТУЛУПАВА

Тэатралізуюць Чэхава...

У Мінскім абласным драматычным тэатры г. Маладзечна пастаўлена складаная творчая задача — зрабіць адзін спектакль, аб'яднаны агульнай сцэнічнай канцэпцыяй, з пяці твораў Антона Чэхава.

Для пастаноўкі ўзятыя "Мядзведзь", "Вяселле", "Лебядзіная песня", "Дэпутат" і "Прапанова". У спектаклі будзе занята ўся трупа. Больш за тое, вядучым акцёрам тэатра прыйдзецца некалькі разоў пераўвасабляцца ў розных персанажаў.

Ужо вядома імя рэжысёра. Гэта Валерый Раеўскі, мастацкі кіраўнік Нацыянальнага драматычнага тэатра імя Янкі Купалы. Музыка да дзеі ўжо напісана кампазітарам Аляксандрам Рэнанскім. Сцэнічнымі касцюмамі займаўся заслужаны мастак Беларусі Барыс Герлаван.

Настасся ХАРУК

Водгук

Дыскусія вакол сотні лепшых паэтаў — пэўна, найбольш цікавая з'ява пачатку літаратурнага года (артыкулы ў "Маладосці", "ЛіМе"...). Важна, што гэты праект абуджае цікавасць не толькі ў вузкім коле прафесіяналаў, але і сярод чытачоў. Мяркую, што далёка не кожны паэт прачытае вершаваную падборку свайго калегі, а вось рэйтынгі "самых лепшых", думаецца, прачытвае абсалютная большасць тых, хто атаясамлівае сябе з гэтай сацыяльнай катэгорыяй.

Рэйтынгі і ранжыры

Адпаведна актуальнасць праекта мае некалькі розных вымярэнняў. Адбываецца дыскусія даволі шчырая. Памятаю яшчэ тыя часы, калі пра пісьменнікаў крытыкі казалі, як пра "небажыцеляў", у сэнсе, як пра нябожчыкаў. Пісалі або добрае, або нічога.

Апошнім часам крытыка нярэдка імкнецца давесці творцу да гэтага эвалюцыйнага стану. У выпадку з рэйтынгамі атрымліваецца нешта сінтэзаванае — і відавочныя канфліктныя сентэнцыі, і, разам з тым, моцны пазітыўны элемент: вызначаюцца і называюцца лепшыя. Такія спісы маюць і стымулюючы эфект — назвалі адным з лепшых, дык трэба ці больш пісаць (каб не забылі), ці, наадварот, выдаваць больш якасны прадукт і больш паважаць чытача...

Ствараецца і пэўны псіхатэрапеўтычны эфект: паэт-чалавек можа сказаць сябрам, блізкім, знаёмым, суродзічам, што "я сярод "лепшых", і адпаведна выклікаць пэўную павагу. З іншага боку, тут ёсць і адмоўныя, негатыўныя праекцыі. Уявіце сабе, што паэта, які шчыра ўлюбёны ў сваю музу і лічыць вершапісанне галоўным у жыцці, не ўключылі ў спіс. Чалавек шчыра ўпэўнены, што ён лепшы, а тут не тое што срэбнага ці бронзавага медаля не далі, але нават і ганаровай граматы як увайшоўшаму ў першую дзесятку альбо... у першую "сотню".

Толькі што размаўляў на гэтую тэму са сваім аднакласнікам, унукам класіка беларускай паэзіі (творчасць яго дзеда да гэтай пары вывучаюць у школе), каго б ён увёў у такую сотню. Той налічыў увогуле каля дваццаці прозвішчаў, якія ведае (ад Янкі Купалы да аўтара "Песні пра зубра"(ён памятае што ёсць такі твор, але не памятае імя аўтара). Дык вось, уявіце, як сябе можа пачуваць у такой сітуацыі шчыра адданы *службоўца* музе. Таму сказаць, што ёсць сто лепшых.... гэта — як сказаць, што ўсе астатнія горшыя. Я ўжо не кажу пра амаль спартыўныя рэйтынгі ўнутры сотні — нехта іх ставіць у алфавітным парадку, нехта паводле вызначанай якасці тэкстаў, нехта ў выпадковым парадку як успомнілася. І ў дадзеным выпадку крытыкі бяруць адказнасць не меншую чым выкладчыкі.

Такую аналогію варта праводзіць, бо паэты як дзеці, у іх (нас) ёсць абвостранае пачуццё годнасці, і як у кожнага дзіцяці, якое думае эмацыянальна а не рацыянальна. Больш "прасунутыя" пачынаюць актыўна даказваць сваю выключнасць.

Мяркую, што кожны аўтар, наколькі б аб'ектыўным ні быў крытык, усё ж такі застанецца пры сваёй суб'ектыўнасці. Я вызначыў бы некалькі асноўных аспектаў, на якія варта звяртаць увагу. Калі я пачаў складаць сваю "сотню", то некалькі разоў пераглядаючы спіс лавіў сябе на відавочнай суб'ектыўнасці, прычым на працягу некалькіх дзён, тыдняў, першых месяцаў 2008 года спіс істотна мяняўся, скажам, дапаўняўся і выйшла тое, што атрымалася — да сотні падмаляваўся нулік.

За дваццаць год пісання-чытання-друкавання прыйшлося пазнаёміцца з вялікай колькасцю аўтараў. Цікава тое, што з кожным годам адносіны да беларускай паэзіі, беларускай літаратуры ўвогуле значна і кардынальна мяняліся.

Калі яшчэ ў школе рабіў тэлеперадачу, прысвечаную літаратуры, то мяне цікавілі, можа быць, толькі "Тутэйшыя", хранічна не пераносіў усё, што было ў школьнай праграме (за невялікімі выключэннямі), і амаль усіх трыста на той час сяброў саюза лічыў графаманамі. Таму можна казаць пра тое, што многім значна лягчэй стварыць чорную "сотню" — спіс "горшых" пісьменнікаў. У мяне з кожным годам "чорны спіс" памяншаўся, а "белы" павялічваўся. Пасля "Тутэйшых" з'явілася "Таварыства вольных літаратараў", пасля "ТВЛ" "Бум-Бам-Літ", пасля розныя "франты мастацтваў" і г. д.

Шчыра кажучы, вельмі цяжка вызначыць, хто сапраўды мае моцныя тэксты, а хто проста сябра ці знаёмы. Бо ёсць паэты, якіх хранічна не выношу як фізічных асоб, але вымушаны змірыцца з тым, што яны сапраўды напісалі многа вартага. Вельмі істотны момант, нават падсвядома, — кантэкст, у які трапляе той ці іншы рэйтынг. Скажам, многія нармальна адносяцца да той сітуацыі, калі паэты становяцца крытыкамі: ты напішаш пра мяне, я пасля напішу пра цябе. Прычым неабавязкова добра — галоўнае што-небудзь.

Таму, напрыклад, калі гэты артыкул адносіць у "Маладосць", спіс лепшых паэтаў будзе пачынацца з Раісы Баравіковай, калі ў "ЛіМ" — з Леаніда Галубовіча (з Галубовіча таму, што Казлоў — празаік), калі ў "Гоман" — абавязкова з Трафімчука, калі ў "Тэксты" — з Вішнёва і г. д.

Пасля пойдуць мае сябры, аднакурснікі, якія лічаць сябе паэтамі. Мне падаецца, што кожны, хто ведае беларускую мову, можа лічыцца паэтам у шырокім сэнсе гэтага слова. Як пісаў Юрась Барысевіч, беларускі чытач —гэта беларускі пісьменнік, у якога няма знаёмых у выдавецтвах. Цяпер можна перафразіраваць: чытач — гэта пісьменнік, у якога няма грошай. Праўда, шмат што мяняе Інтэрнет, але ўсё ж такі пакуль жыве стэрэатып, што сецітура не зусім літаратура, яшчэ ў большасці з нас моцная папяровая залежнасць.

Ёсць пэўная колькасць аўтараў якім я "дапамагаў" пісаць вершы (звычайна віншавальныя), за пэўную падзяку. Вядома для мяне такія "паэты" самыя любімыя (некалькі дзесяткаў).

Пасля пойдуць настаўнікі, якія вучылі мяне пісаць (школьныя, універсітэцкія, рэдактары часопісаў, газет , выдавецтваў, рэцэнзенты), не ўпэўнены, што набярэцца сотня, але некалькі дзесяткаў — дакладна. Пасля мае вучні, студэнты (больш ста аўтараў). Далей суседзі па друкавальнай пляцоўцы — сотні аўтараў "Гомана", суседзі па тым выданні, у якім выйдзе гэты артыкул і г. д., калегі, з якімі даводзілася разам выступаць на розных пляцоўках... Вось атрымліваецца прыблізна тысяча.

Такім чынам, атрымліваецца, што павінны быць задаволенымі амаль усе. Праўда, гэты спіс даволі рызыкоўны. Праблема заключаецца ў тым, што не ўсе пісьменнікі, асабліва паэты, згаджаюцца быць у адной абойме. А Мальдзіс неяк скардзіўся, што многім, хто ўвайшоў у энцыклапедыю "Беларускія пісьменнікі", не падабалася, скажам, такое суседства, калі на адной і той жа старонцы ў алфавітным парадку знаходзіцца і той, каго расстрэльвалі, і той, хто расстрэльваў.

Таму, вядома, я чакаю шквалу крытыкі за падобны рэйтынг, менавіта з-за такіх канфліктных сітуацый. Ёсць небяспека і з той прычыны, што нехта можа не ўвайсці ў залатую тысячу. А гэта ўжо будзе амаль невыбачальная абраза.

Важна яшчэ ўдакладніць і сферу літаратурнай дзейнасці. Я асобна ўвёў бы рэйтынг крытыкаў, драматургаў, празаікаў, таксама нешта кшталту шматбор'я — хто вылучаецца ў розных намінацыях, скажам, крытык — паэт — драматург — выкладчык (напрыклад, Сяргей Кавалёў), паэт — навуковец-літаратуразнаўца — перакладчык — бард — драматург (Серж Мінскевіч) і г. д. Таму, скажам, праца па класіфікацыі, унарматываванасці і індэксаванні рэйтынгаў лепшых толькі пачынаецца.

АрТур

«Нябесны знак»

З 2000 г. у горадзе Гродна дзейнічае літаратурна-музычнае грамадскае аб'яднанне "Нябесны знак". Яго заснавала вядомая беларуская паэтэса, сябра Саюза пісьменнікаў Беларусі Марыя Шаўчонак. У складзе аб'яднання людзі розных прафесій, узростаў, характараў, лёсаў. Але ўсе яны надзелены нябесным дарам — тварыць з дапамогай слова.

Жыццё "Нябеснага знака" насычанае цікавымі падзеямі: прэзентацыі кніг, творчыя вечарыны і сустрэчы, зносіны з вядомымі паэтамі Санкт-Пецярбурга, Масквы, Беластока. А яшчэ падрыхтоўка і выданне аднайменнага альманаха. У 2007 годзе выйшаў яго 5-м нумар, а гэта значыць — юбілейны. Дзякуючы няспыннаму пашырэнню творчых сувязяў, ён пазначаны як міжнародны. У першым яго раздзеле "Мерыдыяны «Нябеснага знака»" надрукаваны творы Яна Леанчука (Польшча), А.Кавалюк (Санкт-Пецярбург), С.Кура (Сан-Францыска) і іншых.

Рэдкалегія "Нябеснага знака" мяркуе, што ў наступным нумары некаторыя аўтары ў альманаху друкавацца, магчыма, не будуць. Чаму? Таму што яны ўжо прыняты ў Саюз пісьменнікаў Беларусі. Аб'яднанне "Нябесны знак", такім чынам, стала для іх як бы той роднай сям'ёй, у якой яны пасталелі і адкуль прадоўжылі шлях да творчага майстэрства. Гэта — Анатоль Апанасевіч, Віктар Баранчык, Раіса Байкова, Ірына Данік-Навуменка, Таццяна Сучкова, Мікалай Сяроў, Людміла Шаўчэнка. "Нябесны знак" цэніць кожнага з іх як адметную асобу, шчыра жадае ім знайсці свае пачэсныя месцы ў літаратуры Беларусі.

Пяты нумар альманаха прыняў на свае старонкі як аўтараў вядомых на Гродзеншчыне, так і тых, якія нядаўна выдалі ці збіраюцца выдаць першыя кнігі (Марыя Цітарчук, Ірына Пятрова, Святлана Барнавалава, Гвідон Ждановіч, Валянціна Драбышэўская, Нона Банадыкава), і такіх, хто кніг пакуль што не мае (Святлана Маглыш, Лада Рудзікава, Вольга Пянькова і іншыя), а таксама тых, хто піша "для сябе" альбо толькі пачынаюць пісаць (Насця Бярозава, Таццяна Заяц, Дзмітрый Карамазаў і іншыя). З гэтай нагоды і чытач "Нябеснага знака" можа быць самым розным: тут знойдуць для сябе шмат цікавага і дасведчаныя ў літаратуры знаўцы, і аматары пачытаць "непрафесіяналаў" і "пачаткоўцаў", паназіраць за іх творчым ростам.

Паэтычны свет "Нябеснага знака" вельмі разнастайны: вершы песенныя і гутаркова-рэчытатыўныя, сюжэтныя і суб'ектыўна-пачуццёвыя, сумна-элегічныя і гумарыстычна-іранічныя, з вобразамі яснымі, канкрэтнымі і складанымі, асацыятыўнымі, на беларускай і рускай мовах.

На розным узроўні паэтычнага майстэрства знаходзяцца аўтары "Нябеснага знака". Ды самае галоўнае — альманах даў усім ім права выказацца і быць пачутымі, расці і ўдасканальвацца, каб дасягнуць сваёй творчай вышыні.

Галіна САМОЙЛА

Кніжная паліца



У выдавецтве "Канфіда" пабачыла свет кніга вянка вянкоў санетаў **Зміцера МАРОЗАВА** *"Апакаліпсіс душы"*. Гэта не толькі першы ў нацыянальнай літаратуры твор такой складанай санетнай структуры, але першы і ў агульнаславянскай літаратуры. Увогуле ўсяго толькі некалькі паэтаў у свеце рашыліся на напісанне такога паэтычнага палатна. У кніжцы выдрукаваны і пераклад вянка вянкоў санетаў на рускую мову. Зрабіў гэта Андрэй Цяўлоўскі.

У выдавецтве "Кнігазбор" выйшла навуковае выданне **Івана ШТЭЙНЕРА** *"Super flumina babylonis"* (біблейскія міфалагемы ў паэзіі Рыгора Барадуліна). У зборніку аналізуюцца перапевы і пераствараннні евангельскіх міфалагем у паэзіі Р. Барадуліна на фоне класічных і нацыянальных традыцый. Зроблена спроба аналізу вобразнавыяўленчай сістэмы і паэтыкі твораў, паказана іх роля ў творчай эвалюцыі народнага паэта і беларускай паэзіі ў цэлым.

У Мінску ў выдавецтве "Асобны" выйшла новая кніга **Анатоля БАРОЎСКАГА** *"Искушение"* (раман-фантасмагорыя). Расповед на рускай мове пра мастака Антона Клімовіча, які паддаўся спакусе цёмных патойбаковых сіл, каб пасля з вялікай цяжкасцю вырывацца з д'ябальскага нерату.

У выдавецтве "Кнігазбор" выйшла навуковае выданне **Івана ШТЭЙНЕРА** *"Свае руны мне не вышыць..."* (спадчына Анатоля Сыса). У эсэ на фоне класічных традыцый падаюцца творчы партрэт аднаго з вядучых паэтаў канца мінулага стагоддзя.



У выдавецтве Логвінава выйшаў чарговы паэтычны зборнік **Андрэя ХАДАНОВІЧА** *"Бэрлібры"* (гісторыя ў чатырох фільмах). У кніжку ўвайшлі верлібры, напісаныя аўтарам цягам 2004—2007 гадоў падчас вандровак па Берліне, Кракаве, Браціславе і Мінску. Адмысловая філалагічная версіфікацыя ў іранічна-правакацыйным стылі.



У выдавецтве Логвінава выйшаў зборнік паэтычных тэкстаў **Вольгі ГАПЕЕВАЙ** *"Няголены ранак"*. Як піша сама аўтарка, *"вершы таксама людзі і занадта блізкія кантакты з імі могуць выклікаць аргазмічны або шызафрэнічны стан"*. Вядома, Вольга мае на ўвазе найперш уласныя вершы.

АЭС колеру белай паганкі

26 красавіка 1986 года я прачнуўся на золку. Было цудоўнае вясновае надвор'е і настрой быў адпаведны.

Напярэдадні я паабяцаў сябрам звазіць іх на рыбалку на новае, аблюбаванае не так даўно месца.

Бераг срэбнага Сожа, непадалёк ад мяжы з Украінай, сустрэў нас маладым муражком і вясновымі кветачкамі вясёлкавых колераў. Сябры, спадзеючыся на рыбацкае шчасце, займаліся сваёй справай, а я — сваёй...

У маёй майстэрні і зараз вісіць той акварэльны эцюд, нагадваючы небяспечную раніцу чарнобыльскай эпохі і нашыя наіўныя памкненні...

Рыбалілі мы ў той дзень, у якіх-небудзь паўсотні кіламетраў ад Чарнобыльскай АЭС імя У. І. Леніна.

Калі людзі даведаліся пра чарнобыльскую катастрофу — быў шок. Ніхто не ведаў, што рабіць... СМІ далдонілі пра тое, што нічога страшнага ў выніку разбурэння атамнага рэактара не адбылося... Трэба толькі добра зачыніць вокны і не выходзіць на вуліцу...

Але, былі і героі, якія насуперак інстынкту самазахавання імкнуліся ў самае пекла чарнобыльскай бяды, каб цаной здароўя ці жыцця дапамагчы Радзіме. Такіх, сапраўдных патрыётаў, вельмі многа і аб іх напісаны шматлікія тамы кніг, яны ўвекавечаны ў помніках і абеліскаў...

Сярод гэтых апантаных людзей былі і прадстаўнікі творчай інтэлігенцыі: журналісты, мастакі, пісьменнікі. Хачу распавесці пра аднаго з іх — паэта Міхася Башлакова, майго земляка.

* * *

Міхась Захаравіч Башлакоў з мая 1986 года па 1990 год аб'ездзіў усе найбольш забруджаныя радыяцыяй раёны Гомельскай вобласці, дзе зрабіў больш як 2 000 выступленняў перад жыхарамі ў клубах і бібліятэках, на фермах і фабрыках... Людзі распавядалі пра сваё гора, дзяліліся з ім сваімі назіраннямі і крыўдамі... Як вынік, нарадзілася паэма "Лілея на цёмнай вадзе" і шматлікія вершы. Яшчэ дадам, што Міхась Захаравіч згубіў там сваё здароўе...

Цудоўны падарунак усім прыхільнікам прыгожага пісьменства зрабілі паэт Міхась Башлакоў і мастак Міхась Барздыка. Па заказе Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь Мінская фабрыка каляровага друку выпусціла ў свет іх новую кнігу паэзіі і графікі "Палын" тыражом 2 000 экземпляраў, прымеркаваную да 20-й гадавіны чарнобыльскай трагедыі.

Не прыгадаю, каго з беларускіх паэтаў выдавалі гэтак прыгожа, на такім высокім мастацкім і паліграфічным узроўні. І невыпадкова іх папярэдняя сумесная праца "Нетры" (2004) на Міжнародным кніжным кірмашы ў Франкфурце-на-Майне 2005 года, дзе былі прадстаў-лены лепшыя выданні больш як 10 тысяч выдавецтваў са 135 краін свету, атрымала вельмі высокую ацэнку і ўвайшла

ў лік "100 найлепшых кніг свету". Безумоўна, гэта значная падзея ў культурным жыцці нашай краіны! Але калі ў "Нетрах" тонкая і пранізлівая лірыка Міхася Башлакова друкуецца на дзвюх мовах — беларускай і рускай, то ў "Палыне" — яшчэ і на англійскай, што дае магчымасць пазнаёміцца з кнігай не толькі нашаму, але і замежнаму чытачу.

У кнізе "Палын" праз выяўленча-вобразныя сродкі графікі і паэзіі распавядаецца аб найбуйнейшай у свеце тэхнагеннай катастрофе XX стагоддзя і яе трагічных выніках. Прарочыя словы святога Іаана Багаслова пра зорку Палын лейтматывам праходзяць праз усю кнігу, знітоўваючы ў адзінае цэлае яе структуру і змест. Кніга складаецца з чатырох частак, якія размешчаны ў форме крыжа, прытым кожная з іх нясе сваю сэнсавую нагрузку. Кожная рысачка мае сваё пэўнае значэнне і выконвае сваю істотную ролю, адпавядае пранікнёным паэтычным радкам Міхася Башлакова. Творы абодвух аўтараў як бы дапаўняюць адзін аднаго, што надае ім цэласнасць і маналітнасць. Мастацкае афармленне і графічныя лісты Міхася Барздыкі, беларускага мастака сусветнага ўзроўню, па-майстэрску вытанчаныя, светлыя і таямнічыя. Кніга "Палын" адзначана элітным залатым медалём на Міжнародным конкурсе ў Бельгіі ў 2006 годзе, а сёлета кнігі "Нетры" і "Палын" вылучаны на саісканне Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь. Упэўнены, што яны нясуць чытачам эстэтычнае задавальненне, бо сустрэча з сапраўднай паэзіяй, з сапраўдным мастацтвам — заўсёды найвялікшая радасць для кожнага з нас.

* * *

Мяне, як мастака і паэта, заўсёды вабіць і цягне да сябе Палессе: Тураў, Лельчыцы, Мазыр, Нароўля... Прыгажосць і самабытнасць, гасціннасць і мудрасць палешукоў насычаюць сілай і душу, і цела. Для мяне асабіста няма нічога больш прыгажэйшага, любага і роднага, чым гэтая гаючая зямля — Палессе.

Хуткацечная бурштынавая Прыпяць, натоленая прытокамі ад вытока да вусця, спяшаецца да Дняпра праз гаі, бары і дубровы Палесся. Там, дзе незамярзаючая і ў пякучыя маразы, жвавая рачулка Нараўлянка ўпадае ў Прыпяць, стаіць горад Нароўля — раённы цэнтр аднаго з самых паўднёвых раёнаў Гомельшчыны.

Нароўля... Калі бываю тут, перш за ўсё іду ў стары парк, што на беразе Прыпяці. Адчуваецца, што праекціраваў і закладваў яго разумны і заможны гаспадар. Кожная дробязь, якая яшчэ нейкім чынам захавалася з пачатку XIX стагоддзя, нагадвае аб гэтым. Нібы сапраўдны цуд, стаіць белым лебедзем альтанка-маяк, не кранутая супярэчлівым часам, углядаючыся за далягляды стагоддзяў... Аб чым ёй мроіцца? Вядома ж, — аб светлым мінулым... Аб чым жа яшчэ, калі так моцна цісне Чарнобыль, які зусім побач... Шмат нараўлян раскідаў ён па свеце, але шмат і засталося, бо няма сілы паабрываць карані радаводаў, што гудуць напятымі струнамі...

На беразе Прыпяці стаіць Помнік адселеным вёскам Нараўлянскага раёна: Дуброва, Ціхін, Углы, Ясенок, Лісава, Радомля, Акопы, Баравічы, Ленінскі пасёлак, Міхайлаўка, Чапаеўка, Ліхоўня, Данілеяўка, Вяжышча, Антонаўка, Белабярэжская Рудня, Белы Бераг, Гамарня, Дворышча, Карповічы, Цешкаў, Грыдні. Гэтыя вёскі загінулі ў мірны час...

* * *

Адразу за Мазыром, пры дарозе на Лельчыцы, бруіцца крыніца з жывой вадой. Ніхто не мінае яе, каб не пакланіцца ёй і не наталіць смагу душы і цела.

Пабываў я і на самой Чарнобыльскай АЭС, бо жадаў паглядзець у вочы гэтай крыважэрнай пачвары. Аграмадная, уладкаваная яе тэрыторыя нагадвае палігон ці касмадром... Больш за ўсё ўразіў абагульняючы гэтага цмока колер — колер белай паганкі.

Чарнобыль зрабіў сваю брудную справу... Шкада. Але, нічога бясследна не знікае. Не знікне і Палессе. Вунь, аднавіліся ж і Крыж Еўфрасінні Полацкай, і Мірскі замак...

Генадзь ГОВАР

На здымку: карціна Г. Говара.

У выдавецтве "Народная кніга" пабачыў свет трэці зборнік пародый і сатырычных мініяцюр Анатоля Зэкава "Кругі ў галаве". Напэўна, прыхільнікі творчасці гэтага паэта ведаюць, што яшчэ ў сярэдзіне дзевяностых ён выдаў дзве кніжачкі адмысловых пародый ("Дуэль" і "Дуэль-2"), якія па тым часе мелі заўважны літаратурны поспех як у саміх паэтаў, так і ў прыхільнікаў паэзіі.



Артыкул для Зэкава

Безумоўна, каб пісаць у парадыйным жанры, трэба быць мужным чалавекам. Гэта, калі пішаш прымітыўна і вульгарна. Калі ж — з павагай да аўтараў і з разуменнем іх мастацкай і грамадзянскай пазіцыі, тады патрэбна не *смеласць*, а — **талент**. Як і ва ўсякай літаратурнай творчасці.

Сам жанр пародыі, па вялікім рахунку, вымагае не так высмейвання ды іроніі напісанага тым ці іншым паэтам і пісьменнікам, як выяўлення літаратурнага стылю твора, яго мастацкага накірунку і характару літаратурнай творчасці аўтара ўвогуле.

Скажу адразу, што не заўсёды пародыі А. Зэкава вытрымліваюць высокую планку мастацкасці і версіфікацыйнай майстравітасці, але рэдка калі бываюць выпадковымі ці наўмыснымі, а тым больш зламыснымі. Вось і ў новай сваёй кніжцы "Кругі ў галаве" А. Зэкаў, *выстраіўшы* пародыі спараджэираваных ім аўтараў у алфавітным парадку, мне здаецца, пайшоў лягчэйшым шляхам. Бо мог бы скампанаваць тэксты па тэматычных раздзелах. Адразу кідаецца ў вочы акцэнтацыя парадыста на моўных пытаннях. Скажам, у вершы В. Аколавай ён паказвае на візуальныя філалагічныя хібы аўтаркі (*"дзень для ночы — як сястра і брат"*), з неадпаведнасці якіх і іранізуе парадыст, маўляў, усё наадварот, гэта *ноч для дня — як сястра і брат*. Добра *выстаўлена* на свет Божы А. Зэкавым і *"глыбіннае акно"* М. Баравік. А вось пародыя на верш Д. Бічэль, якую парадыст назваў "Забытыя словы", атрымалася не зусім пераканаўчай з той простай прычыны, што парадзіраваць балючую тэму беларускай мовы справа не заўсёды дарэчная. Больш за тое, калі ў сваім вершы Д. Бічэль спрабуе напомніць чытачам і, мажліва, такім чынам увесці ва ўжытак прыгожыя і цікавыя, але прызабытыя старыя словы — білы, матавіла, пранік, церніца, апалушкі, пярэтычкі, дылі, то ў сваёй пародыі А. Зэкаў над гэтым спрадвечным беларускамоўным клопатам нашай нацыянальнай інтэлігенцыі чамусьці хітравата падсмейваецца... Хоць з чаго тут іранізаваць:

...матавіла, барташка,
апалушкі, пярэтычкі,
дылі, білы, сявенькі...
Колькі слоў паўмірала —
бабулек сівенькіх, —
піша Д. Бічэль.

Таму цяжка зразумець парадыйную выснову А. Зэкава:

Як тут вершы мне пісаць,
бо без слоў забытых цяжка
нават рыфму адшукаць.

І ўсё ж, як чалавек таленавіты і ў літаратурных справах вопытны, ён умее паказаць і па-мастацку выявіць самыя тонкія і малазаўважныя ў жыцці творцаў, менавіта для іх характэрныя, нюансы і дэталі. Як гэта, да прыкладу, здарылася ў пародыі на вершы С. Адамовіча "Два цені" і В. Аксак "Тут і там". Трапна пад'ялдыкнуў ён і Э. Акуліна ў пародыі "Словы пад дровы".

Але трапляюцца, на жаль, і вульгарныя пародыі, як, скажам, на пашанотнага літаратурнага старэйшыну М. Аўрамчыка ("За даўганогай незнаёмкай"). У звязку з гэтым хацелася б заўважыць, што пра каханне і больш блізкія, скажам інтэлігентна, міжпаловыя адносіны нашы парадысты чамусьці пішуць найбольш і найчасцей. Слоў няма, тэма гарачая і прыцягальная. Аднак, як і пры сапраўдным каханні тут трэба быць тонкім лірыкам і "гжэчным кавалерам", як раней казалі ў нас за Польшчай, трымаць сябе ў лепшых манерах і паводзіцца выхавана і адмыслова. Ну што з таго, што паэт у прыліве эмоцый перабраў у пачуццях ці зрабіў слоўную *перадазіроўку* ў пікантна-інтымных момантах?! Парадысту трэба быць вышэй і, як кажуць, не ўскладняць і без таго распаленую сітуацыю. Адыграцца тонкім густам на тоўстых абставінах — вышэйшы клас майстроў гэтага жанру. У А. Зэкава не заўсёды на падобнае хапае вытрымкі, бо, чытаючы пародыі "На скразняку" на верш Р. Баравіковай, "Хто каго?" на Т. Барысюк, "Два ранеты" на М. Башлакова, "Так, гэтак і дагары" на Л. Паўлікаву, "Вечарам і раніцай" на Г. Бураўкіна, "Не раўнуй" на П. Вераб'ёва, "Душа-самасёл" на Л. Пранчака, у мяне, як у чытача, застаецца пачуццё няёмкасці...

Аднак іскрамётнага і пазітыўнага ў кніжцы нашмат больш. Асабіста мне падаліся несумненнымі ўдачамі і ўзорнымі такія пародыі Анатоля Зэкава, як "Агульная млявасць" на Н. Гальпяровіча, "Зэльвенскі класік" на Ю. Голуба, "Кнігі і гарэлка" на Л. Дайнеку, "Балотнае каханне" на У. Дзюбу, "Стомленасць парыжанкамі" на Л. Дранько-Майсюка, "Мемуары ці вершы?" на С. Каробкіну, "Калі ажыла душа..." на А. Каско, "На які ляд?" на В. Кунцэвіча, "Сто" і "дзвесце" на Я. Лайкова, "Не дай загінуць" на У. Мазго, "Адцвіла вясна" на У. Пецюкевіча, "Нябесны раўнівец" на А. Пісарыка, "Слых на ліфт" на В. Русілку, "Пад жончыным кантролем" на Р. Тармолу-Мірскага... Як бачым, даволі аб'ёмны спіс для невялікага зборніка. Думаецца, пералічаныя паэты павінны быць удзячны таленавітаму парадысту за бясплатную рэкламу сваёй творчасці.

У адной з пародый А. Зэкава на вершаваныя радкі М. Дуксы (*"Паэт — як той пад купалам цыркач"*) такі зачын:

Паэт —
не проста творца,
ён — цыркач.

Дык вось, мне хацелася б, каб у творчасці самога парадыста ўсё было якраз наадварот, таму я з яго дазволу перафразую працытаваныя радкі так:

Паэт —
ён не цыркач,
а проста — творца.

Бо і сам парадыст, не будзем забываць, найперш і па вялікім рахунку — **паэт**.

У аб'ёмнай кніжцы У. Новікава "Книга о пародии" (Масква, "Советский писатель", 1989) у раздзеле "Годнасць жанру" ёсць такія словы: *"Як і творы любога іншага жанру, пародыі бываюць рознай мастацкай якасці, але так як пародыя ўскладае на сябе права крытыкаваць любыя жанры, у тым ліку аўтарытэтныя, то і на яе самую нярэдка кідаюцца прыдзірлівыя позіркі: маўляў, на сябе паглядзі. І яна глядзіць — з той жа строгасцю і ўчэпістасцю. Пэўны доказ таму — існаванне пародый на пародыі і пародый на парадыстаў"*.

Ёсць падобная *стрэмка* і ў гэтай кніжцы. Называецца яна "Парадыст — парадысту". Уладзімір Ермалаеў у адной сваёй пародыі выказаўся так:

"Як Зэкаў, я не напішу,
таму й пішу, як Ермалаеў".

Далёка не адкладваючы, Анатоль Зэкаў даволі бліскуча яму адказаў:

Няўцям мне, Воўка Ермалаеў,
Хоць гэта, зрэшты, не бяда,
Ці пахваліў ты, ці палаяў,
Адно ўжо добра, што згадаў.
Такая ў нас з табой літніша:
Паэтаў пляжым ад душы.
Калі ж, як Зэкаў не напішаш —
Тады на Зэкава пішы.
Скубі, як іншых, гэтаксама —
З мяне карона не зляціць.
Гатоў табе я за рэкламу
Звыш ганарара прыплаціць...

На тым і я пагаджуся. Як у народзе кажуць: жыць сталі лепей — жыць стала весялей. У літаратуры — таксама. Пэўна, і Зэкаву дзякуючы. Нездарма ў ЛеГАЛа і гэты артыкул на яго "антылітаратурную" дзейнасць знайшоўся... Да пажыццёвага тэрміну творчых работ наш парадыст падпадае...

ЛеГАЛ

Любоў ФІЛІМОНАВА

Цыкл вершаў «Настальгія»

* * *

Вечар, — чакай, ліхтары не гасі, —
Я яшчэ сябра свайго не сустрэла.
Мчаць пагашаныя таксі,
У белых промнях месяца — белыя.

То імжа вакол,
а то вецер ды снег.
Крокі, ды крокі...
Не зразумець — ці то сябар, ці не —
Твой, ці не твой сілуэт на сцяне, —
Цёмна навокал.

Як пазнаць цябе па вачах?
Столькі гадоў не сустракаліся.
Кроплі дажджу б'юць па плячах.
Зоры за хмары даўно схаваліся.

Толькі сэрца бачыць далей.
Нават цемра яго не ашуквае.
Ды і словам не скажаш гучней,
Што марзянка крокаў адстуквае.

Рытмам,
падобным да рытму сэрца.
А што нам патрэбна?
Любоў, дабрыня.
Каб кожны ў халодны вечар
сагрэўся,
І сябра за плечы ціха абняў...

Ды там, за спіною —
чый гэты крок? —
Пырснула выбухам шкло ліхтарнае.
Чый гэты набалелы ўскрык?
Мкне, як тарпеда,
машына пажарная.

Я адчуваю, — стаіш за спіной,
І ўсміхаешся цёпла ў патыліцу.
Сябар доўгачаканы мой.
(Сэрца — яно ніколі не мыліцца).

Што нам нашы з табой гады!?
І цяпер, у пару снегападу адчайнага —
Мы збяжым з табой ад усіх,
як "тады" —
Ад кантралёра трамвайнага...

Дух горада

Калі сонца хаваецца за небакрай,
І чырвонае золата праз гарызонт
праліваецца —
Можа, якраз там і месціцца
памянёны рай
(Ці яшчэ як яно называецца)?

Дзе няма нас — заўсёды там
лепшым здаецца жыццё.
Ну а тут — гарадскія вуліцы
ноччу такія цёмныя!
І калі нехта ззаду сунецца
вараннём, —
Так і карціць адразу кінуцца
наўцёкі.

І варушацца вусны:
"Дух горада, уратуй!
Правядзі скразнымі дварамі
на вуліцу людную"..
Кажуць — калі яго пазавеш —
аб'яўляецца гэты Дух
Ціха-ціха. І сіла ў яго —магутная.

З дапамогай прыходзіць, дальбог,
не да кожнага ён.
Абаронца і вартавы толькі тых,
хто сэрцам чысты
і думкамі светлы,
Дух горада — выратавальнік-анёл
Нібы вецер крылаты,
і нібы ўсмешка — ветлы.

Цішыня яго — добрая,
цемната — аксаміт.
Дзе ў калодзежах мінскіх дваroў
ён звычайна месціцца?
Можа, ён хаваецца між людзьмі?
Можа, ён паяўляецца толькі
ў промнях бліскучага месяца?

Яго воля — прызнаць цябе,
ці не прызнаць.
Дух горада — гэта добры знак
і прыкмета адметная!
І каштаны і клёны
пра яго аддана маўчаць,
Бо Дух горада —
таямніца яго запаветная.

У паддашшах варушацца
шызыя галубы.
З ім у змове, — да ранку
вуркочуць — яму спавядаюцца.
Лёгкім ветрыкам круціцца
ён вакол тваёй галавы,
Да шчакі тваёй каштанавай
дакранаецца.

І калі часамі здаецца —
яго не чуваць,
Я прашу — прабяжы ціхім крокам,
як рэхам, па бруку чырвонаму.
Дай цябе як старога знаёмага
павітаць.
Дай сказаць табе слова —
старому знаёмаму.

І калі мы ўсе пойдзем, хто — ў пекла,
а хто (калі пашанцуе) — у рай
За грахі нашы вечныя, тут,
на зямлі не прызнаныя, —
Дух Горада — не памірай,
Сваю вечную музыку
ў промнях грай —
Па законах прыроды,
паводле наканаванага.

Як і чырвоныя клёны
колеру нашай крыві —
Ты — усе грахі нашы перажыві.
І выбачай неразумных нас, выбачай.
Дух горада,
Не знікай!



Максім ШНЯК

Максім Шняк нарадзіўся ў 1985 годзе ў вёсцы Маскалёнкі Віцебскай вобласці. Скончыў школу-інтэрнат па музыцы і выяўленчым мастацтве імя І. В. Ахрэмчыка. Студэнт чацвёртага курса БДАМ факультэта дызайну і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва спецыяльнасці "Мастацкая апрацоўка вырабаў з металу". Жыве ў пасёлку Міханавічы Мінскай вобласці.

* * *

Адзіны вецер,
Які без смецця,
На Беларусі
Туліцца мусіць,
Бо недарэмна
Ў сутарэннях
Пустога голля
Дзіцём скуголіць,
Невыпадкова
Гукае Бога
Шораз нанова
Па ўсіх дарогах,
Нібыта хворы...
Па чыстых болках
Выводзіць творы
Сваім алоўкам.
І вечар цэлы
Ў вышынях самых
З нябеснай цэглы
Будуе храмы.
І толькі вецер,
Які без смерці,
У Беларусі
Жыве, клянуся...

* * *

Нас нараджае чарговая восень:
Лісце ахвярамі падае вобзем

Здзек —
нарадзіцца ў першым тумане
Ўвосень, калі памірае каханне.

Чуеш ва ўсім прыхаваныя енкі?
Восень —
чароўная й злая паненка.

Ёдка, калі цябе восень народзіць,
Мець унутры
Бога і не знаходзіць.

* * *

Восень рэжа пярсцёнак
з бурштыну
Згодна ўласнай
язычніцкай модзе.
І ў аскепках хавае сцяжыны,
Але мы іх, напэўна, не знойдзем.

Як не знойдзе і восень збавення
У сваёй далікатнай рабоце...
Жаль пануе ў яе сутарэннях,
Але мы іх ніколі не знойдзем.

* * *

Ёсць гэткі знак:
Ты — недзе там,
Я — проста так.

Ёсць вера, тая,
Што па дне
Слізгае.

Ёсць рэчаіснасць:
Без цябе
Не ўчапіцца.

* * *

Схілі галоўку...
Пачуеш толькі
Як абсыпаюцца
Імгненні раніцы
Бліскучым срэбрам
У сэрца цэбар
Схілі галоўку...
Ніводным слоўкам
Не варухніся
І падзівіся
Як фарбы раніцы
Бы тыя красачкі
Ужо чапляюцца
За твае пасмачкі
Раскрый далоньку...
Убачыш толькі
Аскепкі шкельца
Ў жменьцы
Бавіцца
З табою раніца



Фота Кастуся Дробава

Алесь ПІСЬМЯНКОЎ

* * *

Зялёныя травы пажухлымі сталі,
І цёмнаю
светлая стала вада,
І дзікія гусі
расстайна крычалі,
Нібыта іх гнала якая бяда.
Іх крык усю ноч
над зямлёю насіла,
І сын мой маленькі
не змружыў павек,
Ён раптам ціхенька
спытаўся пра крылы:
— Тата,
дзе крылы падзеў чалавек?
Я доўга маўчаў вінавата,
Пакуль не прыдумаў
банальны адказ...
А гусі расстайна крычалі над хатай,
Кружылі і клікалі нас.

Галіна ДАШКЕВІЧ

Жанчына ў чорным

Ў маім найласкавейшым краі,
Жытнёвым і зорным,
Часцей і часцей сустракаю
Жанчыну у чорным.

Чарнобыльскай даўняй тугою
Зажураны вочы.
Вядзьмарка-нядоля над ёю
Скуголіць-рагоча.

Мне стронцыю лютая сцюжа
Рве сэрца на часткі.
Каго пахавала ты — мужа?
А можа, дзіцятка?

Спляліся бяда і пракляцце
Ў сумесным хаўрусе.
У чым вінаватыя маці
Маёй Беларусі?

Прырода зямлю аздабляе
Красой бездакорнай,
І ўсё ж, як дакор, выступае
Жанчына у чорным.

Мікола МЯТЛІЦКІ

Перапёлка

У краі маім, дзе маркоцце сну,
Дзе ветру у росах золка,
Жыта шукае якую вясну
І не знаходзіць ніяк
Перапёлка.

То смутна кінецца ў бок адзін,
То ў бок другі скіруе лёт —
Толькі быльнёг,
Толькі палын,
Толькі калючы іржавы дрот.

Сядзе змарнела на куст лазы,
Так не знайшоўшы нічога.
Скоціцца зыркая іскра слязы
З вочка яе малога.

Выблісне яра над вёскай зара,
Ўзрушыцца голас грому.
Так і лятае,
Сваё "жаць пара"
Не абраніўшы нікому.

Ірэса

Апавяданне

Міхась КАРПЕЧАНКА

— Ну што, малец, даіграўся? — участковы інспектар міліцыі, якога ўсе вяскоўцы называлі пасвойску, Віктаравічам, працяў белагаловага падлетка пагрозлівым позіркам. Напалоханы хлопчык, нібыта бусляня перад першым сваім вылетам з гнязда, нерашуча ператупваў з нагі на нагу, стоячы ля дзвярэй сельсавецкага кабінета, у якім атабарыўся міліцэйскі апорны пункт. — Коля, я чакаю твайго прызнання.

— Не браў я гадзінніка! Не браў...

Хлопчык цяжка, стомлена ўздыхнуў, працяжна шморгнуў носам. Яго сумныя вочы напоўніліся слязьмі — ад крыўды, ад жалю да сябе. І ад несправядлівасці. Здавалася, яшчэ хвіліна — і яны пераспелым гарохам пырснуць з-пад яго пачырванелых вейкаў.

— А ў маю хату хто заходзіў? — да Колі падскочыў стараваты недамерак у лапленым на локцях пінжачку. Ён дагэтуль моўчкі сядзеў на лаве і, натапырыўшы вуха, уважліва лавіў кожнае міліцыянерава слова. Гэта і быў пацярпелы, Мітрафан Сямёнавіч, альбо па-вулічнаму — Сэпсель.

Учора ў яго знік кішэнны гадзіннік. Мітрафан Сямёнавіч чамусьці быў упэўнены, што паквапіўся на яго менавіта Коля Яўсееў.

Дагэтуль Мітрафан не ўмешваўся ў допыт. Сядзеў і пазіраў. Але Сэпселева цярпенне, мабыць, скончылася.

— Ты яго ўкраў. Па вачах тваіх бессаромных бачу...

— Ды не браў я, дзядзька, вашага гадзінніка! — адчайна і ўжо неяк раўнадушна адказаў падлетак. — Не браў...

Коля не ведаў, як даказаць вось гэтаму Сэпселю, участковаму, бацькам, што не ён украў той злашчасны гадзіннік. Як давесці ім сваю невінаватасць? Яму ніхто не хацеў верыць. Ад гэтага і пакутаваў. Сам ён ужо страчваў надзею на тое, што міліцыянер Віктаравіч разбярэцца, зразумее, што ён невінаваты.

Учора ўвечары, вярнуўшыся разам з маці з чарговага допыту, Коля адразу ж паваліўся на ложак, схаваўся з галавою пад коўдру. Ляжаў, задыхаючыся ад недахопу паветра, задушлівай спёкі, безвыходнасці. Думкі набягалі адна на адну, змяяліся ў бясконцы вірлівы клубок. Вочы не прасыхалі ад слёз. І пад самую раніцу Колю падумалася: мабыць, трэба ўкрасці ў бацькоў грошай ды набыць у райцэнтры такі ж самы гадзіннік і вярнуць яго Сэпселю. Сказаць, што ўкраў і цяпер, адумаўшыся, вяртае ўкрадзенае. Тады ён, і сапраўды, стане тым, за каго яго прымаюць. Усім будзе зразумела: Коля Яўсееў — злодзей... Яшчэ хлопчыка да слёз крыўдзіў недавер маці. І яна, такая добрая і спагадлівая, разумная і справядлівая, чамусьці перастала верыць яму. Просіць прызнацца ў тым, чаго ён не рабіў, угаворвае вярнуць гадзіннік.

— Сыночак, — і сёння раніцою, прысеўшы на краёчак ложка, зноўку завяла сваё. — Я сварыцца не буду. І з бацькам пагавару. Толькі прызнайся і вярні той гадзіннік... Каб ён спрах!

— Я не краў! — застагнаў Коля і паспяшаўся схаваць свае слёзы ў падушку.

...Страшна, калі табе ніхто не хоча верыць. Крыўдна і балюча. Колю здавалася, што ўсе цяпер звяртаюць на яго ўвагу, усе торкаюць пальцамі: "Вунь, паглядзіце, злодзей ідзе!.."

Злодзей!..

— Ты, Віктаравіч, толькі прыгледзься да яго, — пырскнуў слінай, засіпеў Сэпсель. — Закончаны зладзюган! Турма па ім слёзы пралівае. Зірні... Зірні, як сваімі бялкамі, нягоднік, варочае. На жаласць нашу, паразіт, націскае.

Мітрафан Сямёнавіч зморшчыў азызлы, з адвіслай, як у надарванага каня, губою твар і нечакана ўчапіўся кручкаватымі пальцамі ў Коліна вуха. Хлопчык закрычаў ад болю і ад крыўды, і толькі цяпер заплакаў. Голасна. Наўзрыд. Захліпаючыся.

Аднак Сэпсель не спяшаўся выпускаць вуха са сваіх кашчавых пальцаў. Дыхаючы перагарам, ён каршуном навіс над падлеткам і гугнявіў прама ў твар:

— Ты — злодзей, і няма чаго тут аднекваццa. Ці не ты заходзіў у маю хату? Мо, памыляюся? Скажы, скажы міліцыянеру!

— Ну, было... Заходзіў... — глытаючы разам з горкімі слязьмі словы, неахвотна прамовіў Коля. — Я заходзіў у хату. Толькі гадзінніка не бачыў, не браў... Што мне зрабіць, каб вы паверылі?

— Прызнацца і вярнуць украдзенае... Самому прынесці, а не чакаць, калі цябе прымусяць гэта зрабіць, — усё яшчэ накручваючы Коліна вуха, гундосіў ашалелы Сэпсель. — Пакаяцца на ўсё сваё далейшае жыццё...

Нарэшце не стрываў участковы і адагнаў Мітрафана Сямёнавіча ад хлопчыка. Сэпсель з неахвотаю вымушаны быў падпарадкавацца. А міліцыянер, нагнаўшы на твар прытворную глыбокую заклапочанасць, няспешна пачаў хадзіць туды-сюды па вузкім кабінеціку.

— Я табе, Яўсееў, не вораг. Зразумей, — выразна і гучна вымаўляючы кожнае слова, пачаў казаць Віктаравіч. Нібыта кідаў у хлопчыка цяжкімі камянямі. — Дабра жадаю табе, Коля, а таму і раю: лепей прызнайся сам. Вярні гадзіннік. І мы ўсе ўтрох забудземся на гэта непрыемнае, так бы мовіць, здарэнне. З кім чаго не здараецца? У адваротным выпадку, Яўсееў, Мітрафан Сямёнавіч, — участковы спыніўся перад Сэпселем, паляпаў указальным пальцам па стале, — напіша заяву. А тады, сам разумееш, не маленькі ўжо... Скажу без хітрыкаў: будзе ўзбуджана крымінальная справа. У спецшколу ці, таго горш, у калонію, прамой дарогай загрыміш. Вось такая, брат, перспектыва чакае. Прызнавайся шчыра, чыстасардэчна.

Коля маўчаў, бы вады ў рот набраўшы. Прызнавацца ў тым, чаго не рабіў, ён не хацеў. А як давесці сваю невінаватасць, гэтага хлопчык таксама яшчэ не ведаў. Нечакана міліцыянер схапіў хлопчыка за падбародак, рэзка ўзняў яго галаву:

— Глядзець у вочы! У вочы — я сказаў! Куды схаваў гадзіннік? Каму аддаў? Хто цябе навуськаў залезці ў чужую хату?

Коля не хаваў погляду, не адводзіў вочы ад пякуча-пранізлівага позірку ўчастковага. Згадка пра калонію яго моцна напалохала. Але ж і гадзінніка ён не браў.

— Можа, дзядзька, напіўшыся, сам і згубіў яго, — Коля з надзеяй прамовіў гэтыя выратавальныя для сябе словы, якія зусім нечакана і, здаецца, самі па сабе саскочылі з языка.

— Ах ты шчанюк! — зароў Сэпсель і кінуўся да хлопчыка. Ён зноў пацягнуўся рукой да прыкметна паружавелага Колінага вуха.

— Сесці! — загадаў Мітрафану Сямёнавічу міліцыянер і рэзкім узмахам рукі, бы сабаку, адагнаў яго ад падлетка. Той, надзіва паслухмяна патрухаў на сваё месца.

— У хату я заходзіў, — абрадаваўшыся раптоўнай змене настрою ўчастковага, пачаў хуценька, блытаючыся ў словах, тлумачыць хлопчык. — Шукаў Віцьку... Дзядзькавага ўнука. Дома ў іх нікога не было, і я тут жа выйшаў на вуліцу. Гадзінніка не браў і ў вочы яго нават не бачыў. Чэснае слова. Паверце мне!

Коля зноўку заліўся буйнымі слязамі.

Участковы задумаўся. Упартасць, з якой трымаўся Яўсееў, не раз наводзіла яго на думку, што крадзёж гадзінніка — не Коліных рук справа. Аднак, каб давесці яго невінаватасць, патрэбен хоць бы адзін канкрэтны факт, хоць бы зачэпка якая-небудзь. На жаль, так ужо здарылася, што ўсе абставіны тут склаліся выключна не на карысць падлетка. Самае непрыемнае, што пранырлівы Мітрафан Сямёнавіч нюхам адчуў такі расклад. А свайго ён ніколі не ўпусціць, спатрэбіцца — з чужога рота выцягне. Такую рысу нахабнага пенсіянера ўчастковы добра ведаў.

Міліцыянера вельмі непакоіла, нават — бянтэжыла, злавала, яшчэ і тое, што гэта здарэнне, лічы, зусім дробязнае, нязначнае, можа сур'ёзна адбіцца на яго кар'еры. Літаральна пару дзён таму ўчастковаму пэўна паабяцалі, што восенню яго перавядуць у следчыя, куды ён імкнуўся з усіх сіл апошнія пяць гадоў. Праўда, начальнік райаддзела міліцыі паставіў адзіную ўмову: на участку, які абслугоўвае Віктаравіч, да канца лета не павінна здарыцца аніводнага правапарушэння і злачынства.

І вось гэты ўпарты смаркач можа ўсё перакрэсліць.

Тады і надалей працуй тут, у вёсцы! Чакай, калі яшчэ раз надарыцца такая мажлівасць. І ці будзе яна наогул? А час бяжыць, птушкаю ляціць. Яго не затрымаеш, не зацісneш у кулаку... На пацёртым крэсле нецярпліва заёрзаў Сэпсель.

— Віктаравіч, канчай пустую балбатню, — загугнявіў Мітрафан Сямёнавіч. — Я, звычайны калгасны пенсіянер, пастух, і то раскусіў яго з першага слова. А ты, прафесіянал, чамусьці другі дзень ката за хвост цягаеш. Усё ж ясна і зразумела. Тут, Віктаравіч, як ты не круціся, а каленкі заўсёды сперады будуць. Слухай сюды, падумалася раптам: можа, выгарадзіць яго стараешся?

— Я абавязаны дакладна разабрацца...

— Ну, капітан, гэта выключна твае праблемы, — па складах прамовіў Сэпсель. — А мне патрэбен толькі мой гадзіннік. І — кропка. Мітрафан Сямёнавіч памаўчаў, потым выразна паглядзеў на ўчастковага і як бы між іншым сказаў:

— Старая камандзіруе ў горад. Сёе-тое па гаспадарцы прыдбаць трэба. Дык я заадно і ў райаддзел ужо забягу, заяву напішу... Ты не сярдуй, Віктаравіч, на старога. Зразумей, маё мне дорага, бо крывавым мазалём нажывалася, па капейцы вось гэтымі рукамі зарабляла, — Сэпсель выставіў перад участковым свае вечна каравыя далоні і для пераканання яшчэ патрос імі. — Ведаеш што, разбірайся тут сам, а я пацягнуся дахаты. Позна ўжо, дый Пятроўна мая, мусіць, хвалюецца, перажывае...

Участковы не тое, каб спалохаўся празрыстага намёку Мітрафана Сямёнавіча... Але на плячах некалькі кропелек халоднага поту ўсё ж такі скруціліся ў ручаёк і паволі сплылі па спіне. І нешта такое раптам навалілася на міліцыянера.

Пацямнела ў вачах, і злосць, якая паволі закіпала на сэрцы, цяпер гейзерам выплеснулася вонкі. Віктаравіч адарваў Колю ад падлогі і павалок да дзвярэй. Прыадчыніўшы іх, ён сілком пацягнуў маленькую потную далоньку хлопчыка ў расшчэліну.

— Зараз ты мне ўсё выкладзеш, — сарваўся на крык участковы.

— Не краў я! — на ўсю моц голаса выгукнуў Коля. — Хоць забіце тут!

І — замаўчаў.

Жудасны крык падлетка і вусцішная цішыня імгненна астудзілі Віктаравіча — яго быццам халоднай вадой акацілі. "Што я раблю?!" — ледзь не прамовіў уголас участковы.

Ён асцярожна падвёў абвялага хлопчыка да стала, лёгенька штурхануў яго на канапку. Глянуў на Мітрафана Сямёнавіча. Той ад нечаканасці ажно адкапыліў абслінёныя губы.

"Яшчэ гэтага не хапала, — супакойваючыся, падумаў міліцыянер. —Сэпселю такі падаруначак зрабіў".

— Ну, што, Коля? — неяк стомлена і абыякава запытаўся Віктаравіч. Хлопчык хацеў штосьці сказаць, але толькі заікаўся. Участковы здагадаўся паднесці яму шклянку з вадой. Дрыжачымі рукамі Коля пацягнуўся да яе. Брыж стукаўся аб яго зубы, і вада буйнымі кроплямі білася аб стол.

— Не браў я... Чэсна...

Участковы цяжка ўздыхнуў.

— Вывеў ты мяне, Яўсееў. Проста — дастаў!

Міліцыянер кінуў вінаваты позірк на падлетка, праз сілу паспрабаваў усміхнуцца.

— Не трымай злосці, Коля. Чаго толькі не здараецца сярод нас, мужчын. Добра?

Коля, не адымаючы шклянкі ад вуснаў, заківаў галавой.

— Віктаравіч, — занервавaўся Сэпсель. — Штосьці я ў гэтым тваім шахер-махеры зусім нічога не петру... А мой гадзіннік?

— Загляну да Яўсеевых... Можа, яны пагодзяцца кампенсаваць... Грошай табе дадуць. Колькі заплаціў за гадзіннік?

— І ланцужок, дарэчы, не з неба звaліўся... Слухай сюды, а калі заўпарцяцца? Яўсеевы ж, ведаеш, не такія, а такоўскія: хоць і галодныя, але есці без перцу не стануць.

— Тады напішаш заяву... Ты калі, Сямёнавіч, збіраешся ў горад?

— Заўтра. Уранні Пятроўна выпне з хаты.

— Сёння ўвечары скажу, што рашылі Яўсеевы.

— А хлопца, Віктаравіч, трэба пакараць. Правучыць трэба. Для парадку, — адразу павесялеў Мітрафан Сямёнавіч. — На ўлік вазьмі, дырэктару школы паведамі... У раёнку заметку ціскані. Хай усе ведаюць. Добрая навука будзе. Яму і ўсім такім самым падшываенцам. Глядзіш, ад большага злачынства выратуем. І гэты, Яўсееў, можа, дзякуй яшчэ нам з табой не раз скажа.

Мітрафан Сямёнавіч пачухаў патыліцу, стомлена павалокся да дзвярэй. Пастаяў каля парога і, як бы ўспомніўшы, што не сказаў, магчыма, самага галоўнага, вярнуўся да стала, за які прысеў участковы.

— Думаеш, Віктаравіч, я жмідзіна несусветная? Паразіт такі? Пляваў я з высокай вежы на гадзіннік, на грошы... Цьфу на іх. Пыл усё гэта. Зразумей сваёй даўбешкай: для мяне важна прынцып захаваць. Прынцып непазбежнасці пакарання. Сёння ён сцібрыў гадзіннік. Ты, добранькі такі міліцыянер, выручыў яго. За злачынства бацькі разлічацца. А ён, вядома ж, парадуецца — пранесла. І заўтра абавязкова ў магазін залезе ці дом нечы абчысціць. І зноў жаласнікі знойдуцца: малы, скажуць, неразумны яшчэ. Горкае дзіця... А паслязаўтра гэты недаростак возьме ў рукі нож і па горле паласне... Некаму. Скажам, сыну твайму. "Прагледзелі!" — залямантуем тады ўсе ў адзін голас. Так, прагледзелі, упусцілі. І ўсё таму, што добранькімі хочам быць, пакрыўдзіць баімся, што заплюшчылі сёння вочы на вось гэта яго злачынства. Дробязнае, але — злачынства. А Яўсееў, павер мне на слова, паспеў ужо змікіціць: яму ўсё можна і ўсё дазволена. Раблю, што ў галаву стукне.

...Коля нізка апусціў галаву, уціснуў вочы ў даўно нямытую падлогу, задумаўся. Яму казалі — настаўнікі ў школе, бацькі — дома, што ўсе людзі добрыя, справядлівыя, міласэрныя, памяркоўныя, спагадлівыя. І ён да ўчарашняга дня шчыра, без каліва сумнення, верыў у гэта. Верыў, пакуль не сутыкнуўся з жорсткай несправядлівасцю. "Калі ўсе людзі добрыя, — разважаў хлопчык, — чаму такія жорсткія, злыя гэты Сэпсель, участковы?.. Чаму яны не хочуць разабрацца, не могуць паверыць яму? Чаму яны, дарослыя, не здольныя адрозніць праўду ад маны? Няхай Сэпсель адпіў свой розум... Але ж Віктаравіч — не роўня яму. А выходзіць — абодва аднолькавыя..."

Раптам прыпомнілася Колю, як яшчэ заўчора ўчастковы, сустрэўшы на вуліцы яго з маці, калі яны вярталіся з лесу, несучы паўнюткае вядро першых чарніц, нечакана ўскудлаціў яму чупрыну і пахваліў:

— Добры хлопец у цябе, Піліпаўна, расце. Не лайдак, бачу, і не хуліган. Клопату з ім аніякага.

Цяпер і клопат з'явіўся, і Коля злодзеем зрабіўся.

І Сэпсель, прыгадалася хлопчыку, раней туды ж гнуў: як перакуліць, здаралася, у бацькавай хаце дармавую чарку гарэлкі, заўсёды яго, Колю, нахвальваў. І спакойны, і паслухмяны. Не роўня яго ўнуку Віцьку...

Дзе ж праўда і справядлівасць? Калі яны, Сэпсель, міліцыянер, былі шчырымі — месяц назад, пазаўчора ці цяпер? Не мог гэтага аніяк зразумець Коля. Як падмянілі іх.

Яны зрабілі сваю справу — вывелі злодзея на чыстую ваду. А як пасля гэтага жыць самому Колю? Ён жа ведае, што не краў, што не злодзей... Адкуль яму ўзяць сілы, дзе набрацца нахабства, каб жыць з такім пякучым сорамам? Як цяпер яму гуляць з сябрамі, як глядзець у вочы бацьку, маці, настаўнікам? Хоць ты праз зямлю праваліся!

...Участковы сам завёў Колю дахаты. Хлопчык адразу ж паваліўся на канапу і адсутна глядзеў у столь, выбраўшы на адной з яе дошчачак жоўта-смаліsты сучок. Яму ўжо было зусім нецікава, аб чым гаворыць у пярэдняй хаце міліцыянер з бацькамі. Нават не прыслухоўваўся — Колю не хацелася жыць.

У той жа вечар Яўсеевы праз участковага вярнулі Сэпселю грошы за гадзіннік і ланцужок. Для Мітрафана Сямёнавіча гэта стала важкім доказам таго, што ён не памыліўся наконт злодзея. Яшчэ колькі дзён, кульнуўшы зранку на ганку магазіна паўлітэрку таннага віна, ён стараўся давесці кожнаму стрэчнаму-папярэчнаму:

— Бач ты, а гэта Яўсеевых падшываенец мой гадзіннік сціbрыў. — Сэпсель пры гэтым дэманстраваў абрывак жоўтага ланцужка, што мацаваўся да пятлі яго зашмальцаванага пінжачка. — Заскочыў, паразіт, у хату, а я ў той час, на печы прылёгшы, задрамаў. Па-жывому, нягоднік, адарваў... Каб невінаваты быў, гэтыя Яўсеевы ніколі б грошы мне не вярнулі...

Ахвочых слухаць Сэпселеву балбатню станавілася ўсё меней. А неўзабаве, калі з хаты ў хату праляцела навіна, што Коля раптоўна захварэў на падучку і знаходзіцца цяпер у абласной бальніцы, размоў з Мітрафанам Сямёнавічам наогул пазбягалі. А сёй-той з вяскоўцаў сцвярджаў, што хлопчык захварэў на эпілепсію, як нібыта вызначылі дактары, ад перажыванняў за ўзведзеную на яго Сэпселем напрасліну.

Так яно ці не, канечне, адному толькі Богу вядома.

Увосень нечакана знайшоўся і скрадзены ў Сэпселя гадзіннік. Каля калгаснага цялятніка, які будаўнікі збіраліся пашыраць, стаялі з вясны самаробныя трактарныя сані. На іх зімою звозяць да фермы сена, салому. Скранулі мужчыны з месца гэтыя сані, і ў пажоўклай, ніцай, ужо нежывой, траве заўважылі бліскучы круглячок з абарваным ланцужком. Тут і ўспомнілі пра Колю, Мітрафана Сямёнавіча. Усе пагадзіліся на адным варыянце: улетку п'яны Сэпсель заснуў на санях, а гадзіннік, вываліўшыся з кішэні, адарваўся і праз шчыліну зляцеў на зямлю. Хтосьці з мужчын кінуўся шукаць участковага, нехта падаўся ў краму, дзе звычайна ў чаканні дармавога глыка спіртнога кожны дзень аціраўся Мітрафан Сямёнавіч.

Першым з'явіўся Віктаравіч. Паклаўшы на далоню знойдзены гадзіннік, ён прыкмеціў на вечку яго пляміны бурай іржы. Участковы пацёр яе пальцам. Іржа, хоць і неахвотна, але пачала скручвацца ў рудыя камячкі гразі, аддзяляцца ад металу.

"Вось каб можна было... — падумаў міліцыянер, згледзеўшы на дарозе некалькі мужчын, сярод якіх, па-зладзейску азіраючыся, неахвотна валокся і Мітрафан Сямёнавіч, — каб можна было гэтак жа сцерці іржу і са сваёй душы..."

Арт-пацеркі

Вакальная група "Камерата", адзін з сусветна прызнаных калектываў Беларускай дзяржаўнай філармоніі, адзначае сёлета свой юбілей. Ансамбль, створаны 20 гадоў таму Алегам Шыкуновым, у 1995-м узначаліў удзельнік "Камераты" Ігар Мельнікаў. Мастацтва гэтага калектыву, без перабольшвання, унікальнае: віртуознае валоданне голасам дазваляе вакалістам выкарыстоўваць шырокі спектр тэмбраў і выканальніцкай тэхнікі — ад бельканта да блюза, пераймаць гучанне самых розных інструментаў; жывыя акапэльныя спевы арганічна спалучаюцца з электроннай апрацоўкай галасоў. І арыгінальны рэпертуар, які ўключае элементы ці не ўсіх музычных стыляў, і аранжыроўкі пішуцца самімі ўдзельнікамі ансамбля. "Камерата" выступае на айчынных і замежных фестывалях як фальклорны і джазавы ансамбль.

Іван Дмухайла, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі, кавалер украінскага ордэна за заслугі, — родам з Украіны. Прафесію жывапісца набыў у Днепрапятроўскім мастацкім вучылішчы. 60 гадоў ён пражыў у Беларусі. Гэта было светлае, напоўненае творчасцю і натхнёнай працай, жыццё. Сотні лірычных пейзажаў, сотні нацюрмортаў, прасякнутых шчырым настроем, напісаў І. Дмухайла. Многія захоўваюцца ў музеях Беларусі, у тым ліку ў Нацыянальным мастацкім, у музейных і прыватных зборах Бельгіі, Вялікабрытаніі, Германіі, Італіі, Канады, Кітая, Расіі, Украіны, Швейцарыі ды іншых краін. Да 21 красавіка ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі разгорнута выстаўка работ І. Дмухайлы.

Нацыянальны мастацкі музей Беларусі разам са сваім генеральным партнёрам ІП "Брытыш-Амерыкан Табака Трэйдзінг Компані" абвясцілі пачатак чацвёртага штогадовага конкурсу для дызайнераў. Прафесіяналы, студэнты ВНУ мастацкага профілю, а таксама ўсе ахвочыя могуць спрычыніцца да ўжо традыцыйнага спаборніцтва, мэта якога — стварэнне новага відарысу білета ў гэты музей. Яго кіраўніцтва лічыць уваходны квіток візітоўкай сваёй установы, таму і з'явілася ідэя штогод мяняць дызайн білета, шляхам конкурсу адбіраць для яго новае і арыгінальнае вырашэнне, у той жа час адпаведнае статусу галоўнай мастацкай скарбніцы краіны. Да 29 красавіка будуць прымацца заяўкі ад удзельнікаў, якія затым абмяркуе конкурснае журы (у ім — супрацоўнікі музея, вядомыя беларускія дызайнеры і мастакі, выкладчыкі гуманітарных і мастацкіх ВНУ, прадстаўнікі бізнесу). А ў фае музея з 30 красавіка па 7 мая разгорнецца выстаўка конкурсных работ і наведнікі змогуць прагаласаваць за свайго кандыдата на атрыманне прыза глядацкіх сімпатый, сума якога — 200 тыс. беларускіх рублёў. А імя пераможцы конкурсу (галоўны прыз складае 1 млн. беларускіх рублёў) назаве журы. Цырымонія ганаравання адбудзецца 7 мая. Білет новага ўзору будзе ўведзены ва ўжытак сёлета ў снежні 2008 — да канца 2009 года.

Падрыхтоўка да здымак фільма "Крапавы берэт", які будзе першым айчынным прыгодніцкім (і маладзёжным) баевіком, пачалася на Нацыянальнай кінастудыі "Беларусьфільм". Сцэнарый "Крапавага берэта" — гісторыі "спецназаўцаў" розных пакаленняў, напісаны Аляксандрам Дзебалюком, — адзначаны 3-й прэміяй у конкурсе на лепшы кінасцэнарый поўнаметражнага мастацкага і тэлевізійнага фільмаў нашай кінастудыі ў 2007 г. Як сааўтар сцэнарыя і рэжысёр выступіць Андрэй Голубеў (летась ён дэбютаваў поўнаметражнай стужкай "Чаклун і Румба"). Мяркуецца, што "Крапавы берэт" будзе закончаны ўжо да канца сёлетняга года.

С. ВЕТКА

Спалучаць несумяшчальнае

Стагоддзямі майстры скульптуры ўвасаблялі ў сваіх творах гістарычныя постаці, ствараючы шэдэўры сусветнай культуры. Сённяшнія мастакі атрымалі неацэнную спадчыну: веды і шматгадовы вопыт папярэднікаў. Чым натхняюць свае таленты майстры XXI стагоддзя, якое месца займае скульптура ў сучасным свеце і што можа чакаць яе ў будучым? Пра гэта мы размаўляем з Віктарам МІНКО — удзельнікам шматлікіх мастацкіх выстаў у Беларусі і за мяжой, аўтарам найцікавейшых скульптурных работ, у ліку якіх — выява першай беларускай радыёпрэміі "Залатое вуха".



Віктар Мінко нарадзіўся ў Смаргоні, вучыўся ў Рэспубліканскай школе-інтэрнаце па музыцы і выяўленчым мастацтве імя Івана Ахрэмчыка, у 1996 годзе скончыў Беларускую дзяржаўную акадэмію мастацтваў.

— Мабыць, доўгі гэта працэс для скульптара: увасабленне задумы твора?

— Першы этап — стварэнне эскіза і мадэлі скульптуры з гліны ці пластыліну. Далей ладкуецца каркас і лепіцца мадэль у задуманым маштабе. Затым — зняцце формы, пасля чаго адліваецца васковы варыянт скульптуры. Апошні этап — таксама ліццё. Выкананне работы ў бронзе адбываецца на ліцейным заводзе. Іншым разам скульптары месяцамі стаяць у чарзе, таму працэс можа зацягнуцца. Калі з ліццём праблем не ўзнікае, дык на работу ідзе 2-3 тыдні. Прытым маленькую скульптуру зрабіць лягчэй. Тут адразу бачныя ўсе прапорцыі. Вялікая скульптура вымагае пільнай праверкі, пастаяннага назірання з розных бакоў, таму што пры стварэнні манументальнай работы важна не страціць кампазіцыю.

— У чым асаблівасці вашых работ?

— Я абраў напрамак сюррэалізму. Мне імпануе творчасць Магрыда, Радэна, Далі. У работах гэтых мастакоў я знаходжу найбольш займальныя моманты і імкнуся пераасэнсаваць іх у скульптуры. Мне цікава спалучаць несумяшчальныя рэчы так, каб гэта выглядала арганічна. Сваёй галоўнай і лепшай скульптурай лічу "Мінатаўра". Гэта першая спроба сюррэалізму ў маёй творчасці. У некаторых работах заўважаецца пэўная "двухаблічнасць". Усе ж людзі маюць два бакі, два твары, адзін з якіх — знешняя маска, а другі — унутраны свет. Выяўленне гэтай "двухаблічнасці" праз творчасць дазваляе прасцей успрымаць жыццё.

Амаль усе мае скульптуры маюць гістарычны характар: "Кентаўр", "Пан", "Сатыр", "Юдзіф", "Турнір" і інш. У іх жыве дух сярэднявечча — эпохі войнаў і рыцарства, і ў той жа час — містыкі, барацьбы святла і цемры. Перш чым рабіць скульптуру, трэба дакладна вывучыць гісторыю персанажа, каб не атрымалася пошла ці камічна.

Першая выстава маіх работ адбылася ў Заслаўі, у гісторыка-культурным музеі-запаведніку, у 1995 г. Было ўсё: і хваляванне, і эйфарыя, і жаданне рэалізаваць уласныя ідэі, ствараючы нешта новае і арыгінальнае. Нядаўна прайшлі выставы ў Маскве і ў Галандыі. Было прыемна, калі мае работы заўважалі. Гэта краіны, дзе адносіны да мастацтва — на больш высокім узроўні.

— Для каго, на вашу думку, творыць мастак?

— У першую чаргу, для сябе і дзеля самавыяўлення. Калі нехта захоча набыць тваю работу, гэта таксама вельмі добра. У наш час скульптура даволі запатрабаваная і актуальная. У Беларусі, як правіла, яе купляюць у падарунак. Для сябе — рэдкі выпадак. Патэнцыйныя пакупнікі вельмі розныя. Скульптура — дарагая рэч, таму не кожны яе набудзе. Аднак дабрабыт народа павышаецца, і людзі далучаюцца да культуры і мастацтва, атуляючы сябе прыгожымі рэчамі. Сёння многія будуюць дамы за горадам, таму замаўляюць скульптуры для ўнутраных дворыкаў. А калі ў чалавека такі твор з'яўляецца ў доме — гэта яшчэ больш прыемна.

— Як вы мяркуеце: ці знойдзецца месца для класічнай скульптуры ў будучыні?

— Мастакі могуць рабіць тое, што захочуць. Сёння ніякіх асабліва новых напрамкаў у мастацтве не вызначаецца, таму, вядома, будзе паварот у бок акадэмізму, а потым адкрыюць нешта новае і гэта стане штуршком да з'яўлення іншых відаў скульптуры.

— Віктар, як чалавек мастацтва вы адчуваеце падтрымку, увагу да сваёй творчасці?

— Мастак сам па сабе інертны ў побытавым плане. Ён увесь у творчасці. Таму няма калі займацца самапрэзентацыяй. Хаця пастаянна праводзяцца выставы, не хапае часу займацца гэтым самому. І яшчэ сапраўды важны фактар — у Беларусі няма такога попыту на скульптуру, як у іншых краінах.

— А чым з'яўляецца скульптура для вас?

— Напэўна, гэта творчая залежнасць. Адзін раз паспрабаваў — і "завязаць" з гэтым цяжка. Скульптура — нешта большае, чым проста мастацкі твор. Гэта адлюстраванне ўнутранага свету мастака, яго поглядаў, фантазіі і адносін да навакольнай будзённасці.

Кацярына ВЯРБІЦКАЯ

На здымках: Віктар Мінко і яго работы.

Казачка вясёлкай расцвіла

На сцэне Беларускага тэатра "Лялька", што ў Віцебску, адбылася прэм'ера спектакля "Кветачка-вясёлка" паводле казкі В. Катаева "Цветик-семицветик". Інсцэніроўка П. Ламана, пастаноўка В. Клімчука, лялькі і сцэнаграфія — Г. і А.Сідаравых, танцы і пластыка — Н. Благадацкіх, кампазітар А.Залётнеў.

У невялікім горадзе, у самым звычайным двары жыла звычайная дзяўчынка Жэня. І вось аднойчы ў яе з'явілася магчымасць ажыццявіць свае самыя запаветныя жаданні... Пазналі казку? Твор Валянціна Катаева пра чарадзейную кветачку добра знаёмы і сучаснай дзятве, нягледзячы на тое, што гэта — казка дзяцінства іх бацькоў. Гісторыя дзяўчынкі Жэні не згубілася сярод прыгод сучасных навамодных герояў. І не толькі дзякуючы прыгожым мультыплікацыйным версіям твора. Але найперш з-за вялікай жыццёвай мудрасці самой казкі.

Напэўна, кожны чытач, у якім бы ўзросце не давялося яму ўпершыню пазнаёміцца з казкай "Кветачка-вясёлка", прымяраў да сябе сюжэт і жыццёвую сітуацыю, у якую трапіла Жэня. Чаго б папрасіў я ў чарадзейнай кветачкі? Так цяжка выбраць, нават тады, калі ты ўжо дарослы, маеш жыццёвы досвед і пэўныя каштоўнасці. Што ж казаць пра маленькую дзяўчынку...

На што патраціла пялёсткі Жэня? Як і кожнае дзіця, яна не задумваецца над чымсьці глабальным і вялікім, а просіць тое, што першае ўзбрыдзе ў галаву. Спалохалася, што мама насварыцца за разбітую вазу — адарвала пялёстак і зрабіла яе цэлаю. Зацікавілася, які ж на самай справе Паўночны Полюс — вось і пабывала там. Разлавалася на дзяўчынак у двары — адпомсціла ім па-дзіцячы. Зноў жа, дзякуючы кветачцы. І ні разу не задумалася, што пялёсткаў толькі сем. Як ніводнаму дзіцяці ніколі не даўмецца, што і жыццё не вечнае, і далёка не ўсё ў ім магчыма.

Жэня вельмі здзіўляецца, калі заўважае, што пялёстак застаўся толькі адзін. Але тым не менш, скарыстаць яго хоча тут жа, не пакідаючы на потым. Праўда, яна атрымлівае чарговы падарунак лёсу — нагоду, вартую для чараўніцтва. І, мабыць, упершыню ў жыцці сутыкнуўшыся з невымерным чалавечым горам, невылечным калецтвам, дзяўчынка, не вагаючыся, траціць апошні пялёстак на сапраўды годны ўчынак.

Мараль казкі відавочная. І не навязваецца тэатрам. Гісторыя пра Жэню падаецца як вясёлая гульня ў двары. У такім двары, дзе няма смецця і непарадку, хуліганства і нявыхаванасці. Але затое ёсць мноства песень, прыгожыя танцы, цікавыя забавы. Лялькі ў спектаклі настолькі прыгожыя, што на іх хочацца глядзець бясконца. Эстэтычныя касцюмы і дэкарацыя прывабныя і для малых, і для дарослых. І няхай сабе персанажы спектакля адрозніваюцца ад сучасных дзяцей знешне: наўрад ці сённяшняя дзятва будзе, напрыклад, ледзь не да слёз спрачацца, што мець лепш — калясачку ці сумку. Спачуваюць і вучацца дабрыні яны ва ўсе часы аднолькава. І сучасныя юныя гледачы, зразумела ж, таксама фантазіруюць і разважаюць, перажываюць за герояў разам з артыстамі. І выспяваюць, нараджаюцца думкі ды высновы, дзякуючы якім маленькія фантазёры ператвараюцца у сапраўдных асоб.

Вікторыя ДАШКЕВІЧ

г. Віцебск

Што з таго, калі цар у фраку?

«Барыс Гадуноў» на канцэртнай сцэне

**Каго можа зацікавіць оперная прэм'ера без тэатральнага антуражу, дэкарацый, рэквізіту, дарагіх касцюмаў?
Ці захоча публіка тры гадзіны дзівіцца на персанажаў, апранутых у амаль аднолькавыя канцэртныя строі,
ды блытацца: дзе тут народ, дзе баяры, дзе думны дзяк, а дзе цар? А выканаўцы галоўнай партыі: ці не занадта ён малады для таго, каб зразумець, адчуць і па-акцёрску раскрыць трагізм свайго персанажа? Ды і навошта было "рабіць замах" на асновы, давяраць гэты вобраз уладальніку барытона, калі Барыс Гадуноў — басовая партыя? Ад такіх пытанняў стамляешся. Тым болей, што зыходзяць яны ад людзей, якіх мала хвалюе сам феномен жывой музыкі.**

Насамрэч, хіба тыя малаадукаваныя нігілісты, што прынцыпова супраць оперы як "састарэлага, нуднага, нікому не патрэбнага жанру", ды тыя кансерватыўныя пурытане, што дбаюць пра чысціню яе традыцый, — хіба не салідарызуюцца яны міжволі ў сваёй пагардзе да жывога творчага працэсу, яго дыялектыкі?

Жывы — значыць запатрабаваны. Рухомы, зменлівы, разнастайны, супярэчлівы, плюралістычны. І непаўторны. Непаўторны, як той выклік руцінным уяўленням пра класічнае опернае мастацтва, што ўвасобіўся ў сёлетняй прэм'еры Нацыянальнага акадэмічнага тэатра оперы Беларусі: Мадэст Мусаргскі, "Барыс Гадуноў" (лібрэта М. Мусаргскага паводле аднайменнай драмы А. Пушкіна; музычная рэдакцыя Д. Шастаковіча).

Грандыёзны твор ужо больш як 130 гадоў прыцягвае ўвагу тэатраў і музычных выдавецтваў. У розныя перыяды і ў розных пастаноўках ды інтэрпрэтацыях (апроч трох аўтарскіх рэдакцый, вядомыя шэсць версій оперы) "Барыс Гадуноў", з большым ці меншым поспехам, надаваў адметнасць рэпертуару беларускага опернага калектыву. Але гэтым разам наш Нацыянальны акадэмічны тэатр прадставіў неўміручы шэдэўр рускай класікі ў канцэртным выкананні на сцэне сталічнай філармоніі.

Хто сказаў, што для пераканальнага ўвасаблення гістарычнага опернага палатна прынцыповае значэнне маюць дэкарацыі і касцюмы, прыклееныя бароды, бутафорская шапка Манамаха з імітацыяй самацветаў, кардонныя скляпенні царскага церама? На сцене нямала эстэтаў і звычайных аматараў мастацтва, якія знаходзяць шарм і ў тым, што вялікія оперы выконваюцца на канцэртнай сцэне, калі ўсе дзейныя асобы — у строгіх касцюмах, у аднолькавых фраках. Вось і наш "Барыс Гадуноў" прайшоў з аншлагам і ў надзвычай эмацыянальнай атмасферы, якую стварала неабыякавая, захопленая публіка.

Адсутнасць дынамічнай маляўнічай "карцінкі", звыклай пастановачнай атрыбутыкі, статычнасць мізансцэн не заміналі стварэнню глыбокага драматычнага музычна-сцэнічнага вобраза. Наадварот, і выканаўцам, і публіцы канцэртная абстаноўка дазволіла больш засяродзіцца на галоўным — на музыцы, яшчэ раз пераканаўшыся, **што** значыць геній кампазітара-драматурга, кампазітара-псіхолага. Чорна-белая элегантнасць відовішча, яго знешняя стрыманасць дазвалялі больш даверыцца слыху, атрымаць асалоду ад шматколернасці гучання, адчуць унутраную дынаміку партытуры, яе драматургію. Аркестр, хор (галоўны хормайстар Ніна Ламановіч), салісты, юныя артысты Дзіцячага музычнага тэатра-студыі, — усе, спрычыненыя да прэм'еры, пад кіраўніцтвам дырыжора Віктара Пласкіны з натхненнем паглыбіліся ў творчы свет Мусаргскага, такі жывы і сугучны сучаснай інтанацыйна-пачуццёвай прасторы.

Новае ўвасабленне "Барыса Гадунова" — нагода паразважаць пра вечнасць класікі, яе актуальнасць і свежасць. Пра дзівоснае творчае сумоўе трох геніяў, у рэальным жыцці разлучаных часавымі межамі: Аляксандра Пушкіна як стваральніка першаасновы оперы, Мадэста Мусаргскага як драматурга і кампазітара ў адной асобе і Дзмітрыя Шастаковіча як аўтара аркестравай версіі твора. Ды важней — пагаварыць пра жывы і яркі ансамбль выканаўцаў, без якіх не было б самой падзеі.

Зразумела, опера выконвалася з купюрамі. Далікатнае скарачэнне яе тэксту, аднак, не зрабіла адмоўнага ўплыву на стацкі вынік. Шкада, вядома, што не прагучала хрэстаматыйная Сцэна пад Кромамі — шэдэўр сімфанічна-харавога пісьма. Але ў той трактоўцы "Барыса Гадунова", якую прапанаваў маэстра В. Пласкіна, яна не адыгрывае вызначальнай ролі. Бо цяпер у шматнаселенай народнай музычнай драме акцэнты былі расстаўлены такім чынам, што яна выразна прагучала як асабістая драма Барыса Гадунова, трагедыя чалавека. Відавочна, што не праблема "народ і ўлада" цікавіла музычнага кіраўніка прэм'еры і яго спадзвіжнікаў, а канфлікт асобы і асяроддзя, унутраны разлад у душы героя. Няма доказаў таго, што дзеля дасягнення царскага трона Барыс Гадуноў пайшоў на крывавае злачынства, — ствараецца ўражанне, што ліхадзея з яго зрабілі нядобрыя чуткі, пасеяныя зайздроснікамі, ды стыхійная людская пагалоска. Ды яшчэ — інтрыгі. Няшчасці ў сям'і.

Неабароненая самота, зацкаванае сумленне. Агонія хваравітай свядомасці даводзіць цара да пакутлівага канання.

Вось да такіх высноў скіроўваюць уражанні ад новай работы опернага калектыву.

Доўга будзе помніцца дзівосны санорна-акустычны эфект ад знаходжання аркестра, хору, салістаў амаль на адным узроўні агульнай сцэнічнай пляцоўкі. Магутны першы хор "На кого ты нас покидаешь", па-кінематаграфічнаму імклівая і ўзрушальная "змена планаў" кульмінацыйнай Шостай карціны (плошча ля сабора Васіля Блажэннага), грандыёзная трагедыйная музычная фрэска фіналу. Ці Сцэна ля фантана: які прыгожы начны краявід малюе аркестр! Міжволі падумаеш: а навошта дэкарацыі, калі ўсё ўжо апісана ў музыцы...

А сцэна ў Чудавам манастыры? Партыю летапісца Пімена выконваў Міхаіл Дружына. Неверагодна! 86-гадовы бас уразіў майстэрствам, трапным акцёрскім увасабленнем вобраза мудрага манаха, паўнагучнасцю сапраўднага оперна голасу, дакладнасцю інтанацыі, выразнай фразіроўкай, культурай дыкцыі, годнай паставай. "Недаром многих лет свидетелем Господь меня поставил"; "На старости я сызнова живу" — у гэтым чулася штосьці нават містычнае...

Самазванец, Грышка Атрэп'еў, квазі-царэвіч... Гэты вобраз ва ўвасабленні Сяргея Франкоўскага надзелены адмоўнай абаяльнасцю. Не пазбаўлены ён і шчырасці, калі просіць Пімена пра бласлаўленне або калі цешыць сябе думкай, што цар Барыс не пазбегне суда. Ды не можа схаваць зайздрасць да чужой вясёлай маладосці, пра якую ўспамінае стары манах. Тонкая ігра тэмбраў у голасе артыста дапамагае адчуць авантурызм і славалюбства Самазванца (Карчма на Літоўскай граніцы; яскравы дуэт з Марынай Мнішак у выкананні Аксаны Волкавай).

Дарэчы, пра сцэну ў карчме: запамінальнай зрабілі яе вобразы спраўнай Шынкаркі (Алена Сало), каларытных "старцев смиренных" — Варлаама (Алег Гардынец) ды Місаіла (Генадзь Чэпікаў). З якой неперайманальнай кранальнасцю гучала скарга вандроўнага манаха Варлаама на хрысціян, што зрабіліся сквапнымі: "Деньгу любят, деньгу прячут", якой шчыраю крыўдай поўніўся яго "рахманы" бас, калі Грышка Атрэп'еў паклёпнічаў на старога...

Барыс Гадуноў — Станіслаў Трыфанаў. З першага маналога ("Скорбит душа") зачароўвае малады, моцны і прыгожы барытон, голас, у якім столькі цеплыні, прыхаванага драматызму, стрыманых эмоцый і прадчуванняў. Барытон, які, аднак, нагадвае знаёмы па старых запісах высокі шаляпінскі бас. І ў гэтым — адметнасць. Непаўторны тэмбр надае асаблівую праніклівасць вакальным інтанацыям артыста і ў маналогу "Достиг я высшей власти", у сцэнах з Юродзівым (Юрый Гарадзецкі), з князем Шуйскім (адметная работа Янаша Нялепы), з Фёдарам (у ролі царскага сына паспяхова выступіў юны саліст Юрый Дземідовіч). Псіхалагічны надлом, які з'яўляецца ў партыі Барыса пасля правакацыйнага расповеда інтрыгана-Шуйскага, перапыненага царом, суправаджаецца метамарфозай у аркестравым гучанні, з якога нібы выспявае вар'яцтва і знакамітая першая рэпліка: "Чур, чур, дитя. Не я твой лиходей...". Пераканальна пражыў артыст той "кавалак мастацкай рэальнасці" — гнятліва-напружанай, балючай, невыноснай, калі яго герой змагаецца са страшным наканаваннем лёсу. Пакутлівы адыход цара Барыса. Апошнія рэплікі на парозе жыцця і нябыту: "Я царь ещё! Я царь ваш...". І ціхі шэпт: "Простите... Простите...". Калі я скажу, што публіка ў зале плакала, гэта не будзе перабольшваннем...

♦

Вядома, праз нейкі час, калі завершыцца рэканструкцыя будынка Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра і жыццё калектыву Беларускай оперы ўвойдзе ў звыклы рытм, спектакль "Барыс Гадуноў" зноў паўстане на яго сцэне. Але гэта будзе ўжо іншы спектакль.

Святлана БЕРАСЦЕНЬ

На здымках: лаўрэат міжнародных конкурсаў Станіслаў Трыфанаў; гістарычны партрэт Барыса Гадунова; на першым плане — заслужаныя артысты Беларусі Міхаіл Дружына, Сяргей Франкоўскі, лаўрэат нацыянальных і міжнародных конкурсаў Аксана Волкава.

Фота аўтара

Падзея пасля падзеі

Пераборлівая "Паўлінка" знайшла свайго героя

Напэўна, філарманічная прэм'ера "Барыса Гадунова" паспрыяла таму, каб звярнуць увагу грамадскасці на фенаменальнае і плённае сцэнічнае даўгалецце Міхаіла Дружыны і адзначыць артыста "за адданасць беларускаму нацыянальнаму тэатру і шматгадовую творчую працу". Менавіта за гэта саліст нашага Нацыянальнага акадэмічнага тэатра оперы, адзін з вядучых яго майстроў, М. Дружына ўзнагароджаны сёлета галоўным прызам Беларускага саюза тэатральных дзеячаў "Крыштальная Паўлінка". Дарэчы, сярод тых, каго яшчэ саюз адзначыў сваімі традыцыйнымі ўзнагародамі з нагоды Міжнароднага дня тэатра, — актрыса Купалаўскай сцэны Тамара Міронава (прыз "Крыштальная Зорка"), артыст Беларускага рэспубліканскага тэатра юнага гледача Аляксандр Гладкі ("Крыштальная Кветка"), іх калега з Беларускага дзяржаўнага тэатра лялек Аляксандр Васько ("Крыштальны Анёлак"). Сёлета ўпершыню была ўручана прэмія імя Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча, заснаваная Міністэрствам культуры Беларусі і БСТД. Яе, разам з прызам "Натхненне", атрымаў акцёр Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа Валянцін Салаўёў.

№ 17 25 красавіка 2008 г. ЛіМ

Харошая кватэра Міхаіла Булгакава

"Вясной заквітнелі белым колерам сады, апранаўся ў зеляніну Царскі сад, сонца лезла ва ўсе вокны, запальвала ў іх пажары. А Дняпро! А заходы! А Выдубецкі кляштар на схілах! Зялёнае мора ўступамі збягала да рознакаляровага ласкавага Дняпра. Чорна-сінія густыя ночы над вадой, электрычны крыж Св. Уладзіміра, які вісеў у вышыні... Словам, горад цудоўны, горад шчаслівы, Маці гарадоў рускіх".

Які кранальна-непаўторны тэкст!

Лёс звязаў Міхаіла Булгакава з рознымі гарадамі, найперш з Масквой. Але родным Кіевам пісьменнік не пераставаў захапляцца да скону. Тут, на Падоле, ён нарадзіўся, тут пражыў першыя 30 гадоў свайго жыцця.

На знакамітым Андрэеўскім спуску ў Кіеве ёсць будынак, які не падпарадкоўваецца загадам кіеўскай мэрыі: паводле ўказальніка, ён адзіны тут знаходзіцца не па Андрэеўскім, а па Аляксееўскім спуску, 13. Ганарлівая выбітнасць, апостальская назва вуліцы, містычная лічба — адразу відаць: дом гэты прыйшоў да нас з іншага вымярэння — са старонак рамана, бадай, самага неардынарнага літаратара XX стагоддзя.



Адом гэты сустракаем у "Белай гвардыі" — кнізе, якая змагла пабачыць свет толькі ў 1968-м у Вялікабрытаніі. І сапраўды, ці маглі дараваць непаўторную *бель* рамана пісьменніку ў краіне, пакрытай крывавымі пісягамі камунізму? Але ж, мяркуйма, не гэта сталася асноўнай падставай для забароны твора: насуперак балышавіцкай ідэалогіі абагульнення ўсяго, Булгакаў паказаў трагедыю грамадзянскай вайны не толькі як трагедыю "народа ў цэлым", але і "асобна ўзятай" сям'і інтэлігентаў Турбіных, іх сваякоў і сяброў.

З пранізлівай любоўю Міхаіл Афанасьевіч распавёў пра атмасферу ўтульнай хаты, у якой жывуць людзі, якія любяць адно аднаго. Атмасфера такая захоўваецца ў Булгакаўскім доме і дагэтуль: з 1991-га гэта не проста дом, а дом-музей класіка.

Спрычыніўся болей за ўсё да збяражэння гэтага месцейка Анатоль Канчаноўскі — чалавек-падзвіжнік, візіт якога ў колішнюю булгакаўскую абіцель напрыканцы 1960-х закончыўся пераходам з работы інжынера радыёэлектронікі ў аб'яднанні "Квант" да служэння класіку.

У месцах, звязаных з аўтарам "Майстра і Маргарыты", заўжды меў месца налёт містыкі. Анатоль Пятровіч узгадвае, як адкрывалі гэты музей спякотным летнім днём семнаццаць гадоў таму. Сонца абпальвала твары выступоўцаў. Калі ўсе жадаючыя сказалі *цырымонныя* словы, гасцей запрасілі зайсці ў дом. І ў гэты момант, зусім незразумела адкуль, раздаўся адзін перуновы ўдар. Але ані кроплі дажджу не пралілася на зямлю. Госці зайшлі, паглядзелі: хата тады падалася зусім пустой... А вечарам грымнула навальніца.

Калі адкрывалі помнік літаратару ў 2006-м, надарылася падобная сітуацыя.

— *То было 19-га лістапада. З раніцы было неяк непрыемна. У кастрычніку Кіеў не такі ўжо змрочны — а тут імжэў дождж, цёмна было неяк, няўтульна,* — расказвае Анатоль Пятровіч. — *Як зараз бачу: з'яўляецца вялікая машына, наверсе якой стаіць Міхаіл Афанасьевіч, увесь перавязаны аборкамі, бо трэба было яго падымаць кранам. Кран учапіў скульптуру; бронзавы Міхаіл Афанасьевіч падняўся на верхатуру і павіс над Андрэеўскім спускам. У гэты момант, адкуль ні вазьміся, сонца выскачыла з-за хмараў і асвяціла і Андрэеўскі спуск, і скульптуру. Пакуль не паставілі на п'едэстал бронзавага Міхаіла Афанасьевіча, сонца не спыняла сваёй дзейнасці — свяціла.*

І хвілін пяць прастаяла на п'едэстале тая скульптура ў промнях, а потым сонейка схавалася, і зноў заімжэла.

* * *

Пераступаючы парог дома, у якім Булгакаў і сам жыў, і пасяліў сваіх герояў Турбіных, адразу адчуваеш водар часу, апісанага ў "Белай гвардыі".

1918 год, грамадзянская вайна. Вельмі напружанае становішча і ў горадзе, і ў кожным доме — у тым ліку і тут, на Андрэеўскім (Аляксееўскім) спуску. І вось, гаспадыня гэтага дома чакае двух мужчын: мужа і брата...

Булгакаў — чалавек музычкальны, ён часта звяртаецца да музычных тэрмінаў. Чытаем у "Белай гвардыі": "А за акном — сапраўдная опера перад Ражаством". Так апісаны прыцемкі, якія ў снежні вельмі рана апускаюцца на Кіеў. Міхаіл Афанасьевіч працягвае: "Ярка зазіхацелі вокны Турбіных на другім паверсе, а на першым, дзе жыве гаспадар дома, яны згаслі", бо гаспадар у гэты час заўсёды хаваў грошы ў патайныя месцы.

Сапраўды: і ў кнізе, і ў рэальным жыцці у гэтым доме — заўсёды дзве сям'і. Кватаранты Булгакавы з'яўляюцца тут у 1906 годзе, калі прафесар Кіеўскай духоўнай акадэміі Афанасій Булгакаў прыязджае сюды з жонкай і нашчадкамі. Сям'я па тых мерках была не такая ўжо і вялікая: усяго толькі сямёра дзяцей.

Міхаіл Афанасьевіч нарадзіўся тут, на Падоле, за летапіснай Замкавай гарой, якая пад рознымі імёнамі ўзгадваецца яшчэ ў старажытных былінах, непадалёк ад вуліцы Узвіжанскай, названай так у гонар старажытнарускага храма, які захаваўся да нашых дзён. На ёй, на гэтай вуліцы ў сям'і тады дацэнта Кіеўскай духоўнай акадэміі Афанасія Булгакава і яго жонкі Варвары Міхайлаўны нарадзіўся першынец. Назвалі хлапчука ў гонар дзеда па мацярынскай лініі ды апекуна Кіева архістратыга Міхаіла.

Афанасій Іванавіч не меў магчымасці пабудаваць дом альбо набыць яго, таму сям'я змяніла вельмі шмат кватэр. Кожны раз, калі ў сям'і адбывалася прыбаўленне, даводзілася здымаць якую іншую кватэру. Але ж Андрэеўскі спуск, 13 — апошні булгакаўскі адрас у Кіеве.

— *Мы сюды прыйшлі ў 1988 годзе, калі будынак знаходзіўся ў вельмі цяжкім стане,* — распавядае Анатоль Канчаноўскі. — *Акрамя "каробкі", мы далі слова захаваць усё, што было ў ім: нешматлікую тагачасную мэблю, якая засталася, паркетную падлогу — там, дзе яна была, — анфіладныя дзверы і тыя кафлевыя печы, пра якія Булгакаў піша, што яны грэлі і расцілі ўсю сям'ю Турбіных і сям'ю Булгакавых таксама.*

Стваральнікі музея Булгакава ў 1988-м і не разлічвалі застаць там булгакаўскую мэблю, іншыя хатнія рэчы (Булгакаў пакінуў кватэру ў 1919-м). І тым не менш, сёе-тое энтузіясты адшукалі:

— *Да прыкладу, фартэпіяна, на якім стаяць ноты вечнага "Фауста" з юнацкім аўтографам Булгакава. Люстэрка, якое нават не рэстаўравалі: бо яно памятае ўсіх Булгакавых і іх сяброў, якія завітвалі ў дом, і зараз запомніць вас, калі будзеце праходзіць міма яго.*

Была і іншая мэбля. Але энтузіясты пра яе нічога не ведалі — пакуль не звярнуліся ў архівы ды пакуль не пазнаёміліся з людзьмі, якія бывалі ў гэтым доме.

* * *

— *Мне пашанцавала, што я ведаў і першую, і другую жонку Булгакава,* — кажа Анатоль Канчаноўскі. — *Таццяна Мікалаеўна — адзіная венчаная жонка Міхаіла Афанасьевіча — да сваіх апошніх дзён захавала выдатную памяць.*

А перажыла яна свайго першага мужа больш чым на палову стагоддзя: Міхаіл Булгакаў пайшоў у вечнасць, калі яму не было і 50 (адбылося то 10 сакавіка 1940-га ў Маскве). А Таццяна Мікалаеўна памерла ў Туапсэ на 96-м годзе.

— *Я неаднойчы да яе прыязджаў, мы бачыліся, хадзілі па крамах і ў кіно,* — узгадвае дырэктар музея Булгакава. — *Яна была чалавекам вельмі рухавым і "мабільным", нягледзячы на ўзрост — ёй споўнілася 80, калі мы з ёй пазнаёміліся. Яе памяць і інтэр'ерныя фотаздымкі, якія мы адшукалі ў архівах, дазволілі нам узнавіць аблічча дома.*

Узнаўлялі тое аблічча амаль два дзесяцігоддзі, праехалі дзесяткі тысяч кіламетраў па былым Саюзе, пераглядзелі стосы архіўных дакументаў — каб толькі знайсці прадметы, да якіх калісьці дакраналіся рукі Міхаіла Афанасьевіча і членаў яго сям'і. Пасля такой работы дырэктар мае права і гонар сустракаць гасцей дома-музея фразай: "Каб нікога не падманваць — ні вас, паважаныя наведвальнікі, ні сябе, — у нас толькі сапраўдныя булгакаўскія рэчы".

Замест жа прадметаў булгакаўскага інтэр'ера, якія да нашых дзён не дайшлі, у экспазіцыі музея — рэчы таго часу. Булгакаўскую аўтэнтыку і не арыгінальныя прадметы лёгка адрозніць: рэчы сям'і класіка "звычайныя", а рэчы завезеныя — белага колеру, гэта іншы свет — свет Турбіных.

У сям'і Булгакавых і дзяды, і прадзеды — амаль усе былі святарамі, вось чаму пра сябе яны казалі: "Мы — калакольныя дваране". Толькі Афанасій Іванавіч, бацька класіка выбраў іншую сцяжыну ў жыцці: скончыўшы Кіеўскую духоўную акадэмію, стаў прафесарам. А ягоны сын увогуле не пайшоў па духоўнай лініі — скончыў медыцынскі факультэт.

— *Гасцінай служыла па прамым прызначэнні. А ў бакавым пакойчыку Булгакаў як лекар-венеролаг прымаў пацыентаў. За шырмай знаходзілася Таццяна Мікалаеўна, якая выконвала функцыі медсястры.*

Тут і дагэтуль — тагачасны ўрачэбны кабінет. Многія медыцынскія прылады, прадметы інтэр'ера вярнуліся ў булгакаўскі дом намаганнямі сяброў музея.

— *Прынамсі, падлогу мы маглі б замяніць, але наўмысна гэтага не рабілі. Напрыклад, вось тут* (паказвае на адбітак на падлозе. — **аўт.**), *паводле Таццяны Мікалаеўны, яны калісьці забылі гарачы прас. Гэткім чынам тут захавалася памяць пра тыя часы, калі тут жыла дружная сям'я Турбіных — Булгакавых.*

* * *

Дом у Кіеве — не адзінае жыллё Булгакава, якое знайшло адлюстраванне ў яго творах.

У адным са сваіх апошніх лістоў Булгакаў напіша такія радкі: "Я — містычны пісьменнік". І падкрэсліць іх некалькі разоў. У "Майстры і Маргарыце" — творы, напісаным ужо ў маскоўскі перыяд жыцця Булгакава — аўтар пасяляе прафесара чорнай магіі Воланда ў "нядобрую" кватэру на Садовай. Гэту кватэру Міхаіл Афанасьевіч ведаў выдатна, бо сам там жыў.

— *Таццяна Мікалаеўна мне распавядала, што калі ў 1921 годзе яны апынуліся ў Маскве, пасяліліся ў пакоі, які належаў сястры — Надзеі. То быў пакой у перанаселенай камуналцы. Жылося там вельмі цяжка. Па-першае, суседзей зашмат, па-другое, шумныя яны былі вельмі... Адзін сусед хацеў трымаць у доме пеўня, і вельмі хацеў, каб той спяваў. Ён доўга пакутаваў з дрэсіроўкай птушкі, пакуль не прымусіў яе спяваць, наліваючы ёй гарэлкі. Другі вельмі любіў іграць на гармоніку. Дужа дрэнна — але іграў. У яго была вялікая кампанія, дружбакі шмат пілі, паводзілі сябе шумна, потым беглі з сякерай адзін за адным — канечне, усялякае было.*

Тым часам Булгакаў ледзь-ледзь ухапіўся за нейкае месца — пісаў фельетоны ў газеце "Гудок". Па начах пісаў "Белую гвардыю"... Трэба было альбо адпачываць, альбо працаваць. А тут — ні таго, ні другога. Таму Булгакаў гэтую кватэру не-на-ві-дзеў.

— *І вы памятаеце, у той кватэры ладзіцца баль. Але як у маленечкім пакоі зрабіць баль? Тады Булгакаў выдумляе нейкае іншае вымярэнне, і пашырае памеры пакоя да агромнай залы. Мы з вамі баль ладзіць не будзем, але ў наступны пакой пройдзем праз сцяну. Гатовыя? Калі ласка.*

Мы з дырэктарам музея не ў творы Булгакава, а ў сённяшнім часе ў Кіеве, — але створкі шафы рассоўваюцца і гасцінна запрашаюць нас перайсці ў суседні пакой.

Там жывуць трое маладых людзей: усе Булгакавы, толькі з рознымі імёнамі па бацьку: адзін Афанасьевіч і два Пятровічы. Гэта будучы пісьменнік са сваімі стрыечнымі братамі, якіх называлі ў сям'і *японцамі*, бо да руска-японскай вайны іх бацька быў настаяцелем праваслаўнага храма ў Японіі.

Далей праходзім у пакой, частка якога адведзена пад бібліятэку. У нас і дагэтуль прынята ацэньваць інтэлектуальны ўзровень сям'і па колькасці і якасці кніжак на паліцах. А колькі такая падборка можа сказаць пра станаўленне пісьменніка! Тут — і Гогаль, ад якога Булгакавы былі ў захапленні, і Дастаеўскі, і Дзікенс, і Дзюма — тыя кніжкі, якія з колішніх дзяцей зрабілі сапраўдных людзей.

* * *

У турбінскай гасцінай на кафлі можна ўбачыць розныя надпісы. Іх наносілі — хто вішнёвым сокам, хто фарбамі, хто чарнілами — розныя людзі, якія тут спыняліся. Надпісы адлюстроўваюць гісторыю гэтага горада, гэтага месца: *"Петлюра сышоў"*, *"Белыя свавольнікі панаюць у Кіеве"*, *"Наступаюць банды красныя"*... А нехта з прыхільнікаў гаспадыні дома пакінуў тут такі запіс: *"Леначка, я ўзяў білет на "Аіду!"*

Чытаеш — і ўяўляеш, якімі шчаслівымі маглі яны з гаспадыняй быць, як гучыць цудоўная музыка вялікага італьянца Вердзі... Але ў руках у героя "Дзён Турбіных" — мокрая анучка, ён тут і зараз, і ён адчувае: неўзабаве ў горадзе адбудзецца *чарговы* пераварот, *чарговая* змена ўлады. І ён кідае ў вечнасць: "Леначка, я ўзяў білет на... Аід".

"Усё пройдзе — мінуць няшчасці, страшэнныя гады, але зоркі застануцца. І няма аніводнага чалавека, які б гэтага не ведаў. Дык чаму мы часам не звяртаем увагі на неба?.." — так заканчвае Булгакаў "Белую гвардыю".

І сапраўды, чаму? Тым больш, што там, уверсе, па-над званамі старажытнай Сафіі, ёсць адна зорка, якая носіць імя Міхаіла Афанасьевіча Булгакава.

Мікалай АНІШЧАНКА
Кіеў—Мінск
Фота аўтара

«Вожык» у «ЛіМе»

Выкрамзанкі ад Івана Стадольніка

«Я знаходзіўся ў нецвярозым стане з выпадку памёршага дзядулі, які жыве ў вёсцы Сасноўка».

«Каровы калгаснікаў, затрыманыя на канюшыне, будуць аштрафаваны і зняты з чаргі на атрыманне матацыклаў».

«Пачуўшы шум, я выбег на вуліцу ў чым маці нарадзіла: у трусах і майцы».

«Млын часова спыніўся. Млынару даць адгул і паставіць яму новыя шасцяронкі».

«Я застрэліў лася на сваім агародзе, бо зблытаў яго з сусед-скай каровай, з якою пасварыўся і не размаўляю».

«Мяне з мужам павесілі на адзін нумар, у выніку чаго я за-сталася без паліто і шапкі».

«Акрамя ўсяго, на маім утрыманні знаходзяцца дзеці і жон-ка дашкольнага ўзросту».

«Затрыманы грамадзянін Пятроў — глуханямы. Прычына затрымкі: публічна лаяўся брыдкімі словамі».

«Прашу прадаставіць мне адпачынак, бо я выходжу замуж на два дні».

«Герой твора заўсёды атрымлівае перамогі над жанчынамі і іншымі шпіёнамі».

«Пастанавілі: прадаць Крывіцкаму А. С. цяля, для адпраўкі яго ў армію».

Базыль ХІЗАВЕЦ

Рэвізія

Райпоўскі рэвізор Хвядос
Уранні корпаўся ў партфелі
І мармытаў сабе пад нос
(Відаць, шчэ не прайшло пахмелле):
— Які неверагодны факт!
Выходзіць, што ўпустую страціў
Я цэлы дзень на мясакамбінаце?!
А жонка:
— Не бядуй, Хвядос!
Твой акт ляжыць у маразілцы!
Хіба не помніш? Ты ж прынёс
У ім свіныя паляндвіцы!
— Не помню: так направяраўся,
Што ўчора ледзь дамоў дабраўся.

Малюнак М.С. Гіргеля

Малюнак А.П. Каршакевіча

Міхась САЗОНЧЫК

Вада

Паэт не мог цярпець вады,
А як дабраўся да Парнаса,
Дык прагна піў ваду тады —
І за сябе, і за Пегаса.

Міхась МІРАНОВІЧ

Праца

Калі добра
Разабрацца —
Будзем мець
Адказ прамы:
Так ніхто
Не любіць працу,
Як не любім
Яе мы!..

Ісціна не ў віне

Сябры!
Паслухайце мяне:
Шукаў я ісціну
Ў віне.
Знайшоў!
А ісціна такая:
Што я не там
Яе шукаю!

Віктар ГАРДЗЕЙ

Шчырая праўда

— Грамадзянін!
Куды? Адкуль? —
Падпітага спытаў патруль, —
І не маўчы, чаго прыціх?
Было, канечне ж, на «траіх»?

Узвіўся тут грамадзянін:
— Я піў, таварышы, адзін,
Але скажу вам без маны:
Адэкалон той быў трайны.

Анатоль ЦЫРКУНОЎ

Газетны зубр

Быў публіцыстам-аналітыкам,
Граміў прыхватызатараў раней,
А зараз стаў
музычным крытыкам:
Рашыў, што так і лепш,
і спакайней.

Генадзь АЎЛАСЕНКА

На прыёме ў псіхіятра

— Цяпер скажыце, небарака,
Калі ўсё пачалося ў вас?
Калі аб тым, што вы — сабака,
Прыйшла вам думка ў першы раз?
— Аб гэтым думаў я цішком
Яшчэ маленькім шчанюком.

Міхась УЛАСЕНКА

Што для чаго

— Дзесяць вёрст прабегу нанач! —
— Гэта ж перабор, Сцяпаныч...
— Не, то ж важна для здароўя—
Ачышчаю гэтак кроў я.
— Па якой тады прычыне
Вы — на працу на машыне?
— Вось падкінуў закавыку!
Гэта ўжо, мілок, для шыку.

Георгій ТАМАШЭВІЧ

Толькі замуж

Мець бы вёсцы клуб
ды краму —
Дзеўкі сохнуць ад нуды,
Бо, апроч як толькі
замуж,
Выйсці ім няма куды.

Васіль ЖУКОВІЧ

Калі не хочаш, панна,
Служанкай быць давеку,
То не выходзь за пана —
Выходзь за чалавека.

Уладзімір ШУЛЯКОЎСКІ

Работу — дадому

— Стой! —
раве ахоўнік басам. —
Ты куды за браму
з мясам?
— Я ж каўбаснік,
дзядзька Рома,
Дык работу ўзяў
дадому.

Павел САКОВІЧ

ЭПІГРАМЫ, ЯК РЭКЛАМЫ

Уладзімір Карызна

(Да 70-годдзя)

Калі ён уваходзіць у пакой,
Ускочыць хочацца
па стойцы «смірна!»
Хоць ён не генерал і не Герой,
Затое аўтар нашага
Дзяржгімна!

Анатоль Зэкаў (Антон Прыцэл)

Ён як серыйны "Дуэлянт",
Вядзе падлік сваім трафеям:
Паэткам,
розным німфам, феям.
Ды ўжо "стралку" за пяцьдзесят
І паляваць мо лепш
з Прыцэлам?

А той, спрытнюга, лавелас,
У дзевак вокам
цэліў змалку.
Цяпер ён "хроснага" якраз
Рашыў адправіць...
у адстаўку.

Забраў "ліцэнзію"
Прыцэл
І кажа здзекліва паэту:
— Ліміт ты выбраў
на адстрэл,
Мая чарга заняцца *гэтым*...

Малюнак П.С. Козіча

Васіль МАКАРЭВІЧ

Мініяцюркі-літаратуркі

Характар

Не есць, не п'е
ды і не спіць,
І мужу дасць падчас
па карку,
А за сталом
з пяром сіпіць
Штодня,
нібыта кавaварка.

Ілья ШАХРАЙ

Міфчык

Аднойчы тры вядомыя пальцы — Вялікі, Указальны і Сярэдні — склаліся. Не, не ў тое, што можна падумаць, бо прысутнічаў там і стэнаграфіст Мезенец.

На іх важнай нарадзе абмяркоўвалася адно-адзінае — трэба было перайменаваць Безыменны палец.

Шмат у нас розных імёнаў, на ўсё пальцаў не хопіць...

Сярэдні аж пазногцем счарнеў, прапануючы ўсё но-выя і новыя. Але Указальны салідна адмоўчваўся, а Вялі-кі нястомна адпрэчваў.

Тады і падаў голас Мезенец: надакучыла яму запіс-ваць, а можа, адразу здагадаўся і чакаў зручнага момант-ту...

І пачаў Безыменны палец называцца так — Палец імя Указальнага пальца.

Мезенцы, яны — ого-го!— бывае, у Вялікія выраста-юць...

Цыдулкі на слупах

♦ Патрабуецца прадавец касметыкі ў кніжны аддзел прадуктовага магазіна.

Даслаў Уладзімір Шкаброў
г. Бабруйск

♦ Вопытны тамада за памяркоўную плату арганізуе культурны запой на чатыры дні.

Даслаў Міхась Сліва
г. Рагачоў

♦ Вешаем карнізы і... локшыну на вушы.
♦ Патрабуецца афіцыянтка ў міні-бар. Форма адзення — міні.
♦ Абутак на заказ. Абуем у лапці каго хочаш.
♦ Венікі для парыльні. Банны ліст не прыліпае.

Даслаў Венядзікт Бярбега
г. Магілёў

«І душа двоіцца. Дзве душы»*

Эсэ

* * *

Шуміць, гайдаецца бярозка,
Пераліваецца, плыве,
Пахваліць вёска, зганіць вёска,
Працуе, гутарыць, жыве.

Я выраслa ў вёсцы на Скідальшчыне. Мова майго дзяцінства — мясцовы беларускі дыялект. На працы і ў паўсядзённым жыцці гавару, як і большасць, па-руску. Па-беларуску размаўляю са сваімі беларускамоўнымі сябрамі. Шчасце, што такія ў мяне ёсць. Але і па сёння самая шчырая і нязмушаная, самая жывая і арганічная для мяне — мова маёй вёскі. З ёю я такая, як ёсць, без прыўкрас і прыстасоўвання да іншых. Гэтая мова льецца з мяне, як звонкая іскрыстая крынічка, наталяе мае трывогі і напойвае чыстым спакоем.

Ёсць у мяне сяброўка-аднакласніца. Выйшла замуж у Піцер, там і жыве да гэтай пары. Кожны год, летам, мы сустракаемся з ёю ў вёсцы. Былі маладзенькімі, распавядалі адна адной свае навіны па-руску. І хоць я на той час ужо скончыла рускае аддзяленне філфака, але чысціні вымаўлення вучылася ў Таццяны. А потым неяк раптам разам перайшлі на гаворку "папросту". Вярнуліся ў дзяцінства...

А мае гарадскія дзеці над маёй вясковай мовай кпяць. І папікаюць мяне: "Ты ж філолаг".

* * *

Далёка-далёка ёсць дом,
Напоўнены роднай гаворкай,
І студня з гаючай вадой
На чыстым вішнёвым падворку.

У хаце мы таксама гаварылі на дыялекце, хоць бацькі мае былі настаўнікамі: тата выкладаў у мясцовай школе беларускую мову, а мама —рускую. Але ж з намі жылі яшчэ і бабулі, спаконвечныя праваслаўныя беларускі. І сям'я падстройвалася пад іх гаворку. Усё ж літаратурныя мовы я таксама ведала добра, бо сорамна было дрэнна вучыцца ў бацькоў.

У 4-м класе я неспадзявана апынулася ў спецшколе-інтэрнаце, дзе лячылі парушэнні асанкі. Дзеці там былі ў асноўным гарадскія, з вёсак — толькі я і яшчэ адна дзяўчынка. Ядзю дражнілі, таму што яна гаварыла па-руску з беларускім акцэнтам і часта ўстаўляла "вясковыя" словы. А мяне прынялі лепш: "Ты вот тоже из деревни, но говоришь правильно". Тады я ганарылася сабой — гэтак лёгка прыстасавалася. Не тое, што Ядзя.

А цяпер мне сумна гэта ўспамінаць. І вельмі шкада Ядзю...

* * *

Мой бацька ніколі не ссек на дровы
Жывое дрэва.
Ніколі не сказаў брыдкага слова,
Нават у гневе...
Ён садзіў грады і пасвіў каровы,
Сеяў на полі.
І заклікаў шанаваць сваю мову
Вучняў у школе.

Мой тата быў шчырым беларусам. З сям'і, у якой пры панскай Польшчы выпісвалі з Вільні кнігі на беларускай мове: мастацкія і аб вядзенні гаспадаркі. Чыста гаварыць па-руску ён не мог, і калі яму даводзілася замяняць урокі рускай мовы, захоўваў у сваім вымаўленні цвёрдыя [р], [ч], [шч], дзеканне і цеканне. Ён нібы раз і назаўсёды зросся са сваёй вёскай, сям'ёй, школай, беларускай мовай... Дзесьці ў іншым месцы, якімсьці інакшым яго проста немагчыма было ўявіць. Ён моцна перажываў, калі па жаданні бацькоў наша школа стала рускай. Здаралася, што яго вучні не маглі выказацца па-беларуску ці штосьці на роднай мове не разумелі, тады ён з нейкім шчымлівым гумарам гаварыў: "Ну, дык вы ж французы".

Мая мама пісала вершы на дзвюх мовах. У сярэдніх класах школы я таксама пачала пісаць, і па-руску.

А тата моўчкі перакладаў нашы рускія вершы на мову беларускую. І надпіс на помніку па ім — беларускі, адзіны на нашых могілках.

* * *

Словы радасці, смутку, любові...
Мае кожнае колер і пах.
Лісцік восеньскі, росны, дубовы,
Быццам слова, трымаю ў руках.

Пасля трэцяга курса інстытута я паехала ў будатрад у Малдавію. Упершыню так далёка адарвалася ад дома. Спачатку нас вёз цягнік, у якім я спала на самай верхняй паліцы, бо была даволі спартыўная, лёгка магла туды залезці. І не баялася ўпасці. Потым быў аўтобус да студгарадка. Увесь час душа замірала ад бачання шмат чаго новага і пакуль чужога: прыроды, людзей, гарадоў і сёлаў. Чакалася незнаёмай малдаўскай гаворкі.

Прыехалі. І пачулі: "Куды студэнтаў падзець?" Відаць, наш вадзіцель быў з Беларусі. Не магу дакладна перадаць свой стан: такім родным, такім сваім павеяла на мяне ўдалечыні ад радзімы! Тады я ўпершыню адчула, якім важкім, смачным, напоўненым колерамі можа быць слова... Якім незабыўным.

А далей усе гаварылі з намі па-руску. І гэта было звычайна.

* * *

На беразе крутым
Між дрэў мае сляды —
Па сцежцы вузкай.
Стартуючы на месяц,
Пяюць сасна і вецер —
Па-беларуску.

Балтыйскае мора я пабачыла пасля Чорнага. Да Чорнага, у Адэсу, мы з'ездзілі з будатрада. Памятаю, што збіраўся дождж. Вялікі натоўп людзей ішоў з пляжа. А мы працісkаліся супраць плыні — на пляж. Дайшлі, убачылі мора, нават скупаліся, хоць дождж пачаўся ўжо. Упэўніліся: сапраўды салёнае, сапраўды хвалюецца, сапраўды бясконцае. Пад нагамі калоліся каменьчыкі, за спінай уздымаўся толькі што адкрыты намі горад экзатычнага поўдня. І навокал — пусты пляж.

Балтыка, дзе я была гадоў на шэсць пазней, так ужо не здзівіла. Дзіўным для мяне было іншае: мора пачыналася за соснамі. У маім уяўленні за такімі знаёмымі соснамі павінна было б быць возера Белае ці рака Нёман... Толькі не мора, да якога я павольна ішла па цёплым пяску...

А сосны шумелі зусім па-беларуску. І мора ім адказвала.

* * *

Жанчына ў туфлях вузкіх
За кнігу заплаціла:
"Наверно, зря купила...
Она ж на белорусском..."
А з вокладкі ў малюнках
Глядзелі словы ўважліва,
Пыталі словы здзіўлена:
"За што нас так зняважылі?
Здаецца ж, на радзіме мы..."

"Я вельмі люблю сваю Беларусь, а беларускую мову не люблю..." — такое я не адзін раз чула ад беларусаў. Спачатку горача спрачалася з імі, а потым перастала, бо нікога ні ў чым не пераканала. У мяне ёсць знаёмыя, якія ахвотна чытаюць мае рускія вершы і ніколі не чытаюць беларускіх. Пры гэтым нават як быццам бы дакараюць: "Навошта ты пішаш па-беларуску?" Я, вядома ж, даведалася ў іх, чаму яны так ставяцца да роднай мовы. Аказваецца, яна для іх гучыць груба, а сэнсу шмат якіх слоў проста не разумеюць. Цяжка правільна ацаніць тое, што дрэнна ведаеш. Немагчыма добра ведаць тое, чым не цікавішся і не карыстаешся. Нязручна карыстацца, калі пры гэтым ты нейкі не такі...

Я не маю сілы, каб плыць супраць плыні, таму і гучыць па-руску маё паўсядзённае жыццё, а беларускую мову я пакінула сабе для эпізадычнага ўжытку са сваімі нешматлікімі сябрамі. Калі скажу, што дужа пакутую ад гэтага — пакрыўлю душой, бо руская мова для мяне багатая і прыгожая, і таксама мая — не змушаная. У маім уяўленні яна — акіян, магутны і бясконцы.

А беларуская — возера, цёплае і лагоднае, сярод маляўнічых краявідаў, такое роднае, такое спрадвечнае і шчырае... І гэтае возера высыхае, у тым ліку і па маёй віне...

* * *

Я вынашу верш і выплачу.
Вось ён — на паперы ляжыць.
Сум вышапчу, роспач выкрычу,
Страх вызначу — буду жыць...

Я пішу вершы на дзвюх мовах — рускай і беларускай. Пры гэтым ніколі не выбіраю мову спецыяльна, не планую, на якой мове напішу. Вершы прыходзяць да мяне самі разам з адпаведным настроем, думкамі, мелодыяй і мовай. Некаторыя магу перакласці з адной мовы на другую. Але далёка не кожны... Большасць у перакладзе для мяне "не гучаць".

Напэўна, у мяне, як і ў створанага Максімам Гарэцкім вобраза — Ігната Абдзіраловіча, дзве душы. Адна з іх жыве "тут" і "цяпер", а другая ў гэты ж час ацэньвае і абдумвае пражываемае. Яны спрачаюцца між сабой і кожная з іх папераменна становіцца то паняй, то рабыняй. І я пачынаю думаць, што адна з іх — беларускамоўная, а другая — рускамоўная.

Беларускія словы прыходзяць да мяне адначасова з думкамі і пачуццямі. Я ўкладваю ў іх боль, радасць, сумненні, меркаванні, якія на той момант ува мне жывуць, разрываюць мяне і просяцца стаць вершам — нарадзіцца, адасобіцца, выгаварыцца. Я застаюся ўнутры беларускага верша распранутай, адкрытай для ўсіх і безабароннай. Не разумею і задаю пытанні... Спавядаюся, каб атрымаць суцяшэнне. Каюся, каб саму сябе дараваць... Гэта цяжка, бо цяпер усе пра мяне усё ведаюць... І гэта лёгка, бо тады і я пра сябе ведаю ўсё...

У рускіх вершах я над сабой, па-за сабой, я разглядаю сябе збоку, абагульняю і аналізую тое, што перажылося і ўжо стала маім духоўным вопытам. Я заўсёды прыкладна ведаю, аб чым будзе рускі верш, як будзе — гэта ўжо на ўзроўні інтуіцыі. У маіх рускіх вершах няма надрыву ад неспасціжэння чагосьці і трапятання ад сумненняў. Ёсць усведамленне памылак і спадзяванні на лепшае, захапленне прыгажосцю і непрадказальнасцю жыцця, змірэнне з непазбежнасцю дабра і зла. Мне не страшна, калі іх чытаюць, бо ў іх я такая, якой была ці хацела б быць...

Я часта плачу, калі пішу верш на беларускай мове... І вельмі рэдка плачу, калі пішу па-руску...

* * *

Зноў у храме за мову малюся:
Шмат каму яна —
сумны прымус.
Ёсць карэнні ў зямлі Беларусі,
Ды як часта без іх беларус...
Я ў палоне маўклівай нязгоды
І даўно пахавала б душу,
Каб не песні радзімы і водар,
І той вобраз,
што ў сэрцы нашу.

Мая памяць часта ўваскрашае гэты дзень, напоўнены шчасцем і ўзрушэннем душы.

Празрыстае, гарачае, блакітна-зяленае лета над Нёманам. Прасторны луг з рэдкімі купінкамі кустоў абрываецца ў раку. Жанчыны грабуць пакошаную траву, і ў паветры стаіць яе ні з чым не параўнальны лекавы пах. Гучыць працяглая, пяшчотная беларуская песня, якая так арганічна зліваецца з гэтымі лугам, небам, ракой. Я сяджу на духмянай купіне і ўсёй істотай прагну аднаго: толькі б гэтая песня не закончылася, толькі б не закончылася...

А што будзе з намі, беларусамі, калі ў нашым жыцці "закончыцца" беларуская мова?

Зямля Беларусі, яе гісторыя і асаблівасці гаспадарання, яе культура і мова — усё гэта на працягу стагоддзяў сфарміравала самасвядомасць і псіхалагічны склад беларуса, зрабіла яго адметным сярод іншых нацый. Сёння беларусы лічаць роднымі дзве мовы — беларускую і рускую; і добраахвотна выбіраюць, на якой мове ім гаварыць.

Ці не вынікае з гэтага, што рускамоўны беларус свядомасна і псіхалагічна іншы, чым беларускамоўны? І што ў нацыі дзве душы, якія жывуць паасобку і ацэньваюць адна адну?

Пры гэтым прыхільнасць да рускай мовы расце, а да беларускай відавочна зменшваецца. Яна можа скончыцца, як тая песня, што гучала над Нёманам і заціхла...

А тым, хто чытаў мае вершы на абедзвюх мовах, больш падабаюцца беларускія. І такое меркаванне пра творчасць тых, хто піша на дзвюх мовах, я чула часта.

Галіна САМОЙЛА

Фота Віктара Кавалёва

---

* Максім Гарэцкі

Марцінкевічаў год доўжыцца

Адшугалі шматлікія юбілейныя ўрачыстасці з нагоды двухсотага юбілею нашага слыннага драматурга і заснавальніка прафесійнага беларускага тэатра Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча. Куратары і арганізатары гэтых урачыстасцей, а разам з імі і даследчыкі Марцінкевічавай творчай спадчыны працягваюць асэнсоўваць гэтую падзею ў нашым культурным жыцці. Мне, прынамсі, закарцела з нагоды Марцінкевічавага юбілею згадаць адну маю сустрэчу з яго праўнучкай Барбарай Крыжаньскай-Чарнавескай.

На святкаванне двухсоттадовага юбілею В. І. Дуніна-Марцінкевіча чакалі прыезду з розных краін яго нашчадкаў. Чакаў іх і я. Асабліва прыезду Барбары Крыжаньскай-Чарнавескай. Чаму менавіта яе? Каб зразумець прагу майго чакання, трэба вярнуцца на гадоў колькі ў наш Дом літаратара...

2003 год. Чацвёртага сакавіка. У Доме літаратара ладзілася літаратурная вечарына ў гонар В. І. Дуніна-Марцінкевіча з нагоды яго 195-гадавіны з дня нарадзінаў. У гэтай урачыстасці, апроч нашых літаратараў і даследчыкаў, прымалі ўдзел і нашчадкі слыннага драматурга. Сярод іх і Барбара Крыжаньская-Чарнавеская. Пасля заканчэння вечарыны я памкнуўся да Барбары. Яна была ўзрушана вечарынаю. Пацікавіўся ў яе, дзе яна жыве.

— А ў Амерыцы, — сказала яна. — Нарадзілася ў Кракаве. Скончыла Ягелонскі універсітет...

— А ці чула хоць калі дагэтуль беларускую мову? — пацікавіўся я.

— Не, не чула!

Я прапанаваў ёй пачытаць тэкст, надрукаваны лацінкай, балазе ў мяне пад рукою, як заўсёды, было факсімільнае выданне "Дудкі беларускай" з яе славутаю прадмовою пра мову. І Барбара пачала чытаць:

Bratcy milyje, dzieci Ziamli-matki majej! Wam afiarujuczy praen swaju, muszu z wami pahawarye trohi ab naszaj doli-niadoli, ab naszaj backawaj zpradwiecznaj mowie, katoruju my sami, da i nie adny my, a usie ludzi eiomnyje, "muzyckaj" zawue, a zawietca jana "b i e l a r u s k a j".

Тэкст брала лёгка, толькі часам прабівалася польска-англійскае прамаўленне.

— Чытаеце вы добра, а ці разумееце, што чытаеце?

І згадаў, як аднойчы турыстам з Каліфорніі я чытаў па-англійску Шэкспіра. Турысткі былі ў захапленні. Яны думалі, што я разумею, пра што я чытаю, а я ні ў зуб нагою. Проста меў спазнанне азоў англійскага чытання, а яны ўсцешана слухалі, аж вочкі свяціліся.

"Во, думаюць, знаўцу англійскай мовы знайшлі!" Дык, можа, ў нас так?

— Ды не! — запярэчыла Барбара. — Наступным разам я ўвесь свой выступ, усё сваё слоўка падрыхтую па-беларуску.

Дай, Божа, тваё слоўка ды Богу ў вушы.

От таму я і чакаў Барбару. Але сталася непрадбачанае: незадоўга перад прыездам у Беларусь на двухсоты юбілей свайго продка яна памерла. Я гэтак і не ведаю, ці напісала хоць колькі вершаў па-беларуску. Мо пра гэта што-кольвек ведае Язэп Янушкевіч, які ліставаўся з Барбараю, цікавіўся яе жыццём. Балазе, Барбара нарадзілася ў 1954 годзе. Выдала тры свае паэтычныя зборнікі на англійскай мове — "Ахвяраванне", "Клетка, поўная мараў","Малітва на ад'езд з Кракава". Яна была праўнучкай Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча. Апантана марыла пра заснаванне музея ў Люцінцы. Апошні раз яна прыязджала ў Беларусь у красавіку 2005 года, каб распачаць збор ахвяраванняў на люцінкаўскі музей Марцінкевіча. На вялікі жаль, яе мары пакуль не здзейсніліся.

Уладзімір СОДАЛЬ

Кафедра беларускай літаратуры і культуры філалагічнага факультэта БДУ выказвае шчырыя спачуванні Людміле Уладзіміраўне Карпавай у сувязі са смерцю МАЦІ.

ВІНШУЕМ

з **80**-годдзем **Курылёву** Святлану Леанідаўну, беларускую пісьменніцу.

з **80**-годдзем **Шымко** Тамару Іванаўну, беларускую спявачку, педагога, народную артыстку Беларусі.

з **80**-годдзем **Брандабоўскую** Лілію Іосіфаўну, беларускага тэатральнага крытыка.

з **70**-годдзем **Масарэнку** Алеся (Аляксандра Герасімавіча), беларускага паэта, перакладчыка.

Юбілейны каляндар

155 гадоў **Пташыцкаму** Станіславу Львовічу, гісторыку, архівісту, даследчыку помнікаў старажытнай пісьменнасці Беларусі, Літвы і Польшчы.

145 гадоў **Арлоўскаму** Яўстафію Філарэтавічу, гісторыку, краязнаўцу, педагогу.

115 гадоў **Гарбацэвічу** Васілю Савічу, беларускаму драматургу.

105 гадоў **Аляхновічу** Міколу (Мікалаю Мікалаевічу), беларускаму крытыку.

105 гадоў **Галавачу** Платону Раманавічу, беларускаму празаіку, дзяржаўнаму і грамадскаму дзеячу.

100 гадоў **Базыленцы** Ганне Мартынаўне, беларускаму мовазнаўцу.

95 гадоў **Рэлесу** Рыгору Львовічу, беларускаму паэту, празаіку. Пісаў на мове ідыш, рускай мове.

80 гадоў **Барышаву** Гурыю Іларыёнавічу, беларускаму тэатразнаўцу і мастацтвазнаўцу, педагогу, драматургу.

75 гадоў **Шымуку** Віктару (Вікенцію Мікалаевічу) беларускаму паэту-песеннику, празаіку, перакладчыку.



Мінорныя інтанацыі паэта

Багатая беларуская літаратура на пісьменнікаў. Была багатай. Хай сабе і сёння выходзіць шмат кніжак, але далёка не кожная з іх — мастацкая з'ява. Каб выдаць кнігу, сёння галоўнае не талент, а грошы. Вось і захлынае нас не толькі расійскае нізкаякаснае чытво, але і айчыннае.
Розніца толькі ў тым, што наша няякаснае ніхто не чытае, а іхняе разыходзіцца вялікімі накладамі. А каб літаратуру чыталі, калі яна напісана бяздарна, трэба зрабіць добрую рэкламу. Калі паскупішся на "прамоцыю", дык тады і прыйдзецца сваю кнігу прэзентаваць выключна сваім знаёмым, бо попыт у кнігарнях на яе будзе мізэрны.

Загаварыўшы пра такую праблему, я хацеў выказаць наступную думку. Сёння мала ўвагі надаецца пісьменнікам з перыферыі, з глыбінкі. У часопісах пераважна друкуюцца сталічныя літаратары ці літаратары з абласных гарадоў. А калі мы зазірнём у біяграфіі нашых пісьменнікаў хаця б пасляваеннай хвалі, то ўбачым, што працэнтаў на 90 яны — ураджэнцы менавіта вёскі ці невялікіх гарадоў. У нас сёння ніхто з маладых не заявіў пра сябе як пра выбітнага празаіка. Ды і ў старэйшых усё меней з'яўляецца значных твораў...

А шчодры край
мне плаціць ганарары
святлом бярозы,
водарам сасны.
Агледзеў ён палёў
маіх абшары
і прыраўняў радок
да баразны.

Па-дзіцячы светлыя, беззаганныя радкі паэта з Баранавічаў можна паставіць у супрацьвагу тым, хто піша выключна для ганарараў: больш напішаш — больш заплацяць.

За што можна аўтара папракнуць, дык за самакрытыку і самаедства. Гэта такая рыса, якая адрознівае паэтаў сталічных ад творцаў з правінцыі.

Ты, муза, капрызна губкі
не крывіш, са мною ладзіш,
прыручаную ґалубку
натхнення пяшчотна
гладзіш.
.....
Пачэснае тваё месца —
на покуці, пад бажніцай!

Словы сапраўды паэта. Толькі ён адзін можа пад абразамі, у гэтым святым месцы хаты, пасадзіць музу. І калі муза для чытача — не больш як фармальнасць, то для літаратара — гэта сапраўды святое.

У семнаццацігадовым узросце Іван Лагвіновіч паехаў на Украіну працаваць на вугальных шахтах. І вярнуўся на радзіму толькі праз 34 гады. Прычым вярнуўся не толькі да бацькоўскай зямлі, але і да яе мацярынскай мовы (у Данбасе пісаў па-руску).

Запрашала дамоў Айчына,
перамовы са мной вяла,
я вярнуўся — як маці сына
не сустрэла, не абняла —

спавядаецца аўтар. А вярнуўся ж ён у 1991 годзе, калі Айчына перажывала цяжкія часы. Не да сына ёй было тады.

Да Беларусі ў паэта, як чалавека творчай душы, а галоўнае — патрыёта, адносіны ўзнёслыя. Пра Маці-Краіну ён піша шчыра і, што не менш важна, прапусціўшы праз сэрца ейны боль.

Мінорныя інтанацыі,
патопны прыліў журбы...
Калі вымірае нацыя —
цынічна вясёлым быць.

Сам аўтар — песіміст па натуры. Прынамсі, складаецца такое ўражанне пры чытанні яго вершаў. Баліць яму за Беларусь, за родную мову, з-за цяжкага становішча якой аўтар, відаць, і напісаў:

Незайздросная доля —
нарадзіцца паэтам,
асабліва калі ты —
беларускі паэт.

Радкі Івана Лагвіновіча перагукваюцца з радкамі І. Лашуткі ("*Паэты заўсёды ў аблаве*") і А. Сыса ("*Быць паэтам — і фарс, і драма*"; агулам, уплыў паэзіі Сыса на творчасць Лагвіновіча адчуваецца). Калі ўжо тры рознапланавыя і па творчай манеры, і па натуры паэты прыйшлі да аднолькавых высноў, то, хутчэй за ўсё, так яно і ёсць насамрэч.

Прачулыя радкі паэт напісаў у форме дыялога старэнькай маці і ўжо немаладога сына:

—Мы твой гардэроб
напаўнялі, матуля,
штогодна,
і можаш адзенне
пад розны настрой
падабраць.
Навошта ж ты з куфра
дастала каптан
старамодны
і напаўзабыты,
як слова само, андарак?
.....
— За ўсё, што зрабіць
і сказаць не паспела,
прабачце...
Са столі пациху
на вейкі мне падае снег...
У гэтым убранні
вянчалася я з вашым
бацькам...
І ён на тым свеце...
такую пазнае мяне...

Такія вершы таксама неабходныя ў нашай літаратуры. Менавіта яны могуць выклікаць у чалавека пэўныя эмоцыі. Бо чытач рэагуе на твор не толькі розумам, але і душой.

Агрэхі, якія часам дапускае аўтар, — гэта выкарыстанне русізмаў ці русіфікаваных форм беларускіх слоў. Праўда, такіх выпадкаў няшмат і яны не надта заўважныя. Стамляе і манатоннасць зборніка. Калі на пачатку чытаеш яго з імпэтам, то дзесьці з сярэдзіны імпэт патроху спадае...

Што да інтымнай лірыкі, то арыгінальна, хоць і проста, аўтар, чалавек ужо немалады, піша пра ўзаемаадносіны мужчыны і жанчыны. Вось як ён, да прыкладу, зазначае ў адным вершы: "*Жанчына, я цар твой!// І ў царстве маім ты адна*". Каб ужо ў іншым сказаць амаль адваротнае гэтаму:

Хвалюе твой голас,
чаруе, як спеў салаўя.
Два ўзгоркі пяшчоты,
спакуснае дно ручая...
Жанчына, я раб твой!
Упала карона мая,
калі на каленях
перад табою стаяў.

Не кожны можа сказаць такое сваёй абранніцы. Тым больш за хвілю да вусцішнага выдыху:

Ідзі!..
Мне трэба слёзы ўцерці,
бо я спазнаў ужо з табой
каханне, большае за сэрца,
і, большы за каханне,
боль...

Паэты — адчайныя прарокі і празорцы, у тым ліку і ўласнага жыцця. Таму, нават ведаючы пра страчанае ў шахцёрскіх забоях здароўе аўтара, чытаць завяршальныя радкі зборніка занадта горка і шчымліва:

Землякі! Калі ўлетку
сном апошнім засну,
палыновыя кветкі
лягуць хай на труну.
.....
Быў я сціплым паэтам,
не ўслаўляў міражы —
помнікаў і букетаў
лепшых не заслужыў.

Думаецца, для таленавітага паэта гэта не так важна. Больш важна — каб чытач "заслужыў" яго лепшых вершаў.

Сяргей МАКАРЭВІЧ

Чалавек — аркестр

У межах сумеснага праекта "ЛіМа" з Беларускім радыё працягваем друкаваць найлепшыя фрагменты з перадачы "Культурная прастора" спецыяльнага карэспандэнта Яны Хадоскі. Сёння мы знаёмімся з адным з самых папулярных музыкаў нашай краіны, вядомым кампазітарам і віртуозным гітарыстам Уладзімірам Угольнікам.

— Валодзя, цябе называюць чалавекам-аркестрам, які валодае такімі музычнымі інструментамі, як скрыпка, альт. Але ў першую чаргу, усе цябе ведаюць як віртуознага гітарыста. Мусіць, гітара — гэта захапленне з дзяцінства?

— Ну так. Наогул я скрыпач. Спачатку на скрыпцы, потым на альце ў музычнай вучэльні іграў. Але аднойчы пачуў сола Джорджа Харысана на гітары і гэта цалкам "зламала" мяне на новы стыль. Я падабраў тое самае сола на скрыпцы і на захапленне ўсіх вучняў у музычнай школе выконваў яго без смычка ў туалеце, ды яшчэ спяваў песню. А на гітары пачаў ужо пазней іграць, гадоў у 13-14. У мяне была добрая скрыпічная база, таму лёгка было асвойваць гітару напачатку. Чым на больш высокі ўзровень ты выходзіш, тым складаней утрымацца. І чым большы ў цябе рэпертуар, тым больш трэба аддаваць гэтаму сілы, каб падтрымліваць форму.

— Колькі ж па часе прыходзіцца займацца? Зразумела, што любы музыка можа правесці за ігрой 6-8 і нават 10 гадзін перад канцэртам... Астатні час ідзе на выкладанне?

— Справа ў тым, што я з секундамерам не сяджу і не лічу колькі гадзін займаюся. Проста нейкую задачу ставіш, напрыклад, аднавіць п'есу. Гэта бывае 6 гадзін, а бывае і больш. Тут рацыянальны падыход патрэбен да таго, што ты робіш. Мінімум часу — максімум інфармацыі. Гэта не звязана з нейкай катаржнай працай, таму што творчасць прыносіць задавальненне. Паглыбляешся ў гэты працэс настолькі, што проста забываеш аб часе.

— Трапляеш у паралельны свет?

— Прыблізна так. Проста, калі глядзіш на гадзіннік, разумееш што час праляцеў неяк незаўважна.

— Валодзя, як правіла, вядомыя музыкі працуюць з выдатнымі дарагімі інструментамі. Якая ў цябе гітара або, магчыма, цэлая калекцыя гітар?

— У мяне тры гітары для розных стыляў: акустычная для кантры або



фламенка, джазавая і блюзавая. Кожная гітара функцыянальная ў сваім кірунку, таму на канцэртах я карыстаюся ўсімі трыма.

— Ты не раз прызнаваўся журналістам, што пасля канцэртаў моладзь падыходзіла да цябе і казала, што судакрананне з тваёй творчасцю цалкам змяніла іх стаўленне да гітары і яны вырашылі звязаць сваё жыццё менавіта з гэтым інструментам.

— Гэта добрая тэндэнцыя ў маладых. Часам яны нават паступаюць да мяне ва універсітэт. У асноўным, гэта ўпартыя, мэтанакіраваныя маладыя людзі. Пачуўшы майстроў, яны бачаць, што можна дасягнуць вялікіх вышынь і пачынаюць быць адданымі інструменту да фанатызму.

— Які сёння ў вас, у Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў, конкурс на гітару?

— Конкурс у нас увесь час розны. На гітару, напрыклад, было 12 заяў на 2 месцы. Так што, калі хтосьці памкнецца паступаць, я адразу магу сказаць, што без тэарэтычных ведаў, без адмысловай сярэдняй музычнай адукацыі да нас не патрапіш. Таму што быў адзін час, калі бралі без музычнай вучэльні, але потым гэтыя людзі проста адлічваліся. Патрэбна вельмі якасная падрыхтоўка, таму што ў нас — вышэйшая вучэбная ўстанова.

—Вядома ж, пашанцавала тым вучням, якія займаюцца ў такога майстра, як Уладзімір Угольнік. А хто быў тваім педагогам?

—У мяне былі педагогі, такія як Элвін Лі і Джымі Хендрыкс. Тады яшчэ не было ў нас вучэбных устаноў такога кшталту. Я вельмі глыбока вывучаў творчасць гэтых вялікіх майстроў. У мяне мелася класічная музычная адукацыя, таму мне было лягчэй асвойвацца. А што датычыцца студэнтаў, то калі яны да мяне прыходзяць, з першых заняткаў кажу: "Забудзьцеся, што вы вучні — мы з вамі калегі. Толькі вы нявопытныя калегі, а я дасведчаны, вы яшчэ ведаеце мала, а я ведаю шмат. Але стаўленне да нашай справы ў вас павінна быць прафесійнае ўжо з першых заняткаў. Вы не вучні, а прафесійныя музыкі, якія паважаюць сваю працу і ў наступным павінны рыхтавацца да прафесійнай працы. Калі вы не вытрымаеце гэтага, то саступайце месца тым, хто вытрымае". Бывае ў нас адлічваюцца людзі. Таму прафесійным выканаўцам трэба вельмі шмат прайсці, трэба працаваць.

— Тваё творчае крэда — заўсёды працаваць ужывую на канцэртных пляцоўках. Гэта правільна, таму што жывая музыка стварае адмысловую энергетыку на канцэрце і нясе своеасаблівы пасыл у глядацкую залу.

—Жывым саставам — гэта лепш за ўсё. Калі іграеш з жывымі музыкамі, атрымліваеш самую вялікую асалоду. Бывае нейкія хохмы нават узнікаюць падчас канцэрта. Музыкі — народ дасціпны, вясёлы і жыццярадасны, таму яны сваволяць у некаторых п'есах і нават хуліганяць.

— Для музыкаў за шчасце выступаць на адной сцэне з аркестрам і ў цябе ёсць такая выдатная магчымасць, таму што ў сценах Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў ёсць выдатны калектыў пад кіраўніцтвам Віктара Валадковіча.

—Так, гэта выдатна, што я маю магчымасць з аркестрам музіцыраваць. Калі прыязджаў летась Дзіма Малалетаў з Масквы, я запрасіў яго на репетыцыю з аркестрам. Пасля гэтага ён сказаў: "Слухай, ты ж найшчаслівейшы чалавек! Уяўляеш, колькі б ты грошай убухаў у Маскве, каб вось у такіх умовах памузіцыраваць?"

— А колькі кампакт-кружэлак на сённяшні дзень на тваім рахунку?

— Атрымліваецца тры, калі браць першы акустычны варыянт з Таццянай Капенкавай. Другі альбом быў сольным. І потым ужо я зрабіў зборку з іх двух пад назовам "Душэўны рок-н-рол". Зараз мае сябры задаволеныя, што можна пачуць розныя песні розных фарматаў на адной кружэлцы.

— Гэта палітра розных жанраў, рытмаў. Але я думаю, што аснову складаюць усё ж такі блюз і заўжды малады рок-н-рол?

— Рок-н-рол, блюз, кантры, самба, хард-рок, хэві-метал. Тут мяне ў разнастайнасці ніхто не папракне, таму што ўсё гэта звязвае адзін інструмент — гітара. Я не ведаю, кім трэба быць, каб у адным стылі іграць канцэрт дзве гадзіны і не згубіць цікавасць публікі. Я прыхільнік таго, каб усё ж такі змянялася карціна і вонкавая, і гукавая, каб не ператамляць адным і тым жа стылем і паказаць усе магчымасці гітары! Справа ў тым, што публіка ў мяне на канцэртах ад 12 да 70 гадоў, як у цырку. Прыемна, што людзі ходзяць на канцэрты, збіраюцца вялікія залы. Ну а са свайго боку, я імкнуся рабіць усё гэта якасна, так, каб перад унукамі не было сорамна.

Фота Кастуся Дробава

З пошты «ЛіМа»

Дзень паэзіі ў роднай школе

Калі б на літаратурнай карце Беларусі кожны населены пункт, дзе нарадзіліся пісьменнікі, быў пазначаны адпаведным кружочкам, то вёска Патапаўка Буда-Кашалёўскага раёна была б абведзена аж трыма такімі кружочкамі. Менавіта тут, у сценах мясцовай сярэдняй школы, пачыналі свой шлях у літаратуру Уладзімір Дзюба, Таццяна Гарэлікава і Анатоль Зэкаў.

Апошні з іх, самы маладзейшы з гэтай тройкі, завітаў у родную школу якраз у Сусветны дзень паэзіі.

Сустрэча, ініцыятарам якой стала дырэктар Патапаўскай СШ Любоў Уладзіміраўна Янчанка, прайшла ў форме дыялога вучняў і вядомага аднавяскоўца. Цікавіла ж юных землякоў паэта многае: калі ён напісаў першы верш і дзе ўпершыню апублікаваўся; адкуль чэрпае тэмы для сваіх паэтычных і празаічных твораў і чаму перастаў пісаць байкі; у якім з літаратурных жанраў яму найбольш падабаецца працаваць і як нарадзілася апошняя кніга рыбацкіх скорагаворак "Мянтуз сярод мядуз". А яшчэ школьнікі хацелі пачуць, як вучыўся будучы пісьменнік, якім прадметам аддаваў перавагу і хто з настаўнікаў пакінуў асаблівы след у яго жыцці. Вучні прасілі Анатоля Зэкава згадаць некаторыя эпізоды са школьных гадоў, распавесці пра настаўніцу роднай мовы і літаратуры Ульяну Фёдараўну Лазавенку, цікавіліся, чым цяпер займаюцца Уладзімір Дзюба і Таццяна Гарэлікава, і нават наказалі перадаць ім прывітанне.

Апроч усяго, школьнікі прачыталі вядомыя ім творы земляка-паэта, а ён, у сваю чаргу, пазнаёміў іх з тымі, што напісаны ў апошні час. І, вядома ж, падарыў роднай школе тры новыя кнігі, якія пабачылі свет летась: "Алесь", "Кругі ў галаве" і "Мянтуз сярод мядуз".

Напрыканцы сустрэчы выпускнікі школы запрасілі Анатоля Зэкава на свой выпускны баль, а юная спявачка Таццяна Быкава папрасіла напісаць для яе тэксты песень.

Наталля АЛЯКСАНДРАВА

Акцыя «Дзеці — дзецям»

У навагрудскім цэнтры карэкцыйна-развіццёвага навучання і рэабілітацыі ладзілася дабрачынная акцыя "Дзеці — дзецям". Да вучняў і выхаванцаў наведаліся супрацоўнікі мясцовага цэнтра пазашкольнай работы (ЦПР), якія падрыхтавалі цікавую гульнёвую праграму і падарылі дзецям сабраныя гурткоўцамі ЦПР кніжкі і цацкі.

Не ў першы раз парадавалі падарункамі сваіх сяброў і гурткоўцы цэнтра тэхнічнай творчасці навучэнцаў "Сонейка". Як адзначыла кіраўнік гуртка М. Авечкіна, іх выхаванцы — гэта дзеці, чые магчымасці па стане здароўя абмежаваныя. Але яны зрабілі мяккія цацкі для сваіх сяброў — дзяцей, якія з прычыны хваробы вымушаны знаходзіцца дома і не могуць наведваць дзіцячыя дашкольныя ўстановы.

Яўген ЛАПЦЕЎ

Творы лаўрэатаў

Брэсцкі ліцэй № 1 імя А. С. Пушкіна стаў месцам прэзентацыі зборніка эсэ "Уроки русского". Кніга ўключыла творы 13 берасцейцаў — лаўрэатаў Міжнароднага Пушкінскага конкурсу для выкладчыкаў рускай мовы і літаратуры краін СНД і Балтыі, ад 2001 да 2007 года. Падставай для стварэння зборніка стала тое, што мінулы год быў абвешчаны Годам рускай мовы ў свеце. Укладальнікам кнігі з'яўляецца намеснік старшыні Брэсцкага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі Любоў Красеўская. Рэдактар і рэцэнзент — старшыня аддзялення Анатоль Крэйдзіч.

Антаніна КІТ

ЛіМ

Выходзіць з 1932 года
У 1982 годзе газета ўзнагароджана ордэнам Дружбы народаў

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь

ГА "Саюз пісьменнікаў Беларусі"

РВУ "Літаратура і Мастацтва"

ГАЛОЎНЫ РЭДАКТАР
Анатоль КАЗЛОЎ

Рэдакцыйная калегія:
Анатоль Акушэвіч
Лілія Ананіч
Алесь Бадак
Дзяніс Барсукоў
Святлана Берасцень
Віктар Гардзей
Уладзімір Гніламёдаў
Вольга Дадзіёмава
Уладзімір Дуктаў
Анатоль Жук
Вольга Казлова
Анатоль Казлоў
Алесь Карлюкевіч
Анатоль Крэйдзіч
Віктар Кураш
Дзмітрый Лыбін
Алесь Марціновіч
Мікола Станкевіч
Юрый Цвяткоў
Мікалай Чаргінец
Іван Чарота
Іван Штэйнер

Адрас рэдакцыі:
220034, Мінск,
вул. Захарава, 19
Тэлефоны:
галоўны рэдактар, намеснік — 284-66-73
Аддзелы:
публіцыстыкі — 284-66-71
пісьмаў і грамадскай думкі — 284-95-62
крытыкі і бібліяграфіі — 284-44-04
прозы і паэзіі— 284-44-04
мастацтва — 284-82-04
бухгалтэрыя — 284-66-72
Тэл./факс — 284-66-73
E-mail: lim_new@mail.ru
Адрас у Інтэрнэце: www.lim.by

Пры перадруку просьба спасылацца на "ЛіМ".
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе.
Аўтары допісаў у рэдакцыю паведамляюць сваё прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі, асноўнае месца працы, зваротны адрас.
Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі і думкамі аўтараў публікацый.
Набор і вёрстка камп'ютэрнага цэнтра РВУ "Літаратура і Мастацтва".

Выходзіць раз на тыдзень па пятніцах.

Выдавец:
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Літаратура і Мастацтва".

Друкарня Рэспубліканскага унітарнага прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку"
г. Мінск,
пр. Незалежнасці, 79.

Індэкс 63856
Наклад 3616
Умоўна друк. арк. 3,72
Нумар падпісаны ў друк 23.04.2008 у 11.00

Рэгістрацыйнае пасведчанне № 715
Заказ — 2122

Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

ISSN 0024-4686